ЛіМ
Літаратура і мастацтва
газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

18 СНЕЖНЯ 1998 Г. № 51/3979 КОШТ 4 000 РУБ.

## ЛЁС КАМЕННАЙ БАЛАДЫ

***Марыя МІХАЙЛАВА: "Як ні горка пра гэта гаварыць, але мы, напэўна, яшчэ не дараслі, не саспелі да таго, каб звацца цывілізаванымі людзьмі. Мы дзікуны каменнага веку, няйначай. Бальшавікі-архараўцы паказалі, пачынаючы з 1917-га, як трэба рабаваць і плюндрыць панскія маёнткі разам з іхнімі бібліятэкамі, карціннымі галерэямі і архівамі, як на руінах старога "будаваць" новы свет, дзе ўсё будзе не маё ці тваё, а — "нічыё". Навуку гэтую людзі нашы засвоілі надзвычай добра. Вось дасюль і руйнуем. Зруйнавалі і музей камянёў".***

5, 12

## ФОРМАЮ ШЧАСЦЯ — ПАДКОВА

***Вершы Ігара ПРАКАПОВІЧА***

8

## ВОСЕНЬ У ЦЭЛАФАНЕ

***Апавяданне Анатоля КІРВЕЛЯ***

9, 12

## ПРАБЛЕМЫ ЗАСТАЛІСЯ

***Пётра ВАСІЛЕЎСКІ: "З'езд скончыўся. Праблемы Саюза мастакоў — засталіся. І галоўная з іх — незапатрабаванасць мастацкай творчасці ва ўмовах эканамічнага крызісу і неакрэсленай дзяржаўнай ідэалогіі. Быў час, калі нямала нашых мастакоў дэманстратыўна падкрэслівалі свой касмапалітызм, супрацьпастаўляючы яго беларушчыне. Цяпер жа ў адрас творцаў нацыянальнай арыентацыі можна пачуць, што яны, маўляў, лічаць, што толькі яны — беларусы, а мы — не, а нам, значыць, за народ беларускі не баліць!"***

10

## "АНТАЛОГІЯ КРАЁВАГА ВЕРША"

***У гэтай рубрыцы змешчаны творы баранавіцкіх паэтаў***

13

### БУДЗЬМА РАЗАМ!

*Шаноўныя чытачы! Калі Вы не паспелі падпісацца на наш штотыднёвік на першае паўгоддзе 1999 года, то гэта зрабіць не позна і сёння. На "ЛіМ" можна падпісацца ў любым паштовым аддзяленні. Кошт падпіскі на месяц — 50 тысяч рублёў, на квартал — 150 тысяч і на пяць месяцаў — 250 тысяч рублёў.*

**Наш індэкс — 63856.**

# Інсітнае мастацтва Югаславіі



*"Хрыстова нараджэнне" Д. Мілоевіча*

*На адкрыцці выставы бралі слова міністр культуры Беларусі А. Сасноўскі, міністр Саюзнага ўрада Югаславіі М. Ковач, дырэктар музея наіўнага мастацтва К. Смілкавіч, прысутнічаў намеснік прэм'ер-міністра Саюзнага ўрада Югаславіі Д. Гусанавіч.*

Нараджэнне такой з'явы, як наіўнае альбо інсітнае мастацтва, не абумоўлена існаваннем сучасных фармалістычных кірункаў у мастацтве. Але менавіта іх антыакадэмічная накіраванасць дазволіла прызнаць і сцвердзіць інсіт як творчасць, вартую нават музейных калекцый. І тым не менш гэты накірунак у мастацтве з самага пачатку суправаджаўся мноствам пытанняў — ад разыходжанняў у тэрміналогіі да разумення яго сутнасці. Аднак ніхто не здолеў аспрэчыць арыгінальнасць і свежасць наіўнага мастацтва і таго факта, што яму адведзена пэўная эстэтычная і духоўная роля ў сучаснай сусветнай культуры.

Беларусь можа таксама пахваліцца выдатнымі мастакамі-самавукамі розных пакаленняў (згадайма хаця б дыванкі Алены Кіш), дый сучасныя прадстаўнікі інсіту працуюць "пад наглядам" мастацтвазнаўцаў, Саюза народных майстроў, Інстытута праблем культуры. Але Беларусь, якая нават Музей сучаснага мастацтва займела толькі год таму, не можа пахваліцца такімі даўнімі ашчаднымі адносінамі да наіўнага мастацтва, як Югаславія. У межах Дзён культуры Саюзнай Рэспублікі Югаславіі ў Беларусі ў Музеі сучаснага мастацтва адбылася выстава Музея наіўнага мастацтва ў Ягадзіне (Сербія). Гэта ўстанова, заснаваная ў 1960 г. як галерэя мастакоў-самавукаў, у 1985 г. ператворана ў музей, мае сёння багатую калекцыю з 2000 экспанатаў, займаецца выставачнай і выдавецкай дзейнасцю. Музей арганізоўвае Біенале з 1981 г. і Калоніі наіўнага мастацтва з 1984 г., выдадзена больш за 200 каталогаў, без якіх было б немагчыма назіраць за зменамі ў наіўным мастацтве. Але галоўнае, што музей стварыў умовы для павагі і шанавання югаслаўскага інсіту ў свеце.

А распачыналася калекцыя музея з карцін і скульптур старэйшага сербскага мастака-самавука Янкі Брашыча з сяла Апарыч. З яго імем звязана і з'яўленне непасрэдна наіўнага мастацтва ў пачатку 40-х гадоў нашага стагоддзя. Работы Брашыча — песня сапраўднаму сялянскаму жыццю з яго звычкамі і традыцыямі. Галоўнае, што характарызуе гэтага і іншых наіўных мастакоў Югаславіі, спантаннасць і непасрэднасць мастацкага бачання. Вялікія эканамічныя змены канца саракавых гадоў, калі многія сяляне Югаславіі аказаліся ў гарадскім "палоне", нарадзілі мастакоў-самавукаў, якія пісалі па-дзіцячы шчыра, са сваім разуменнем міфаў і архаікі.

Наіўнае мастацтва перажыло пэўную экспансію, калі за пэндзаль браліся многія, але да вяршыняў сапраўднай творчасці дайшлі толькі тры арыгінальныя адораныя майстры з сялян — Мілан Рашыч, Мілосаў Йованавіч і Душан Еўтавіч. Усе яны звярталіся да мінулага свайго народа, да вясковага жыцця, да страчанага раю. Яны стваралі работы экспрэсіяністычныя і драматычныя (Еўтавіч), шматслойныя, з элементамі народнай міфалогіі (Йованавіч), ідэалізаваныя і лірычныя малюнкі сялянскага быцця (Рашыч).

*(Працяг на стар. 2)*

# КОЛА ДЗЁН

***Тое, аб чым апошнім часам (а папраўдзе цягам шасці-сямі гадоў) гаварылі, а найперш пастаянна і апантана марылі нашы людзі, — здзейснілася: да нас вярнуўся Савецкі Саюз. Найпершай і найяскравейшай адзнакаю гэтага — даўжэзныя чэргі ў прадуктовых крамах і, адпаведна, пустыя прылаўкі, на якіх павінны былі б быць масла, яйкі, танная вараная кілбаса, мяса, маргарын, цукар, — тое, што чалавеку патрэбна штодня, без чаго ніхто з нас абысціся не можа. Вярнуліся і "ворагі" — гэта значыць, тыя, хто вінаваты ў адсутнасці ўсяго гэтага. Імі зноў сталі прадаўцы. Гэта яны хаваюць прадукты пад прылаўкі, сплаўляюць іх праз чорны ход сваім блізкім і знаёмым, прадаюць оптам "чаўнакам" для вывазу за мяжу. Ды вось парадокс! Савецкі Саюз вярнуўся, а радасці, лікавання, усеагульнай эйфарыі з гэтае прычыны — штосьці не відаць. Наадварот — на людскіх тварах паныласць, стомленасць, заклапочанасць. А гэта ж тыя чалавечыя пачуцці, якія папярэднічаюць одуму. Дык, можа, задумаюцца ў рэшце рэшт людзі, паварушаць звілінамі ды й даўмеюцца, што лепей будзе, калі мы будзем выбіраць, а не калі за нас нехта выбірае...***

***І высокі візіт у Маскву на гэтым тыдні сведчыць аб тым, што па-ранейшаму шукаюцца шляхі да аднаўлення калі не вялікага, дык хоць маленькага, "на двоіх", Савецкага Саюза...***

## ЗВАРОТ ТЫДНЯ

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны выступіла са Зваротам да ўсіх дэмакратычных сіл Беларусі выступіць супраць знішчэння цяперашнімі ўладамі нацыянальных каштоўнасцей і найперш — беларускай мовы. Змаганне за мову — гэта змаганне за нашу свабоду, падкрэсліваецца ў звароце. "Менавіта мова і, як вынік, нацыянальная самасвядомасць могуць змабілізаваць народ і яго духоўныя сілы дзеля стваральнай працы. І толькі свядомы народ можа пабудаваць нармальную дзяржаўнасць з эфектыўнай эканомікай". І яшчэ: "Быць палітыкам у дзяржаве, не ведаючы мовы тытульнай нацыі і не карыстаючыся ёю, — нонсенс. Да кіраўніцтва дзяржавай павінны прыйсці нацыянальна свядомыя людзі". Тут, вядома, "ни убавить, ни прибавить", але ж — калі пачуюць гэты зварот нашы людзі?

## ЭЙФАРЫЯ ТЫДНЯ

Які самы галоўны, неадступны клопат сёння нашых людзей, мінчукоў у прыватнасці? Калі верыць друку, дык — будзе ў іх на навагоднім стале бутэлька шампанскага ці не будзе. З падачы БЕЛТА газеты супакойваюць: "Будзе!" Гэтыя радасныя паведамленні — на першых старонках газет, а паасобныя нават адкрываюцца гэтай навіной. І гэта ў той час, калі мільёны людзей заклапочаны зусім іншым: ці будзе ў іх наогул хоць што-небудзь на сёлетнім навагоднім стале?

## КРЫК ТЫДНЯ

Камітэт па інспекцыі працы паведаміў сумную статыстыку. За 11 месяцаў сёлетняга года ў Беларусі на рабоце загінула 258 чалавек, а 612 атрымалі цяжкія траўмы. Сярод пацярпелых — 105 жанчын, 16 з іх загінулі. Лічбы — жахлівыя! Практычна кожны працоўны будзень на сваім рабочым месцы гіне чалавек, а двое — калечацца! Але яшчэ больш жахліва ад таго, што 45 працэнтаў загінуўшых і 15 працэнтаў пакалечаных былі ў нецвярозым стане. Вось пра што трэба крычма крычаць, спадарове! Гэта таксама вынік бездухоўнасці і нашага нацыянальнага нігілізму і манкурцтва...

## ПУБЛІКАЦЫЯ ТЫДНЯ

На такую намінацыю прэтэндуе, безумоўна, артыкул Леаніда Лыча ў "Народнай волі" за 15 снежня пад загалоўкам "За што нас любяць у Расіі". Адказваючы на пытанне, вынесенае ў загаловак, аўтар гаворыць: "за паслядоўнасць у далейшым умацаванні рускіх стандартаў у духоўным жыцці нашай краіны дзеля паглыблення працэсаў асіміляцыі яе карэннага насельніцтва, за мэтанакіраванае абмежаванне сферы распаўсюджання беларускай нацыянальнай культуры і мовы, якія разглядаюцца як самая сур'ёзная этнічная перашкода на шляху ўсебаковай інтэграцыі гэтых дзвюх славянскіх дзяржаў". Вось так! Любяць нас, аказваецца, за наша халуйства і лёкайства. Брава, браткі беларусы! Так трымаць!

## СУГАЛОССЕ ТЫДНЯ

"У нашай краіне ўладамі забіты "чалавек свабодны". Уваскрос "чалавек савецкі", якім прасцей кіраваць, адзінай каштоўнасцю якога з'яўляецца "чарка і скварка". Гэтак выказаўся аўтар допісу на старонках адной газеты за 15 снежня. У гэты ж дзень на старонках другой газеты другі аўтар таксама згадвае гэтае словаспалучэнне: "Калі думаць толькі пра "чарку і скварку", то нашаму чалавеку, як і грамадству ў цэлым, немагчыма будзе пазбавіцца ад адчування сваёй непаўнацэннасці". Сумнае, нават горкае сугалоссе, бо — праўдзівае...

## АДМОВА ТЫДНЯ

У сувязі з 80-годдзем выдатнага рускага пісьменніка А. Салжаніцына прэзідэнт Б. Ельцын узнагародзіў яго ордэнам Святога апостала Андрэя Першазванага. Аднак пісьменнік адмовіўся прыняць узнагароду, заявіўшы: "Ад вярхоўнай улады, якая давяла Расію да цяперашняга пагібельнага стану, я прыняць узнагароду не магу". Газета "Коммерсантъ", публікуючы інфармацыю пра гэта, заўважае, між іншым, што ад гэтага новага расійскага ордэна не адмаўляўся яшчэ ніхто — ні акадэмік Ліхачоў, ні прэзідэнт Казахстана Назарбаеў. Што ж, Салжаніцын — гэта Салжаніцын.

## ЦЫТАТА ТЫДНЯ

"Як нам уяўляецца, ёсць цвёрдая платформа для далейшай кансалідацыі дэмакратычных сіл. Для ўсіх нас няма большай каштоўнасці, чым наша краіна — Беларусь. Усе мы прызнаём непарушнасць суверэнітэту, незалежнасці і нейтральнасці краіны і неабходнасць дзяржаўнай падтрымкі нацыянальнай культуры, аднаўлення нацыянальнай сімволікі і рэальнага зацвярджэння беларускай мовы ў якасці дзяржаўнай. Мы за паступовую інтэграцыю Беларусі ў цывілізаваную еўрапейскую супольнасць; за стварэнне прававой дзяржавы і грамадзянскага грамадства, вышэйшай каштоўнасцю і прыярытэтам якога былі б правы і свабоды чалавека, плюралізм і незалежныя СМІ. За дэмакратыю, падзел і самастойнасць заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, а таксама за дэцэнтралізацыю і выбарнасць мясцовых кіраўнікоў адміністрацыі. За ачышчэнне ўлады ад карупцыянераў і правядзенне адкрытай, маральнай, сапраўды нацыянальнай унутранай і знешняй палітыкі. За стварэнне ўмоў для годнага жыцця ўсіх нашых грамадзян з дапамогаю сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі".

*(С. Багданкевіч, "Беларусь будзе ўратавана тады, калі ўлада верне народу ягоныя правы", "Народная воля", N 225(577), 15 снежня 1998 года.)*

ПЛЕНУМ

# Саюз жыве...

Сёння Беларускі саюз музычных дзеячаў праводзіць свой чарговы пленум. Гаворка ідзе пра стан спраў за перыяд, што мінуў з часу правядзення з'езда гэтай творчай супольнасці, пра надзённыя праблемы, якіх у музычнай сферы не менее. Застаецца толькі радавацца, што мінулы з'езд БСМД не стаўся яго апошнім форумам. Бо, як вядома, у сваім справаздачным дакладзе старшыня саюза народны артыст Беларусі Міхась Дрынеўскі гаварыў тады, што бядотны стан, невыносныя для творчай суполкі матэрыяльныя варункі вымушаюць падумаць пра самаліквідацыю БСМД.

Апошнім часам справы крыху палепшыліся, дзякуючы таму, што дзяржава выдзеліла на падтрымку творчых саюзаў дзесяць мільярдаў рублёў, адзін з якіх выкарыстаў Беларускі саюз музычных дзеячаў. Удалося разлічыцца за арэнду памяшкання і нават адрадзіць творчае жыццё. Як паведаміла намеснік старшыні БСМД Наталля Вітчанка, вялікая заслуга ў паляпшэнні спраў належыць прэзідэнту Канфедэрацыі творчых саюзаў краіны народнаму артысту Беларусі Мікалаю Яроменку, чый аўтарытэт і настойлівасць спрыялі фінансавай падтрымцы саюзаў з боку ўрада.

Прыемна паведаміць, што летась намаганнямі БСМД была створана Асацыяцыя цымбалістаў, адбылася яе прэзентацыя ў Мінску пад эгідай фестывалю "Срэбны звон цымбалаў". З'ехаліся музыкі з усяе Беларусі!

Адрадзіліся і мерапрыемствы, скіраваныя на павышэнне кваліфікацыі музыкантаў. Так, напрыклад, саюз браў удзел у правядзенні фестывалю народна-інструментальнага мастацтва "Славянскі вянок" і прафінансаваў заняткі спецыялістаў пад кіраўніцтвам народнага артыста Расіі, дамрыста-віртуоза Аляксандра Цыганкова: майстар-класы былі наладжаны ў пяці абласцях краіны і ў сталіцы. Рэдкасную магчымасць прафесійных стасункаў атрымалі і музыканты-ўдарнікі, для якіх была наладжана сустрэча з Ансамблем ударных інструментаў Вялікага тэатра Расіі на чале з Віктарам Грышыным. Музыканты-тэарэтыкі павучыліся майстэрству аналізаваць творчасць кампазітараў эпохі барока на занятках нашай госці з Пецярбурга — знанага педагога Валянціны Шырокавай. А спецыялісты-харавікі парадаваліся цудоўнай нагодзе абмеркаваць свае праблемы, сабраўшыся на 30-годдзі Капэлы хлопчыкаў Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі. Цяпер гэтым знаным калектывам кіруе Уладзімір Глушакоў, а першым хормайстрам і стваральнікам быў Ігар Жураўленка, выдатны прафесійнік, які прыехаў з Масквы на юбілей Капэлы і меў сустрэчы з многімі беларускімі калегамі.

Вось, коратка, пра набыткі. А праблемы... Пра іх пагаворым наступным разам, на аснове вынікаў пленума.

**С.Б.**

ВІНШУЕМ!

# А песні даўно народныя

Зазвычай напярэдадні новага года мы марым, што збудзецца нешта прыемнае, чакаем радасных сюрпрызаў ці проста маленькай удачы. Кампазітар Валерый Іваноў, напэўна, таксама — у прадчуванні цудоўнага свята. Тым болей, што днямі ён атрымаў сапраўдны перадкалядны падарунак: указам прэзідэнта краіны Валерыю Іванову нададзена ганаровае званне "Народны артыст Рэспублікі Беларусь". Так ацэнены яго творчы ўклад у айчынную музычную культуру.

Ці трэба нагадваць, што ён даўно ўжо зарэкамендаваў сябе як адзін з вядучых беларускіх кампазітараў-песеннікаў, з колам сваіх тэм, сваіх паэтаў, сваіх выканаўцаў, са сваім "голасам!" Літаральна ў пачатку сёлетняга года мы пісалі пра гэта, віншуючы Валерыя Іванова з 50-годдзем. Але, вядома, апроч песень, самыя папулярныя з якіх прыжыліся ў беларускім побыце побач з народнымі, ёсць у яго таленавітыя творы для народнага аркестра, прыгожая, меладычная эстрадная інструментальная музыка. Таму прыхільнікі Валерыя Іванова з цікавасцю чакаюць завяршэння яго буйной творчай працы — рамантычнай оперы паводле "Пунсовых ветразяў" А. Грына. Талент меладыста, багаты досвед у развіцці эстрадных жанраў, густ і акадэмічная адукацыя — зарука поспеху...

# Помнік першадрукару: чарговая вандроўка

4 снежня на суд экспертнай камісіі быў прадстаўлены помнік Францішку Скарыну для Мінска (скульптар — Алесь Дранец). Аўтару прапанавана ўнесці нязначныя карэктывы, а ўвогуле скульптура закончана. Засталося адліць яе ў бронзе — так мяркуюць эксперты.

Нашы чытачы ведаюць, што эпапея Скарынавага помніка распачалася больш за дзесяць гадоў назад. Яго збіраліся паставіць перад Акадэміяй навук, потым пераносілі ў Верхні горад і зноў вярталі да акадэміі. На тым і пагадзіліся. Да нядаўняга часу пытанне архітэктурнай прывязкі ў прынцыпе лічылася вырашаным: помніку першадрукару быць на пляцы перад Акадэміяй навук.

Але нечакана супраць гэтага выказаўся прэзідэнт АН Беларусі. І зноў загаварылі, што тут увогуле немагчыма паставіць скульптуру. Думка спрэчная, аднак аўтарам помніка прапанавана "прывязаць" скульптуру да... неіснуючага новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі. Гэта ў раёне мікрараёна "Усход-1". Фактычна за межамі прэстыжнага цэнтра сталіцы. Калі будзе пабудавана тая бібліятэка — невядома. Хутчэй за ўсё "даўгабуд" накшталт Палаца Рэспублікі. Гадоў дзесяць, не меней. І ўвесь гэты час бронзавы Скарына будзе стаяць у чыстым полі альбо на фоне плота, за якім будзе ісці будаўніцтва.

Праўда, гэта пры ўмове, калі на адліўку знойдуцца грошы. Пакуль што іх няма...

**П.В.**

СЕМІНАРЫ

# Канфесіі і секты

У чарговым семінары Клуба журналістаў пры Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры (ІВВ) разглядалася рэлігійная сітуацыя ў нашай рэспубліцы і яе адлюстраванне ў СМІ. З паведамленнем выступіў спецыяліст Дзяржкамітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей РБ **Вячаслаў Савіцкі**.

Агульная карціна абмалявана наступным чынам. У Беларусі дзейнічае 26 рэлігійных канфесій, з іх 15 — хрысціянскіх. Зарэгістраваны больш чым тысяча праваслаўных абшчын, 392 — каталіцкія, 357 — хрысціян веры евангельскай (пяцідзесятнікі), 207 — евангельскіх хрысціян (баптысты). З даўніх і традыцыйных дзейнічаюць 10 абшчын іудаістаў і 24 — мусульман-*сунітаў* (адзіная суполка *шыітаў* аб'ядноўвае выхадцаў з Азербайджана). З невялікіх і адносна "маладых" можна назваць Міжнароднае таварыства свядомасці Крышны (6 абшчын), ёсць і бахаі (5 абшчын).

Разам з гуманітарнай дапамогай да нас прыйшло некалькі сучасных заходніх рэлігійных плыняў: мармоны, Новаапостальская царква, хрысціяне поўнага Евангелля.

Актыўны рост рэлігійных суполак назіраўся ў 1990-м годзе, зараз працэс стабілізаваўся. Увогуле ж апытанні паказваюць, што ўзровень рэлігійнасці вырас: звыш 34-х працэнтаў апытаных лічаць сябе веруючымі. Пры гэтым адны ведаюць асновы веравучэння, другія проста вераць у нешта "звыш" — "вышэйшыя сілы" і да т.п. Тыя, каму за 30, у плане веры і канфесіі ўжо самавызначыліся. Што ж да моладзі, асабліва студэнцкай, то яна стала аб'ектам пільнай увагі дэструктыўных сектаў. Многія з іх існуюць пад выглядам усемагчымых грамадскіх арганізацый і фондаў. 11-ці за апошні год было адмоўлена ў рэгістрацыі.

Своеасаблівыя секты ствараюцца таксама на базе рознага тыпу астралагічных, эзатэрычных школ. У іх ліку, напрыклад, новы рэспубліканскі цэнтр "Анастасія", вучэнне Грааля і інш. Усе разам узятыя секты вядуць індывідуальную работу з навічкамі: высвятляюць кола інтарэсаў, завязваюць кантакты, кантралююць вольны час. У тых, хто замацаваўся, альбо адэптаў, патрабуюць грашовую "дзесяціну".

Ацэнкай сектаў на прадмет грамадскай прымальнасці займаецца савет з 15 экспертаў. Што ж тычыцца прэсы, то яна павінна зыходзіць з грамадзянскіх пазіцый: г. зн. спрыяць захаванню міру паміж канфесіямі.

В.Савіцкі прывёў прыклад негатыўнага ўмяшання прэсы: газета "Навіны" аднойчы стала на абарону фестывалю так званай экстрэмальнай музыкі. Няцяжка здагадацца, што гэта такое; пасля канцэртаў такога кірунку ў Нарвегіі былі выпадкі падпальвання цэркваў. Дык ці варта шкадаваць, што гэтае "дэмакратычнае мерапрыемства" не адбылося?

Кансультант аддзела па справах рэлігіі адказаў на пытанні прысутных журналістаў. Ён, у прыватнасці, не лічыць, што праваслаўе ў нас становіцца дзяржаўнай рэлігіяй: усе канфесіі роўныя перад законам.

Што думаюць на гэты конт прадстаўнікі царквы, засталося невядомым. Запрошаныя на семінар намеснік галоўнага рэдактара газеты "Царкоўнае слова" па нейкіх прычынах не прысутнічала.

**Г.К.**

# Інсітнае мастацтва Югаславіі

*(Працяг. Пачатак на стар. 1)*

Зараз Югаславія мае некалькі месцаў, дзе групуюцца наіўныя мастакі. Найперш гэта Апарычка, дзе жывуць мастакі сербскага паходжання, этнічна замкнёная група, якая захоўвае свае маральныя, грамадскія і гістарычныя традыцыі і фальклор. Непадалёк, у румынскай вёсцы Уздзін, у 60-я гады да мастацтва звярнуліся жанчыны. Аснова іх творчасці — фальклор. Пасля стварэння Музея наіўнага мастацтва ў Ягадзіне і навакольных мясцінах фарміруецца яшчэ адна група мастакоў.

Наіўных мастакоў Югаславіі падзяляюць не толькі межы, але мастацкія і тэхнічныя прыёмы маляванння. І калі Эмерык Фееш, падобна Вівену, малюе вядомыя гарады з выдуманай фантасмагарычнай архітэктурай, то Слаўка Кузьмінавіч звяртаецца да імгненных уражанняў ад рынкаў, вуліц, ярмарак. Сава Секуліч стварае рэальнасць з выдуманымі жывёлінамі, пераклікаючыся з артбрутам, а Ілія Босіль працуе ў сінтэзе архаікі і мадэрнізму, прымітыву і дзіцячага інфантылізму.

Не менш цікавая з'ява югаслаўскага інсіту — скульптура, спрошчаная, грубаватая, але поўная выразнай вобразнасці і запамінальнасці.

**Н. Ш.**

КОНКУРСЫ

# "Філіп Морыс" падтрымлівае балет

На прэс-канферэнцыі, што адбылася днямі ў Мінску, было абвешчана аб ўстанаўленні прадстаўніцтвам кампаніі "Філіп Морыс" на Беларусі спецыяльнага прыза для артыстаў балета. Назва прыза — "Філіп Морыс — Дэбют". Як паведаміў прадстаўнік знанай кампаніі Сяргей Коласаў, гэтая ўзнагарода мае на мэце падтрымку маладых артыстаў беларускага балета і заахвочванне іх далейшага творчага росту.

"Філіп Морыс" бярэ на сябе фінансавы бок акцыі, даючы права вызначыць пераможцу аўтарытэтнаму журы. У яго складзе — народны артыст СССР, мастацкі кіраўнік і галоўны харэограф Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Беларусі Валянцін Елізар'еў (старшыня), народныя артысты Беларусі Людміла Бржазоўская, Юрый Траян, доктар мастацтвазнаўства Юлія Чурко, кінарэжысёр Віктар Шавялевіч, педагог-рэпетытар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета, народная арыстка РСФСР Марыяна Подкіна.

На прэмію "Філіп Морыс — Дэбют" вылучана пяць намінантаў: Руслан Мінін, Таццяна Ерахавец, Ігар Сядзько, Аляксей Турко, Вольга Гайко — маладыя артысты тэатра, выхаванцы Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа. Журы разглядае ўпершыню выкананыя імі сёлета партыі ў спектаклях "Жар-птушка", "Страсці", "Прывал кавалерыі", "Карсар" ды "Лебядзінае возера". Зыходзячы з мастацкага ўзроўню выканання, акцёрскага майстэрства, балетнай тэхнікі, вобразнага ўвасаблення ролі, з улікам перспектывы творчага росту кандыдатаў аўтарытэтныя суддзі выберуць лаўрэата. Шчаслівага абранніка чакае арыгінальны прыз з каляровага шкла і грашовая прэмія — 5 тысяч долараў ЗША. Іншыя чатыры намінанты атрымаюць заахвочвальныя грашовыя прэміі. Цырымонія ўзнагароджання прызначана на 20 студзеня будучага года.

Спадар Коласаў адзначае, што гэтая акцыя дакладна адлюстроўвае сутнасць філасофіі кампаніі: "Сродкі, атрыманыя ад грамадства, трэба аддаваць на карысць грамадства. Таму ўжо 40 гадоў "Філіп Морыс" з'яўляецца вядучым спонсарам праграм у галіне культуры і мастацтва больш чым у 180 краінах свету. Як міжнародная кампанія, "Філіп Морыс" паслядоўна падтрымлівае праекты, спрыяльныя для развіцця культуры краіны, у якой яна працуе".

Як вядома, сёлета ў студзені ўпершыню на Беларусі быў уручаны спецыяльны прыз "Філіп Морыс — Лепшая роля года", лаўрэатам якога стала салістка Нацыянальнага тэатра балета Кацярына Фадзеева. Праз месяц будзе абвешчана імя лаўрэата новай для нашых маладых артыстаў прэміі...

*На здымку: прыз чакае свайго ўладальніка.*

МУЗЫКА

# Прыгажосць выратуе свет!

Ціхая, утульная атмасфера Канцэртнай залы сталічнай філармоніі. Слухачы ў чаканні: прагучыць музыка для віяланчэлі і фартэпіяна. Іграюць вядомыя беларускія выканаўцы — Алег Алоўнікаў (віяланчэль)і Юрый Гільдзюк (фартэпіяна).

Высакародны дух музыкі І. С. Баха, якой пачыналася праграма, завалодаў аўдыторыяй слухачоў з першых гукаў, нібы паабяцаўшы не проста сустрэчу з выдатным мастацтвам, а далучэнне да ўзвышанага і прыўкраснага.

У пэўным сэнсе сімвалічным падавалася спалучэнне твораў двух геніяльных нямецкіх кампазітараў у праграме першага аддзялення. Велічны Бах і няўрымслівы Бетховен побач успрымаюцца як яднанне супрацьлегласцяў — нябеснага і зямнога — у адным: любові да духоўнага, выказанай праз музычнае мастацтва.

Ансамблевае суладдзе Алега Алоўнікава і Юрыя Гільдзюка бясспрэчнае. Саната N 1 Соль мажор І. С. Баха прагучала як раўнапраўны дыялог "віёлы ды клавіра" — вытанчана, стрымана, часам пяшчотна і, разам з тым, энергічна.

Выкананне бахаўскай Сюіты N1 (для віяланчэлі сола) нагадвала маналог, у якім віяланчэль з дзівоснай пераканальнасцю выяўляе трывогі, хваляванні, імкненні, думкі. Музыка кожнай часткі вызначаецца непаўторнай вобразнасцю: велічная Прэлюдыя, распавядальная Алеманда, духавая Куранта, самотная Сарабанда, вытанчаны Менуэт ды энергічная Жыга. Прыкметна, што віяланчэліст Алег Алоўнікаў шматгалосную поліфанію І.С.Баха інтэрпрэтуе як рознатэмбравую аркестравую партытуру, такім чынам дасягаючы ўражлівай маляўнічасці гукавой палітры.

Колькі ні слухаеш канцэрты бахаўскай музыкі, не пакідае адчуванне, што стаіш здзіўлена на ўзбярэжжы мора, больш за тое — акіяна!

Геніяльная Саната Людвіга ван Бетховена Рэ мажор (для віяланчэлі і фартэпіяна)... Віртуозныя магчымасці найскладанейшай партыі фартэпіяна раскрываліся з майстэрствам і густам. Твор прагучаў цэласна і дынамічна.

Выкананне Санаты Э.Грыга было бліскучае. Усхваляваныя матывы змяняліся светлымі вобразамі, напоўненымі невычэрпнай унутранай энергіяй. Віяланчэль часам то спявала, нібы скрыпка, то нагадвала струнны шчыпковы інструмент. Партыя фартэпіяна, даволі насычаная фактурна, прыпадабнялася да аркестравага гучання. Музыка Э.Грыга праз эмацыянальнае ўвасабленне выканаўцаў стварыла непаўторную атмасферу ў зале, у якой, здавалася, спяваў кожны куточак! У такія хвіліны згадваеш знакамітыя словы: "Прыгажосць выратуе свет!" Толькі спрычыняючыся да чыстага і светлага, да прыгожага і вечнага, можна абараніць, умацаваць і годна захаваць духоўны свет чалавека.

Завяршалі праграму інструментальныя мініяцюры. Слухачы з захапленнем "сузіралі" пад пяшчотныя гукі раманса Э.Грыга "Кахаю цябе", вытанчанае выкананне якога ў інструментальнай версіі не вымагала паэтычнага тэксту. "Танец эльфаў" чэшскага кампазітара Давіда Попера ўразіў непаўторнай вобразнай лёгкасцю.

Эмацыянальная атмасфера, здаецца, дасягнула кульмінацыі. І сімвалічна прагучаў твор К.Дэбюсі "Цудоўны вечар".

Сапраўды, цудоўны вечар! Дзякуй віяланчэлісту Алегу Алоўнікаву ды піяністу Юрыю Гільдзюку за шчырую адданасць сапраўднаму высокаму мастацтву.

**Ларыса ЖЫВАЛЕЎСКАЯ**

*На здымку: Алег Алоўнікаў ды Юрый Гільдзюк.*

ВЫСТАВЫ

# Вандроўка ў вайну

Яшчэ не так даўно Вялікая Айчынная (альбо другая сусветная — гэта каму як болей даспадобы), адпаведна адрэдагаваная, была тэмай нумар адзін для патрыятычнага выхавання моладзі. Асабліва, мабыць, у Беларусі — "партызанскай рэспубліцы". Відаць, не было ў Беларусі ніводнага школьніка, які б хоць раз не наведаў у абавязковым парадку Музей Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. Зараз — іншы час. Цяпер нам вядомыя не толькі гераічныя, але і брудныя старонкі той вайны. Ведаем, што да стварэння пажаранебяспечнай сітуацыі прычынілася шмат краін (у тым ліку і тыя, што потым сталі ахвярамі агрэсіі), Гітлеру заставалася толькі чыркнуць запалкай...

Сёння ў Музеі Вялікай Айчыннай вайны наведвальнікаў меней. І гэта цалкам лагічна. Такая сітуацыя прымушае супрацоўнікаў музея шукаць і вынаходзіць нетрадыцыйныя формы работы з грамадою. У музеі ладзяцца канцэрты, прагляды фільмаў, мастацкія выставы. Музей часта ладзіць тэматычныя выставы, каб азнаёміць наведвальнікаў з багаццем сваіх фондаў.

Не так даўно музеем быў праведзены свайго роду сацыялагічны дослед на тэму "Што падлеткі ведаюць аб вайне, як уяўляюць сабе Вялікую Айчынную". Вучням рэспубліканскага каледжа мастацтваў было прапанавана ўдзельнічаць у мастацкім конкурсе. Перад гэтым яны азнаёміліся з экспазіцыяй музея. Былі знойдзены грошы на конкурс (папера і фарбы каштуюць сёння даволі дорага). Ініцыятарам гэтай справы і галоўным арганізатарам была малодшы навуковы супрацоўнік Людміла Калеснічэнка.

Зараз работы гэтага конкурсу экспануюцца ў фае музея. Падлеткі, мяркуючы па іхніх малюнках, у адрозненне ад дасведчаных дарослых, успрымаюць Вялікую Айчынную чыста эмацыянальна. У пэўнай ступені яны знаходзяцца пад уплывам стэрэатыпаў, навязаных савецкімі кінафільмамі і карцінамі савецкіх мастакоў.

Зрэшты, прыйдзе час — разбяруцца... Добра ўжо тое, што адбылося далучэнне будучых мастакоў да падзей нашай нядаўняй гісторыі.

**П.В.**

АБСЯГІ

*БРЭСТ...*

## У натхнення, як і ў птушкі, — два крылы...

Абласная арганізацыя Саюза мастакоў на нядаўнім справаздачна-выбарным сходзе падзялілася напалову: мастакі М. Кебец, П. Данелія, М. Маеўскі, С. Казак ды іншыя ўтварылі аб'яднанне "Бярэсце" (назва неканчатковая). Падзяліліся, але не раскалоліся: абодва "крылы" застаюцца ў агульным творчым саюзе. І нядаўнюю выставу жывапісу, графікі і скульптуры яны наладзілі сумесна. Выстава цікавая тым, што яна не рэтраспектыўная, яе аснову склалі зусім новыя творы. Пачэснае месца адведзена працам старэйшых майстроў выяўленчага мастацтва і асабліва тых творцаў, хто не так даўно пайшоў з жыцця — М. Чурабы, І. Фяцісава, Э. Куфко... Паралельна з агульнай выставай дзейнічае і персанальная — работ Пятра Данеліі. Яна экспануецца ў галерэі "Мастацтва".

**Сымон АКСЕНІН**

## Свята роду...

Семінар дырэктараў метадычных цэнтраў Баранавіцкага раёна прайшоў не дзеля галачкі ў справаздачы. Усё было цікавым, жывым, нефармальным. Да прыкладу, "Свята роду" сям'і Шастакоў з пасёлка Мірны. Пад сотню сваякоў з гонарам носяць гэтае прозвішча. Амаль палова з іх сабралася гэтымі днямі на свяце. З Мірнага, Баранавіч, Брэста, нават Расіі. Сабраліся, каб яшчэ раз ушанаваць свой род, успомніць пра свае карані. Дарэчы, усю музычную частку ўрачыстай вечарыны ўзялі на сябе таксама Шастакі. Доўга гучалі ў мясцовым Доме культуры іх святочныя спевы...

**Святлана ГУЛЯЕВА**

*МАГІЛЁЎ...*

## Аб правах чалавека

На пачатку снежня ў межах Міжнароднага праваабарончага кінафестывалю "Сталкер" у кінатэатры "Чырвоная зорка" абласнога цэнтра праходзілі мерапрыемствы, прысвечаныя 50-годдзю Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека.

Дзякуючы магілёўскаму кінавідэапрадпрыемству "Позірк", мінскай кінастудыі "Таццяна", Гільдыі рэжысёраў Расіі, аддзяленню ААН жыхары горада змаглі ўбачыць фестывальныя фільмы: дакументальную стужку "Пісьмы маці" рэжысёра Анатоля Крайнева і дзве мастацкія кінастужкі "На цябе спадзяюся" Алены Цыплаковай і "Зона Любэ" Дзмітрыя Залатухіна. Ладзілася таксама сустрэча са стваральнікамі фільмаў, акцёрамі.

## Першае грунтоўнае выданне

У Шклове днямі адбылася прэзентацыя кнігі "Памяць. Шклоўскі раён". Кніга, выдадзеная накладам у пяць тысяч асобнікаў, з'яўляецца, бадай, першым грунтоўным выданнем, прысвечаным гісторыі і славутым людзям Шклоўшчыны.

Нагадаю, што на сёння ў Беларусі са 130-ці запланаваных першапачаткова гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў "Памяць" выдадзена 45. З іх 11 — на Магілёўшчыне.

**Алесь ПЯТРОВІЧ**

## Мініяцюры буйным планам

Вядомы на Магілёўшчыне народны тэатр мініяцюр "Серпанцін", які працуе ў Магілёўскім гарадскім цэнтры культуры і вольнага часу, свой шосты сезон адкрыў прэм'ерай эстрадна-сатырычнага прадстаўлення "На вясёлай хвалі". Асновай драматургіі паслужылі лепшыя фельетоны, гумарэскі, сатырычныя апавяданні, апублікаваныя ў газетах "Вячэрні Магілёў", "Веснік Магілёва" і "Магілёўская праўда". Сцэнічнасць ім надаў мастацкі кіраўнік і рэжысёр "Серпанціна" заслужаны дзеяч культуры Беларусі Уладзімір Бараноўскі.

Кожная мініяцюра, як кажуць, біла не ў брыво, а ў вока, дзякуючы рэжысёру і артыстам, буйным планам паказвала смешнае і грэшнае ў нашым жыцці.

У спектаклі гучала музыка магілёўскага кампазітара Уладзіміра Стукмейстара.

На сёння ў творчай абойме "Серпанціна" шэсць цікавых спектакляў: "Ах,сэрца!..", "Гарэзлівыя казкі", "Казка пра Фядота-стральца, удалога малайца" (па вядомай паэме Леаніда Філатава), "Добры настрой", "Мы родам з "Усмешкі" ("Усмешкай" называўся таленавіты магілёўскі народны агіттэатр, традыцыі якога працягвае "Серпанцін") і "На вясёлай хвалі"...

**Іван ПЕХЦЕРАЎ**

*ГОМЕЛЬ...*

## Хор з Бялграда

Вялікай падзеяй на Беларусі сталі Дні культуры Саюзнай Рэспублікі Югаславіі. На Гомельшчыне выступіў Бялградскі камерны хор, дырыжорам якога з'яўляецца выкладчык Бялградскай кансерваторыі Уладзімір Марковіч. Гэты калектыў, у рэпертуары якога праваслаўная, духоўная і старажытная музыка, даў канцэрты ў абласным цэнтры, Светлагорску і Мазыры.

## Апладысменты "Современнику"

У госці да гамяльчан прыехаў маскоўскі тэатр "Современник". Ён паказаў спектакль "Тытул" па камедыі Аляксандра Галіна. Паставіла спектакль мастацкі кіраўнік тэатра Галіна Волчак. Галоўныя ролі выконваюць вядучыя артысты калектыву Лідзія Талмачова, Алена Якаўлева, Ігар Кваша, Сяргей Гармаш.

## Стыпендыі маладым талентам

Гомельскі гарвыканкам устанавіў пятнаццаць стыпендый для таленавітай моладзі і навучэнцаў музычных школ і школ мастацтваў, сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў, маладых артыстаў тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў. Стыпендыі — у памерах ад пяці да пятнаццаці мінімальных заробкаў.

## Конкурс у каледжы...

Споўнілася сорак гадоў музычнаму аддзяленню Гомельскага музычна-педагагічнага каледжа імя Л.С.Выгоцкага. З нагоды гэтай падзеі ў ім адбыўся конкурс па намінацыях "інструментальны твор", "аўтарская песня", "верш". Удзел у конкурсе бралі як выкладчыкі, так і навучэнцы. Пераможцамі сталі ансамбль народных інструментаў пад кіраўніцтвам Леаніда Целяпнёва, калектыў групы пачынаючых артыстаў, з якой працуе Маргарыта Наважэнцава, асобныя выканаўцы і аўтары вершаў.

**Аляксей ШНЫПАРКОЎ**

ЧАСАПІС

## Слова Сандамірскага

**Сярод жыхароў Глуска Навум Сандамірскі — не проста асоба, а асоба надзвычай яркая. Увесь свой талент ён аддае раённай сталіцы, якую лічыць роднай, хоць тут і не нарадзіўся. Навум Барысавіч вырас у Глуску як журналіст, як пісьменнік, як чалавек з адкрытай багатай душой.**

**Н.Сандамірскі — рэдактар раённай газеты "Радзіма", вельмі цікавай газеты, якая ў адрозненне ад многіх сродкаў масавай інфармацыі, што шукаюць яркіх, але вонкаых эфектаў, займаецца глыбіннымі пластамі эканомікі, культуры, як, дарэчы, і сам кіраўнік раёнкі.**

**Два гады назад у Мазырскай узбуйненай друкарні выйшла першая кніга Навума Сандамірскага "Людзі. Час. Жыццё", у якой ён выступіў як здольны нарысіст. Аўтар усхвалявана расказаў пра знакамітых людзей Глушчыны, якія нарадзіліся ў гэтым непаўторным краі. Сярод іх кніжны графік Аляксандр Тарасевіч, які тварыў у XVII—XVIII стагоддзях; пісьменнік Альберт Абуховіч, вядомы яшчэ як граф Бандынелі, чыё імя з замілаваннем вымаўлялі Максім Багдановіч і Максім Гарэцкі; паэтка-перакладчыца Ядвіга Машынская-Гельтман; паэты Сяргей Грахоўскі і Янка Бобрык; славуты танкіст Вялікай Айчыннай вайны палкоўнік, двойчы Герой Савецкага Саюза Сцяпан Шутаў; вядомы беларускі хірург прафесар Іван Арцішэўскі; кампазітар Валерый Іваноў і іншыя.**

**Спонсарам выдання выступіў аддзел культуры мясцовага выканкама...**

**І вось адна за другой выйшлі новыя кнігі Навума Сандамірскага "Мястэчка-2, альбо Настальгічнае сола на пішучай машынцы", "Танальнасць: соль-мінор", "Жыццё як анекдот", кожная з якіх з'яўляецца самабытным творам і чытаецца з цікавасцю.**

**Навум Сандамірскі — дзяржаўны стыпендыят 1997 года ў сферы культуры і мастацтва, шматразовы дыпламант творчых конкурсаў розных узроўняў. Выступае і як паэт.**

**Слова Навума Барысавіча Сандамірскага то сумнае, то вясёлае і ідзе яно заўжды ад жыцця і добрага сэрца.**

**Іван ПЕХЦЕРАЎ**
*г.Магілёў*

## "Арыштаваныя" шэдэўры

**У канцы лістапада супрацоўнікі Брэсцкага АУС на транспарце затрымалі дзве партыі ікон, якія, мяркуецца, рыхтаваліся да вывазу за мяжу. Сярод 83 прадметаў даўніны ёсць сапраўдныя шэдэўры, якія маюць велізарную каштоўнасць. Па папярэдніх ацэнках агульны кошт ікон — 1,3 млрд. рублёў. Беларускія міліцыянеры звязаліся з расійскімі калегамі, каб устанавіць, ці ёсць сярод затрыманых каштоўнасцяў украдзеныя з музеяў і храмаў суседняй дзяржавы. Да высвятлення ўсіх абставін творы мастацтва часова "арыштаваны" супрацоўнікамі Брэсцкага АУС на транспарце.**

**На здымку: старшы оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку Брэсцкага аддзела ўнутраных спраў на транспарце Мікалай Бошаль.**

**Д.ЖУРАЎЛЁЎ**
*Фота А.МАЦЮША*

## Запрашаем!

**27 снежня 1998 года спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР і Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы Анатоля Вялюгіна. Яго імя навечна прапісана ў нашай нацыянальнай культуры, у сэрцах яго шматлікіх вучняў, у памяці тых, хто жыў і працаваў побач з ім.**

**З гэтай нагоды 23 снежня ў вялікай зале Дома літаратара (Мінск, вул. Фрунзе, 5) адбудзецца вечарына. Запрашаем усіх, каму дарагая памяць пра выдатнага Майстра паэзіі. Пачатак вечарыны ў 18.30. Уваход вольны.**

**САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ**

ВАРУНКІ

# Населены востраў

Вёска толькі тады застаецца вёскай, пакуль жыве ў ёй хоць адзін чалавек. Жахлівая выснова! Але колькі на Беларусі паселішчаў, дзе ўжо і жыццю радавацца няма каму. І не толькі ў Чарнобылі справа. І без радыяцыі выміраем ударнымі тэмпамі. А жыццё, як чортава гадзіна — і хацеў бы парадавацца, ды нуда перашкаджае...

Таму і здзівіўся без меры, калі даведаўся, што на Іўеўшчыне, на хутары Востраў, жыве ўжо колькі часу Аляксандр Квач. Дарма што малады (22 гады толькі), але ўчэпісты, самастойны, да працы прагавіты. "Майстар на ўсе рукі", — з павагай гаворыць старшыня сельсавета. Уся яго гаспадарка — найлепшы таму доказ. Узяць хаця б уласнымі рукамі зробленую піларраму! А як жа інакш. Умовы жыцця на Востраве такія, што адзіная надзея толькі на ўласныя мазалі ды галаву.

Тут, на хутары, Сашу і яго брата Алега выгадавала ды паставіла на ногі бабуля. Алег пасля Мірскай мастацкай вучэльні ў Лідзе разьбяром па дрэве працуе. А Аляксандр, адслужыўшы ў войску, вярнуўся да сваёй 74-гадовай бабулі Марыі Міхайлаўны Астрэйкі. Вярнуўся на Востраў яшчэ адзін яго жыхар. А ўсяго іх тут чатыры на дзве хаты. Акрамя бабулі з унукам, жыве яшчэ сям'я Пясецкіх. Уладзімір Станіслававіч трактарыстам робіць у калгасе "Маладая гвардыя" (восем кіламетраў ад хутара), а Галіна Вікенцьеўна — дома працуе, па-гарадскому сябе называе — "хатняя гаспадыня". А дзеці іхнія — у Лідзе, сярод цывілізацыі...

Назва ў Хутара трапная, не са столі ўзятая. Удалечыні ён ад магістраляў і аўтадарог. Няма тут ні магазіна, ні фельчарскага пункта. Вялікая раскоша для чатырох! "Хуткая дапамога" па бездарожжы ніколі не дабіралася, пошта затрымліваецца пастаянна. І ніякіх аўтобусаў рэйсавых. Вось так пешкі і звязваюцца са светам, ідучы праз вузенькую кладку, якую Саша з Пясецкім майструюць штогод. Шыбуюць праз лес, луг... А можна і на лодцы па адной з дзвюх хуткаплынных рачулак. Па свежы хлеб, па іншыя прадукты, па сякую-такую драбязу для хатняй гаспадаркі. Слухаючы шум лесу, зацятыя птушыныя сваркі, любуючыся маляўнічым наваколлем...

Па мне дык лепей пешкі. Па лясной сцежцы. Да таго моманту, калі сонейка перастае скакаць ад дрэва да дрэва і раптам пачынае біць у вочы неўтаймаваным патокам... Ад ручая ў невялічкім ярку сцежка вядзе пакручаста ўверх. І вось ён — Востраў! Акуратны ды дагледжаны. Ля бліжэйшай хаты корпаюцца куры, лянівым брэхам сустракае сабачанё. І абавязкова выйдзе насустрач бабуля. У фартуху і вылінялай хусцінцы. Сама невялікая, а голас, надзіва, басавіты:

— Усім радуюся ад усяго сэрца. Што гасцям, што падарожным... Далёка ты зайшоў. Па патрэбе якой ці так?

— Ды ў госці да вас. І на Востраў паглядзець... Не баіцеся вы тут, на хутары?

— А чаго баяцца. Ваўкоў няма. Дый Бог беражэ...

Не любіць баба Маша размоў пра перасяленне ў вёску, дзе людзей паболей, магазін ёсць, бальніца, іншыя выгоды. Маўляў, яно мо і лепей было б, але хто яго ведае, як павернецца потым. А тут усё ж і мясціны родныя, і ўнук Саша побач. Хто, як ні ён, у паводку на плыце да крамы бліжэйшай дабярэцца? Хто, як ні ён, словам добрым ды клопатам падтрымае, калі на душы цяжка?..

У хаце бабулінай — стол драўляны самаробны, венскія адмысловыя крэслы. У чырвоным куце, як і трэба — абразы святыя. У другім — грубка з ляжанкай (якая без яе вясковая хата!). Па сценах — фотаздымкі ў рамках. Барадатыя дзяды на іх, маладыя хлопцы ў пілотках, жанчыны сарамлівыя ў хустках. Гадзіннік-ходзікі, адрыўны каляндар... Вось і ўсё багацце бабулі Міхайлаўны.

П'ём цёплы квас, халодны і смачны. А бабуля расказвае, як насвавольнічалі паблізу меліяратары. Калісьці працякала праз лагчыну рачулка з чыстай, як крышталь, вадой. Зараз не лагчына, а яміна сцёкавая. Не завяршылі сваю справу меліяратары, рачулку ўшчэнт сапсавалі. Больш таго, няма пад'езду да хутаранскіх падвор'яў. Каб сена з луга даставіць, круг у два-тры кіламетры рабіць трэба...

Але ўсё роўна — рай тут. Лес падступае да самых акенцаў. Спакойна неяк на душы. Дзяцінствам пранізліва пахне. Толькі вось баба Маша старая зусім. Нядаўна сэрца прыхапіла. Думала, што памрэ. Напалохалася, што ўнуку клопатаў лішніх наробіць. Але не, пратрывала. Не першы раз. Іконы дапамаглі, унук ды мясціны родныя...

Так, старэе Беларусь. Тужыцца ад болю, трывае ды пакутуе ад абыякавасці, хапаецца за карані, але старэе. Паспешліва ды няўмольна. Жанчын, якім за семдзесят, у некалькі разоў больш, чым мужчын. І адзінокія яны ў асноўным. Жывуць сярод дзяржавы, нібы на востраве, нікому ўжо непатрэбныя. Як дабрыня, сумленне, як мудрасць... Разумее гэта бабуля. Але пашанцавала ёй — Саша побач. Усю цеплыню сваю аддала яна хлопцу, той зараз доўг вяртае. І не ў цяжар яму. Рэдкая справа, спадарове! Разам і на падвор'і ўпраўляюцца, жывёлу гадуюць, з агародам упраўляюцца. Разам і шчасце з горам дзеляць. Клопатаў процьма штодня, але Міхайлаўна не скардзіцца на долю. Адна толькі думка: не дай Бог, стоміцца душа ўнукава, не дай Бог, з'едзе куды, бабулю кінуўшы. Але паглядзіць на яго і супакоіцца. Побач ён заўжды. І на гаспадарцы сваёй паспявае, і ў "Маладой гвардыі" падпрацоўвае машыністам на зернесушылцы. Прыгожы, пяшчотны, працавіты — як без яго?!

— Ды не кіну я бабулю, не кіну родных месцаў, — пераконвае Саша. — І задумак шмат. Каб бабулю і сябе падтрымаць, статак развесці можна ды фермерствам заняцца...

Саша Квач — самы малады жыхар на хутары. Жыццё тут будучае толькі ад яго залежыць. Востраў пакуль населены, як тая Беларусь выспай пасярод Еўропы. Востраў дабрыні, пяшчоты, надзеі і халоднай абыякавасці адначасова. Што пераможа?

**Віктар ЖЫБРЫК**
*Іўеўскі раён*

І ПРА НАС

# Між сорамам і страхам

Палітычны канец Хрушчова быў прадвызначаны яго ўласнай палавінчатасцю, калі ён не рашыўся прызнаць сваю частку віны за злачынствы сталінскага часу. Ён зрабіў "казлом адпушчэння" спачатку Сталіна, пасля — Пастэрнака, а напаследак ператварыў у цэлы статак "казлоў адпушчэння" столькіх маладых мастакоў і пісьменнікаў.

Брэжнеў нацягнуў шкуру "казла адпушчэння" на Хрушчова і паплаціўся тым, што ў рэшце рэшт сам апынуўся ў ёй.

Наступным у гэтай навязанай яму незайздроснай ролі апынуўся Гарбачоў. Няўжо "казлом адпушчэння" стане і сам Ельцын, вінаваты таксама ў многім, але хіба ва ўсім і хіба толькі ён адзін? Калі гэта здарыцца, далейшая гісторыя Расіі ператворыцца ў бясконцае "казлашукальніцтва". Адзіны ўздым, які зараз назіраецца ў нас у краіне, гэта ўздым пагалоўя "казлоў адпушчэння".

А мы з вамі што, гэткія ўжо ўсе чысценькія?

Існуе віна грамадства, віна народа, хоць мы любім ідэалізаваць народ як нешта бязвіннапакутніцкае. Але народ не можа рабіцца ахвярай бясконцых падманаў, калі сам не жадае быць падманутым. Народ не можа дазваляць разбураць краіну, калі ў ім самім няма самаразбуральных тэндэнцый. Народ не можа гэтак лёгка "здаваць" сваіх герояў, ды і проста суграмадзян, калі не здаецца сам. У масавым генацыдзе ў нас вінаваты не толькі Сталін, але і самі "масы", якія пакорліва галасавалі на сходах за знішчэнне "ворагаў народа". Трэба ўзяць на нашы агульныя плечы гістарычную віну за кожнага чалавека, страчанага краінай. Мы ўжо амаль навучыліся вяртаць — мёртвых. Трэба навучыцца вяртаць жывых.

Трэба перастаць шпурляцца людзьмі, выкідваючы іх з палітыкі, з навукі, з індустрыі, з сістэмы адукацыі, з медыцыны, з мастацтва — ці ў беспрацоўе, ці ў заробкі, якія прыніжаюць прафесійную кваліфікацыю, чалавечую годнасць, ці за мяжу. Людзі не могуць паважаць дзяржаву, якая не паважае людзей.

Можна страчваць грошы, але нельга страчваць годнасць. А можа, пара навучыцца не страчваць ні тое, ні другое? Але перш за ўсё нельга дазволіць сабе злачынную раскошу страчваць людзей.

Лёс людзей павінен нарэшце перастаць залежаць толькі ад кіраўнікоў.

Падмурак грамадства павінен быць непарушным, нягледзячы на змену жыхароў верхніх паверхаў.

Людзі хочуць ведаць — куды мы ўсе ідзём? Якое грамадства мы будуем? Нам непатрэбна гвалтоўная ідэалогія — нам патрэбны ідэалы. Назад нам нельга — там ГУЛАГ, цэнзура, замкнёныя межы, аднапартыйная сістэма. Але нельга дапусціць новай разнавіднасці аднапартыйнай дыктатуры — дыктатуры партыі грошай.

Мы — між сорамам і страхам. Вярнуцца ў мінулае — страшна, за сённяшні дзень — сорамна. Не хочацца, каб наша краіна, як раней, выклікала страх, але не хочацца і сораму за яе.

Расія шукае Расію. Хто шукае сам сябе, той яшчэ не страчаны.

●

Быць песімістам — самы лёгкі спосаб выдаваць сябе разумнейшым за іншых. Ды й ці гэтак ужо ўсё безнадзейна?

Нават на глухой сцяне можна намаляваць фортку надзеі.

У часе абвалу рубля я быў у Маскве, дзе натоўпы людзей атакавалі банкі, спрабуючы выдрапаць амаль абясцэненыя зберажэнні. Але адначасова — іншыя, а можа быць, тысячы тых жа самых людзей бралі ў асаду кіёскі кніжнай ярмаркі, каб на апошнія грошы купіць кнігі. Трыумфальны парадокс? Кніжны пір у часе чумы?

Як сярод людзей, гэтак і сярод кніг адбываецца смяртэльная схватка нахабна распярэзанай бездухоўнасці і прыніжанага, але не падуладнага прыніжэнню чалавечага духу. Я быў шчасліва ашаломлены, убачыўшы два першыя тамы васьмітомніка Георгія Адамовіча — найтонкага паэта, эсэіста, які спалучыў і пецярбургскую, і парыжскую "ноту". Самому Георгію Віктаравічу і прысніцца не магло, што калі-небудзь усе ягоныя артыкулы, нават самыя малыя, будуць беражліва сабраны ў той самай Расіі, якая калісьці выштурхнула яго ў эміграцыю.

Кажуць, у часе другой сусветнай вайны Чэрчыль, убачыўшы ў Маскве чырванашчокага рускага салдата, які на саракаградусным марозе еў эскімо, усклікнуў: "Народ, які есць марожанае пры тэмпературы мінус сорак, непераможны!"

Народ, які нават у часе дэпрэсіі купляе кнігі, не загіне. Але шмат што залежыць ад таго, якія гэта кнігі.

Ёсць кнігі, напісаныя як бы па-за існаваннем сумлення. Але акурат нашаму сумленню і ягоным часам невыносным пакутам мы абавязаны ўсім лепшым і ў кнігах, і ў нас саміх. Па-мойму, самае страшнае — гэта застацца без страху перад уласным сумленнем...

*(Фрагменты з артыкула Яўгенія Еўтушэнкі "Між сорамам і страхам", апублікаванага ў "Літаратурнай газеце" 2.XII.98 г., N48 / 5724)*

# Памяці мастака

На будынку мастацкіх майстэрань з боку вуліцы Сурганава ў мінулы чацвер адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар заўчасна памерлага выдатнага беларускага мастака Аляксандра Кішчанкі. Аўтары дошкі — скульптар Алена Харабе-руш і архітэктар Сяргей Казлоўскі, стварэнне яе фінансавалася Мінгарвыканкамам па пастанове Саўміна РБ. Дошка сама па сабе нясе адбітак творчасці мастака, разам з партрэтнай выявай А. Кішчанкі тут выкладзены прынцыповы момант творчага почырку аднаго з лепшых беларускіх манументалістаў.

На адкрыццё сабралася кола сяброў Аляксандра Кішчанкі. Цёпла ўспаміналі яго народныя мастакі Беларусі Г. Вашчанка, Л. Шчамялёў, У. Стальмашонак, старшыня Саюза мастакоў Г. Буралкін, удава мастака Ніна Уладзіміраўна. Увесну наступнага года мяркуецца адкрыццё надмагільнага помніка мастаку на Маскоўскіх могілках.

# Паніхіда па Максіму

107-ыя ўгодкі Максіма Багдановіча музей яго імені адзначыў традыцыйна — ля сталічнага помніка. Саюз пісьменнікаў упершыню стаў ініцыятарам акцыі не свецкай, а — духоўнай: у царкве св. Мікалая-цудатворца (што ў пасёлку Ратамка) адбылася паніхіда за супакой душы паэта і вечную памяць аб ім. Узрадавацца душа Максіма магла б і праз тое, што ўся служба вялася па-беларуску. У ёй удзельнічалі мясцовыя прыхаджане, а таксама група творчай інтэлігенцыі з Мінска. Пранікнёнае слова сказала паэтка Ніна Загорская. У прыватнасці, яна згадала, на якім высокім узроўні адзначалася 100-годдзе адданага сына Айчыны.

Настаяцель царквы а. Аляксандр (Міхейчык) запрасіў вернікаў на свята: 27 снежня споўніцца год, як царква св. Мікалая была асвечана мітрапалітам.

**Г. К.**

ГЭТА МЫ...

# Лёс каменнай балады

***Нашу Беларусь называюць краем лясоў і балот. Адсюль, маўляў, і ціхамірнасць, няяркасць, пастэльнасць беларускіх краявідаў і пейзажаў, адсюль і ментальнасць самога народа нашага (яго цярплівасць, рахманасць, памяркоўнасць і славутая талерантнасць). Іншая справа, скажам, Арменія — краіна гор, каменю, яркіх і кідкіх пейзажаў і цвёрдых духам, мужных і няўрымслівых людзей. Арменія — гэта агністыя, стракатыя, рэзка-кантрастныя палотны Сар'яна. А Беларусь — ціхія, задуменныя, прыглушаныя мройлівай смугою летняга поўдня ці шызым асеннім туманком пейзажы Бялыніцкага-Бірулі...***

Такое ўспрыманне Беларусі стала звычным, агульнапрынятым, абыходкавым не толькі для нашых суседзяў, для нашых гасцей зблізку і здалёку, але ўжо, бадай, і для нас саміх. А між тым гэта не так, нават — зусім не так. "Жыта, сосны і валуны" — назва кнігі вершаў чыйго, якога народа паэта? Нашага, беларускага. Суседства жыта, соснаў і валуноў — вось незабыўны і любы сэрцу кожнага беларуса родны краявід. Аказваецца, Беларусь — гэта яшчэ і краіна валуноў...

Што такое валуны? Гэта ледавіковыя камяні ад 10 сантыметраў да 3 метраў (і больш) у папярэчніку, што раскіданы па ўсёй нашай зямлі, але найбольш — на поўначы нашай Бацькаўшчыны: на Гродзеншчыне, Міншчыне, Віцебшчыне. Сям-там іх зашмат, яны ўтвараюць цэлыя валунныя роскіды, валунныя палі, камяністыя глебы, сям-там ляжаць асобнымі велізарнымі глыбамі — дзе-небудзь на ўскрайку лесу, на схілах равоў, уздоўж дарог і рэк, надаючы непаўторную прыгажосць краявідам роднага краю. Усе яны — іншаземцы на нашай зямлі, прыцягнуты сюды мацерыковымі (покрыўнымі) ледавікамі з Поўначы, пераважна са Скандынавіі не адну тысячу гадоў назад і прадстаўлены самымі рознымі пародамі магматычнага, метамарфічнага і асадкавага паходжання. Яны могуць шмат расказаць дапытліваму даследчыку: адкуль, як сюды трапілі і якімі шляхамі, адказаць на пытанні аб колькасці зледзяненняў, цэнтрах зараджэння ледавіковых патокаў, напрамках іх руху, месцах прыпынку і на многія іншыя, звязаныя з ледавіковай дынамікай, ледавіковым асадкаўтварэннем і палеагеаграфіяй.

Аднак жа я — не пра гэта. Валуны з гэтага пункту гледжання хай застаюцца аб'ектамі вывучэння вучоных. Я ж пра валуны — акурат як пра аздобу роднай зямлі, як пра спаконвечных спадарожнікаў жыцця беларусаў, каменных татэмаў і багоў, якім пакланяліся нашы продкі, надзяляючы гэтых незвычайных тварэнняў прыроды звышмагутнымі і чароўнымі ўласцівасцямі, урэшце — як пра адметныя і вельмі каштоўныя помнікі прыроды, якія варты ўвагі, аховы і збережэння.

Ды, калі папраўдзе, нават і не пра гэта. Мы, у масе сваёй, сапраўды бадай, як казаў паэт, лянотныя і нецікаўныя. Тым больш — да камянёў. Камень — ён і ёсць камень. Ляжыць сабе пры дарозе ці на мяжы — ну то хай і ляжыць. А як раптам акажацца на дарозе ці знячэўку вясною з раллі вылезе напаверх, дык адно клопату лішняга дадае — трэба яго скаціць з дарогі на ўзбочыну; з раллі ж, калі сілы стае, трэба ўскаціць на тую ж мяжу, а не стае, дык вымушаны чалавек капаць яму і апускаць камень глыбей, каб не замінаў зямлю апрацоўваць.

Асабіста ў мяне з каменнямі найчасцей адносіны былі акурат такія. Прынамсі, нейкай асаблівай цікаўнасці, а тым больш замілавання да іх не было. Трошкі змяніліся гэтыя адносіны пасля таго, як пачала гаспадарыць на леціішчы на Лагойшчыне. Камянёў там — як даўней авечак у полі. І клопату з імі — не абярэшся. Але, з другога боку, нечым яны і вока цешаць. Выкладзеная з валуноў падпорная сценка за хатай — люба паглядзець! Прыгожа глядзіцца і кветнік у каменнай аблямоўцы. Ну, а купка вялізных валуноў сярод беластволых бяроз у канцы гарода — дык і зусім райскі куточак!

Але й гэтыя мае стасункі з камянямі не надта змянілі погляд на іх. Каб расчульвацца ды, скажам, шкадаваць іх — да гэтага не даходзіла. Зірнуць на камень-валун па-іншаму дапамагла сустрэча з навуковым супрацоўнікам Інстытута геалагічных навук Нацыянальнай акадэміі навук Валерый Вінакураў, які ў іх сапраўды ўлюбёны, які ўспрымае іх калі й не жывымі, дык, прынамсі, такімі ж адметнымі, непадобнымі адзін на аднаго, датклівымі стварэннямі, і якія, на ягоную думку, вымагаюць ад чалавека гэткай жа ўвагі і клопату, як і ўсё іншае на зямлі.

Ці кожны з вас, чытач, ведае пра мінскі музей камянёў? А хто з вас быў там? Не ўпэўнена, што ўсе ведаюць і ўсе былі там. Я, прызнаюся, да сёлетняга года не ведала і не была. Сорамна ў гэтым прызнавацца, аднак жа яно гэтак: не ведала і не была. А між тым, музей — унікальны, аналагаў якога няма на ўсёй прасторы былога СССР і якіх, зрэшты, не так шмат і ў свеце.

Знаходзіцца ён на ўскраіне Мінска, паміж мікрараёнам Уручча і Акадэмгарадком, на былым балоце. Музей ці парк камянёў — гэта яго неафіцыйная назва, афіцыйна ж ён называецца Эксперыментальнай базай ледавіковых валуноў Інстытута геалагічных навук НАН Беларусі. На плошчы каля 6,5 гектараў сабрана больш чым 2 тысячы (калі дакладна, дык — 2134) ледавіковых валуноў, найбольш характэрных для кожнага рэгіёна Беларусі.

Ідэя стварэння гэтага унікальнага музея належала аднаму са старэйшых нашых акадэмікаў Гаўрылу Іванавічу Гарэцкаму (прозвішча гэтае сапраўды знакавае для нашай Бацькаўшчыны!). Яшчэ ў 70-я гады, бываючы ў палявых экспедыцыях, Гаўрыла Іванавіч звярнуў увагу на лёс... валуноў. Ад ягонага пільнага вока геолага не схавалася тая акалічнасць, што валуноў на беларускіх абшарах з кожным годам застаецца ўсё менш і менш. Яны бязлітасна знішчаліся. Меліяратары, да прыкладу, мелі нават спецыяльную інструкцыю па іх ліквідацыі, паводле якой вялізныя валуны (больш за 2 метры ў дыяметры) належала знішчаць на месцы, а меншыя, драбнейшыя — скідваць у крушні, каб пасля таксама знішчыць. Не звярталася ўвага ні на унікальны падчас геалагічны склад камянёў, ні нават на тое, што асобныя з іх мелі ў тутэйшых людзей асаблівы статус: былі калісьці аб'ектамі пакланення, з імі былі звязаны мясцовыя легенды, міфы, паданні.

Гаўрыла Іванавіч забіў трывогу, пачаў стукацца з прапановаю аб стварэнні музея валуноў пад адкрытым небам у розныя дзверы, у тым ліку ў прэзідыум акадэміі, ва ўрад. У 1975 годзе нарэшце была прынята пастанова, і толькі 1977-ым, створана і спецыяльная экспедыцыя на чале са згаданым ужо мною В. Вінакуравым...

Больш чым сем гадоў вучоныя ездзілі па Беларусі і збіралі для будучага музея яго незвычайныя экспанаты. Неўзабаве пачаліся і будаўнічыя работы на выдзеленай на былым балоце пляцоўцы пад музей, звозіліся сюды, на пастаяннае месца, валуны з запаснікаў. І ў 1985 годзе музей прыняў першых наведвальнікаў. Уражваў ён надзвычайна. Яно й не дзіўна: вачам адкрывалася сапраўды унікальная карціна!

Цэнтральную, найбольшую частку плошчаю каля 6 гектараў заняла экспазіцыя "Карта Беларусі", на якой размясцілася больш чым 500 буйных валуноў. Была зымітавана ўся Беларусь у мініяцюры (гарызантальны маштаб — 1:2500 і вертыкальны — 1:100), з захаваннем асноўных дэталяў рэльефу. Насыпныя пагоркі адпавядалі ўзвышшам і градам, пешаходныя дарожкі і сцежкі — рэкам, два невялікія штучныя вадаёмы — Мінскаму мору і Нарачы. Месцы размяшчэння Мінска і абласных гарадоў пазначаны трыма блакітнымі елачкамі. Па контуры карты — пешаходная сцяжынка, абсаджаная нізкарослымі кустамі. У размяшчэнні валуноў на "карце" захаваны прыродна-геаграфічны прынцып — кожны валун, прывезены з таго ці іншага кутка Беларусі, лёг тут, на "карце" па сваім былым адрасе. Россыпы валуноў адпавядаюць месцам прыпынку ледавіковых патокаў, што пакінулі пасля сябе ўзвышшы і грады. Камяністымі аказаліся і раўніны, створаныя ў час руху ледавікоў. Гэтыя асаблівасці размеркавання валуноў паказаны тут крушнямі для Прыбугскай і Цэнтральна-Бярэзінскай раўнін.

"Карта" (амаль натуральная, так бы мовіць) дае магчымасць наведвальніку не толькі акінуць вокам усю тэрыторыю Беларусі, але і пашпацыраваць на сцяжынках-рэках, пабачыць асноўныя рысы рэльефу краіны, пазнаёміцца з асаблівасцямі складу і будовы валуноў розных раёнаў і розных эпох зледзяненняў.

"Карта Беларусі" зарыентавана па баках свету. На паўночны захад ад яе размешчана экспазіцыя валуноў "Жывільныя правінцыі". На плошчы каля 0,7 гектара — паглыбленне, што адпавядае Балтыйскаму мору з Батнічным і Фінскім залівамі, і пагоркі — "тэрыторыя Фенаскандыі", адкуль прыходзілі да нас ледавікі. Тут мяркуецца размясціць так званыя кіроўныя валуны, для якіх вядомы месцы іх былой радзімы, іх карэннага залягання. Яны дадуць уяўленне аб складзе парод Шведскай, Балтыйскай, Фінскай і Карэльскай жывільных правінцый.

На паўднёвым усходзе размешчаны "Петраграфічны збор" валуноў, які паказвае асноўныя, досыць шматлікія пароды магматычнага, метамарфічнага і асадкавага паходжання валуноў. Экспазіцыя выканана ў форме кола (плошча яго — каля 0,2 гектара), якое абкружаюць і падзяляюць яго на чатыры сектары пешаходныя сцяжынкі. Замкнёная прастора кола (круга) сімвалізуе ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць усіх парод у прыродзе.

На поўнач ад "Петраграфічнага збору" ляжыць экспазіцыя "Форма", у якой прадстаўлены валуны і вырабы з іх, якія маюць гістарычнае і культурнае значэнне для нашага народа. У прыватнасці, тут можна азнаёміцца з камянямі-следавікамі, каменнымі крыжамі, жорнамі-камянямі, камянямі са знакамі язычніцкіх (паганскіх) часоў.



З заходняга боку ўздоўж "карты" ідзе "Алея валуноў" — пешаходная сцяжына, што злучае Акадэмгарадок і мікрараён Уручча. Тут несупынным ланцугом двума радамі выкладзены найбольш буйныя валуны-волаты, прывезеныя з розных мясцін Беларусі.

Музей валуноў сабраў, вядома ж, толькі невялікую, хоць і надзвычай уразлівую, частку каменнага багацця Бацькаўшчыны. Ён мае не толькі навуковае, але і прыкладное, культурна-пазнавальнае, выхаваўчае значэнне. Музей гаворыць наведвальнікам, што валуны — гэта частка нашай прыроды, якая вартая ўвагі, вывучэння і аховы, як і вада, лес, карысныя выкапні, як навуковая, культурная і духоўная спадчына нашага народа.

Што гэта сапраўды так, сведчаць многія экспанаты музея, найперш тыя, што сабраны ў зборы "Камень у жыцці чалавека". Быў, скажам, час, калі нашы продкі пакланяліся паганскім багам, у тым ліку і камяням. Для гэтага выбіраліся камяні асабліва буйных памераў і форм, што нагадвалі жывёлін ці нейкіх містычных істот. Захаваліся камяні з імёнамі язычніцкіх багоў Перуна, Вялеса, Дажбога. Здаўна сярод беларусаў былі распаўсюджаны легенды і паданні аб валунах. Захаваліся і дагэтуль, скажам, легенды аб камянях-пярэваратнях, у аснове якіх ляжаць уяўленні аб ператварэнні ў камяні людзей, жывёл і нават дамоў. Супрацоўнікі Інстытута геалагічных навук адшуквалі такія камяні і прывозілі іх у музей. Так сюды трапілі 8 валуноў з адзнакамі, што ляжалі на вуліцы вёскі Стайкі Лагойскага раёна праз пэўныя прамежкі адзін ад аднаго. У Маладзечанскім раёне ў вёсцы Бярозаўка ляжаў камень, на якім быў высечаны чатырохканцовы крыж і надпіс: "1842 АН". Апытанне мясцовых жыхароў дазволіла высветліць, што ў 1842 годзе жыхар гэтай вёскі Адам Галдакоўскі купіў тут сабе зямлю і ўласнаручна выбіў на камені дату і свае ініцыялы (лацінкай).

Ёсць у экспазіцыі і каменныя крыжы. Адзін з іх высечаны з буйна-зярністага ружовага граніту. Знайшлі яго на сярэдневяковых кладах ва ўрочышчы Каралёў Стан. Вышыня крыжа — 1,8 метра, шырыня — 1,1 метра, таўшчыня — 0,4 метра. На крыжы выбіты схематычны абрыс рыцара з мячом у правай руцэ і шчытом у левай. Пад рыцарам — надпіс RSB і пад ім — два кругі (адзін у другім). Верагодна, што надпіс чытаецца, як Rex Stefan Batory (кароль Стэфан Баторый). Паводле падання, ля каменя-крыжа абедаў кароль у час аднаго з паходаў на Усход у перыяд Лівонскай вайны.

Ёсць тут і крыж-ідал (чалавекападобнай формы) даўжынёю 1,7 метра, шырынёю — 1 метр і таўшчынёй у 0,22 метра. Стаяў ён непадалёк ад вёскі Даўгінава Вілейскага раёна.

Нямала камянёў-следавікоў: След Багародзіцы, След Хрыста, След Маці Боскай і інш.

Трапіў сюды і камень "Дзед" з вуліцы Лодачнай у Мінску. Ён быў адным з элементаў старажытнага капішча на беразе Свіслачы. Капішча ўяўляла пляцоўку 20х20 метраў, там рос вялізны дуб, ляжаў камень "Дзед", было месца для вогнішча, абкладзенае каменнямі, быў калодзеж-крыніца, з якога людзі бралі святую ваду. На гэтае месца мінчукі прыходзілі і пакланяліся яму ажно да 1905 года. "Дзед" нібыта дапамагаў жанчынам зацяжарыць, дзеля чаго трэба было прыйсці ўвечары і пасядзець на камені. Зараз "дзед" таксама ў музеі валуноў...

Многія ж валуны ў музей не патрапілі, хоць яны і варты былі б таго. Але іх немагчыма прывезці на новае "месца жыхарства" з-за аграмадных памераў. Яны аб'яўлены помнікамі прыроды.

У іншых краінах вельмі беражліва ставяцца да такіх аб'ектаў прыроды. Скажам, у Германіі ўзята пад ахову каля 800 валуноў, у Польшчы — 900, у Эстоніі — 200, Латвіі — 100, Літве — 80, у нас каля — 200 валуноў. Адзін з іх — каля вёскі Горкі Шумілінскага раёна. Гэта самы вялікі валун на Беларусі. Ён так і завецца — "Вялікі камень". Што ён вялікі, дык гэта бясспрэчна. Даўжыня яго — 11 метраў, шырыня — 5,6 метра, а бачная вышыня — 3 метры. Важыць ён больш чым паўтары тысячы тон.

Шурф, выкапаны ля стромай сцяны каменя глыбінёю 2 метры, ніжняй часткі валуна не дасягнуў, а далей капаць перашкодзілі грунтовыя воды. Вучоныя ж сведчаць, што звычайна ў такіх выпадках толькі адна пятая глыбы ўзвышаецца над зямлёю, а чатыры пятых — у зямлі.

У Кушлянах Смаргонскага раёна збярогся валун, на якім выбіты такі надпіс: "Памяці Мацея Бурачка" і стаіць дата: "1900". Мацей Бурачок, як вядома, гэта наш першы вялікі паэт Францішак Багушэвіч, а 1900 год — год ягонай смерці. Багушэвічаў валун мае ў даўжыню 2 метры, ушыркі ён 1,8 метра, вышыня над зямлёю — 1,4 метра.

Застаўся на месцы камень-помнік старажытнай эпіграфікі XII стагоддзя Рагвалодаў камень каля Оршы.

Самы ж вялікі валун у музейнай калекцыі важыць 16 тон. Ён ляжыць тут на "Мінскім узвышшы", паколькі прывезены з-пад Лагойска. Мае ён маляўнічы выгляд...

Музей камянёў на пачатку свайго адкрыцця быў адмыслова абсталяваны, добраўпарадкавана ўся тэрыторыя. "Карта Беларусі" была засеяна травою аднаго колеру, астатнія плошчы — травою іншага адцення. Была закончана сістэма інжынерных збудаванняў, каналізацыя, палівачны і пітны водаправод, абсталяваны два фантанчыкі для наталення смагі наведвальнікаў. Пешаходныя дарожкі былі выкладзены пліткай. Паўсюль былі пастаўлены паркавыя свяцільнікі, каб музей можна было наведаць і ўвечары, каб ён стаў месцам не толькі экскурсій, але і месцам адпачынку мінчукоў мікрараёна.

*(Працяг на стар. 12)*

ЧАСАПІС

## Прадчуванне лёсу

**У кожнай кнігі, як і ў кожнага чалавека, — свой асабісты, у нечым вельмі адметны лёс. Так і ў гэтай, якая нядаўна пабачыла свет у жлобінскім выдавецтве "Тэхнічная кніга". Аўтар яе — Ігар Купрэеў — застаўся назаўжды 26-гадовым, бо загінуў менавіта ў гэтым узросце ў аўтамабільнай катастрофе. Ён нарадзіўся ў Светлагорску, тут вучыўся, марыў стаць мараком. Таму й паступіў у Балтыйскае мараходнае вучылішча, пасля заканчэння якога пабываў марскімі шляхамі ў Фінляндыі, Швецыі, Польшчы. І да апошняга дня свайго трагічна кароткага жыцця пісаў вершы. Нават блізкія сябры і настаўнікі не ведалі, што гэта не проста захапленне, а патрэба душы.**

**У кароткай прадмове да кнігі "На первом вздохе" Ізяслаў Катляроў дакладна зазначыў: "Паэзія толькі-толькі пачынала сябе дыктаваць яму. Узамен наіўных, часта няскладных, але такіх шчырых радкоў прыходзілі па-філасофску асэнсаваныя, журботна-прарочыя словы... Яго вершы пачыналі вызваляцца ад неабавязковых, падманлівых упрыгожванняў, ад уяўнай вучнёўскай вобразнасці. Яны шукалі сутнасці. І ўсё часцей знаходзілі яе".**

**"Отпустите меня за стихами", — прасіў Ігар Купрэеў у адным з вершаў. Але лёс не адпусціў, ён распарадзіўся пасвойму. Зрэшты, у многіх вершах — гэтае прадчуванне трагічнасці: "Пора идти навстречу к предкам, — туда, откуда нет пути...", "Смерть стоит теперь у порога, жизнь равна не годам, а дням...", "Дайте, пожалуйста, белый билет, он мне поможет попасть на тот свет", "Рожден я в потемках, а сгину в огне с застывшей гримасою страха..." І нейкай містыкай напоўнены радкі наступныя:**

*О, слава Богу, ты намного вырос,*
*Взрослее стал, заучивая текст.*
*И смотришь в зеркало, а в нем —*
*сплошная сырость,*
*Чугунный колокол,*
*дубовый старый крест.*

**Так, гэта было больш чым прадчуванне непазбежнага. Ён жыў, нібыта ведаючы ўсё загадзя. Але не трэба думаць, што Ігар Купрэеў пісаў толькі аб смерці. Шмат вершаў прысвяціў ён марской рамантыцы, каханню, бацькоўскаму дому. Вось як яшчэ 17-гадовым юнаком пісаў ён аб важнасці, непаўторнасці кожнага дня:**

*За двадцать четыре часа*
*Нужно сделать много,*
*Чтоб не просить никогда*
*Лишней минуты у Бога.*

**А вось як вобразна пачынаецца верш, прысвечаны першаму каханню:**

*Ты — неожиданность,*
*покинувшая истину,*
*И снежный ком,*
*растаявший в руке.*
*Уйдешь дождем,*
*а возвратишься листьями,*
*А может, звуком,*
*— тем, что вдалеке.*

**Першае знаёмства з кнігай Ігара Купрэева адбылося ў светлагорскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы. Нам з Ізяславам Катляровым — складальнікам гэтага паэтычнага зборніка — прыемна было пераканацца, што вершы знайшлі сваіх удзячных чытачоў. І яшчэ: не лішнім будзе зазначыць, што кніга пабачыла свет дзякуючы матэрыяльнай дапамозе многіх добрых людзей.**

**Соф'я ШАХ**

*Гэты здымак зроблены ў час прэзентацыі кнігі І.Купрэева ў светлагорскай цэнтральнай бібліятэцы.*

*Фота В.СТРЫБУКА*

# Як сама царыца

## ВОБРАЗ ЖАНЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ*

Вобраз жанчыны, маці шырока прадстаўлены на працягу ўсіх акрэсленых этапаў развіцця беларускай літаратуры. У дакастрычніцкі перыяд беларуская літаратура развівалася ў рэчышчы сусветнай, па яе законах, прынцыпах, але з улікам нацыянальнай спецыфікі. Стварэнне вобраза жанчыны, маці мела ў сваім падмурку сінтэз агульначалавечых каштоўнасцей і народных традыцый, паводле яго жанчына выкрышталізоўвалася як аснова і каталізатар жыцця чалавечага, як звязуючае звяно ў сям'і, як захавальніца сталага ладу і звычаяў, хаця нельга не прызнаць агульную дамінацыю мужчыны. Прыкладамі служыць творчасць нашых класікаў: Я. Коласа (1882—1956), Я. Купалы (1882—1942), Цёткі (1876—1916), М. Багдановіча (1891—1917), — а таксама фальклор.

Але ў беларускай літаратуры яшчэ раней, у Сярэднявеччы, што вельмі важна, з'явіўся яркі вобраз жанчыны, маецца на ўвазе "Жыціе Ефрасінні Полацкай" (XII—XV стст.), якое апавядае пра дзейнасць выдатнай дачкі беларускага народа, першай усходнеславянскай святой і носіць дыдактычны характар. Існаванне такога твора, прысвечанага жанчыне, з'яўляецца знамянальным, бо Сярэднявечча — такі перыяд гісторыі, калі роля жанчыны ў грамадстве была зведзеная да мінімуму.

Фальклор беларусаў сцвярджае выключную ролю жанчыны ў сям'і, хатняй гаспадарцы, на маці ўскладвалася амаль цалкам выхаванне дзяцей. "У хаце чатыры вуглы, але тры з іх трымае на плячах жанчына", — так гаворыцца ў беларускай прымаўцы. У беларускіх звычаях назіраўся падзел працы па гаспадарцы паміж жанчынай і мужчынам, што набыло тэндэнцыю да знікнення пасля 1917 года.

Гэтыя традыцыі апісваюцца ў класічным творы беларускай літаратуры, паэме "Новая зямля" Я. Коласа, якая крытыкамі і чытачамі прызнана энцыклапедыяй сялянскага жыцця. Аўтар паказвае ролю жанчыны ў сям'і беларусаў; ёй належыць месца маці, гаспадыні. Парушэнне мяжы гэтых абавязкаў лічылася калі не негатыўнай з'явай, то, ва ўсялякім выпадку, неадэкватнай. У Коласа гераіня адпавядае нацыянальнай маралі.

*А маці слухае маўкліва,*
*Аб чымсьці думае тужліва,*
*Сказаць штось хоча і ўздыхае,*
*Штось за язык яе трымае.*

Так апісваюцца паводзіны маці пры вырашэнні мужчынамі пытання аб набыцці зямлі.

Жанчына ў купалаўскай паэзіі таго перыяду больш рамантызаваная. Паэт захапляецца ёю, гарманічнаю ва ўсіх адносінах. Нават штодзённая праца і будзённасць не фарбуюць вобраз у шэрыя колеры:

*Як сама царыца*
*ў залатой кароне...*
*("Жняя")*

У гэты ж перыяд вялікі ўклад у абуджэнне нацыянальнай свядомасці адводзіцца літаратурай маці. Напрыклад, у вершы "Сын і маці" Я. Купала ўкладвае ў вусны маці ўзнёслыя словы аб радзіме, нацыянальным адраджэнні, роднай мове, падкрэслівае яе ролю ў выхаванні свядомага беларускага грамадзяніна.

Цётка стварыла цэлую галерэю жаночых вобразаў, кожны з якіх увасабляе светлую, гуманістычную ідэю. Праз усё жыццё праносіць жанчына Цёткі вялікую любоў да сваіх дзяцей (лірычная балада "Тры кветкі"). Увасабленнем вечнага можна назваць трывалую, надзейную, не падуладную тлу субстанцыю — любоў маці. Глыбокая спагада гучыць у творах паэткі пра спрадвечных працаўніц: цяжкая штодзённая праца забірае прыгажосць, сілу, здароўе ("Вясковым кабетам"). Не для таго, каб марнець, прыходзяць у гэты свет жанчыны, а каб упрыгожваць жыццё — такая думка лучыць многія творы Цёткі. Бо жанчыны і ёсць найярчэйшыя кветкі зямлі нашай ("Лета").

Жаночыя вобразы твораў М. Багдановіча падаюцца часта ў заходнееўрапейскім духу (такая рыса прысутнічае наогул ва ўсёй творчасці паэта). М. Багдановіч як паэт і як мужчына пакланяецца ёй — Жанчыне з вялікай літары, яна і жыццё для аўтара "Вянка" (у раздзеле "Каханне і смерць") — паняцці тоесныя. Паэт глыбока спачувае жанчыне, адчувае сябе вінаватым за яе боль, але і радуецца новаму жыццю, якое даецца праз пакуты, часам нават смерць. "Каханне і смерць" — сапраўдны гімн жанчыне-маці і чалавечаму жыццю.

М. Багдановіч таксама быў першым беларускім пісьменнікам, хто спалучыў у адным вобразе маці і краіну ("маці-краіна"). Будучы вялікім патрыётам, ён надаў роднай зямлі жаноцкі пачатак, асацыіраваў Радзіму з асновай жыцця — жанчынай.

Грамадска-палітычныя змены 1917 г. пацягнулі за сабой умяшальніцтва пануючай ідэалогіі ў літаратуру. "Дыктатура пралетарыяту" ўзяла пад свой кантроль нават мастацтва, загнаўшы яго ў рамкі сацыялістычнага рэалізму і паставіўшы на службу ідэалогіі. Па сутнасці, літаратура робіцца мастацкай формай выкладання ідэй курсу ВКП(б). Ад гэтага літаратура не толькі шмат страціла і збяднела, але і перанасыцілася штучнасцю, назіраўся адыход ад агульначалавечых каштоўнасцей.

Перш за ўсё гэта выявілася ў стварэнні жаночых вобразаў, якіх часта нельга было наогул назваць жаночымі. Жанчына і рэвалюцыя, паняцці-антонімы, зліліся ў адно цэлае, стварыўшы жахлівы гібрыд, дагэтуль нябачаны, зусім непрывабны. Але ў той час так пісаць патрабавалася ад усіх. Добра, што наватворы літаратуры не праецыраваліся ў цэлым на жыццё, у якім жанчына па-ранейшаму захоўвала свае прыродныя функцыі. Але спробы былі. На такіх творах праводзілася выхаванне падрастаючага пакалення, паказвалася эмансіпацыя жанчыны ў савецкім грамадстве. Зрабілася нават модным для жанчын займаць у вытворчасці мужчынскія пасады, напрыклад, працаваць трактарысткай. Час для сямейных клопатаў скараціўся, доглядам дзяцей пачала ўсё больш і больш займацца дзяржава з мэтамі стварэння "савецкага чалавека", што разбуральна ўплывала на існаванне сям'і наогул. За няпоўных 50 гадоў — з 1923-га па 1970 год — час, які жанчыны аддавалі дзецям, скараціўся больш чым у тры разы. Доля дзяржавы ў выхаванні дзяцей павышалася яшчэ і за кошт дзяцей-сірот, колькасць якіх пасля 1917 года ўзрасла ў сувязі з войнамі, а потым рэпрэсіямі бальшавікоў.

Трэба адзначыць, што ў беларускай літаратуры не было тэндэнцыі апранаць жанчыну ў скураныя курткі, што назіралася ў рускай. Але ў 30-я гг. не існавала ў нас і яркага дысідэнцкага накірунку, прадстаўніком якога ў рускай літаратуры быў А. Платонаў, які ў трагікамічным (больш усё-такі ў трагічным) стылі паказаў жудаснасць з'явы, калі жанчына страчвае сваё боскае прызначэнне. Яно было адсунута не тое што на другі план, а адкідвалася аўтарамі як непатрэбшчына, як перажыткі старога, капіталістычнага ладу, як мяшчанства.

Літаратары вымушаны былі наступаць на горла ўласнай песні, нават тыя, хто ўжо займеў аўтарытэт (хаця нярэдка і гэта не выратоўвала ад рэпрэсій). Так, купалаўская руплівая, гарманічная жняя-царыца ператварылася ўжо ў нядбайную калгасніцу, якая, дарэчы, па новых крытэрыях пераўзыходзіла ва ўсім аднаасобніцу:

*Я калгасніца*
*маладая,*
*жыву весела,*
*а не дбаю.*

У процілегласць такім, можна сказаць, заказным радкам у народа з'яўляюцца творы, што адлюстроўваюць сапраўдную карціну савецкага жыцця:

*У калгасе добра жыць:*
*Адзін робіць — сем ляжыць.*

Жанчына ў многіх творах М. Зарэцкага ператваралася з цёмнай і забітай у свядомую рэвалюцыянерку, будаўніка новага жыцця (апавяданні "Гануля", "Пачатак шчасця" і інш.). Адваротныя ж метамарфозы ў развіцці жаночых вобразаў лічыліся дэградацыяй. Напрыклад, у "Паэме аб чорных вачах" М. Зарэцкага герой-рэвалюцыянер шукаў сваю саслужбоўку, таксама адданую ідэям рэвалюцыі. Знаходзяць яе ва ўтульным пакоі вельмі прывабнай жанчынай. Але не гэта ён марыў убачыць, а "таварыша, героя", прыгожы стан сяброўкі падаецца герою брыдкім. Калі рэальна глядзець на рэчы, проста псіхалагічная анамалія, але ў творы гэта падаецца фальклорная аснова, і гэта сведчыць аб тым, што паэт наследуе паэтычныя традыцыі, якім не адно стагоддзе. Праўда, пісаць "пад фальклор" — не значыць даваць сабе паслабленне. Падобная лёгкасць падманлівая, што і відаць пры ўважлівым чытанні верша "Каля студні, ля крыніцы". А каб упэўніцца, дастаткова прывесці дзве першыя страфы:

*У нядзельны дзень і ў будны*
*Ды вячэрняю парой*
*Сустракаюся ля студні*
*Я з жанчынай дарагой.*

*Зачарпну я ёй вадзіцы,*
*Набяру сабе вады,*
*І гамонім ля крыніцы*
*Мы, шчаслівыя тады.*

Можна нават не звярнуць увагі на такую "дробязь", як не да месца ўжытае слова "будны". Правільней, канечне, сказаць: "У нядзельны дзень і ў будзень..." Але ж яшчэ і студня нечакана ператварылася ў... крыніцу.

Але такія недагляды не могуць сапсаваць агульнага ўражання ад кнігі. Яна цікавая, вартая, каб знайсці свайго чытача. І добра, што з'явіліся людзі, якія аказалі фінансавую падтрымку выданню. А. Нафрановіч і выдавецтва "Мастацкая літаратура", як пазначана на другой старонцы зборніка "выказваюць шчырую падзяку генеральнаму дырэктару СП "Дзурупол-Суворaў" Валодзьку А. А. і старшыні калгаса "Дружба" Пастаўскага раёна Шылько Б. П."

**К. СВІДЗЕРСКІ**

КНІГАРНЯ

# З нарачанскага краю

Радзіма Аркадзя Нафрановіча — вёска Юшкавічы Мядзельскага раёна, што знаходзіцца за нейкіх пятнаццаць кіламетраў ад славутага возера Нарач. І хоць Аркадзь Іосіфавіч лёс свой пасля звязаў з Пастаўшчынай, памяць маленства назаўсёды захавала вабнасць родных мясцін. І невыпадкова сваю чарговую кнігу паэзіі, якая нядаўна выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура", ён назваў "Святло Нарачы".

Канечне, гэтая тэма прысутнічала і ў папярэдніх зборніках А. Нафрановіча "Мядзельскі мерыдыян" і "Мелодыі роднага краю" (абедзве пабачылі свет у 1995 годзе, у другой прадстаўлены вершы, што сталі песнямі), аднак у "Святле Нарачы" яна набыла больш глыбокае раскрыццё. Найперш у вершах, што ўвайшлі ў раздзел "Пад зоркай Максіма Танка". Дарэчы, Яўген Іванавіч ліставаўся з А. Нафрановічам, а ў адным са сваіх пісем зазначыў: "Сярод Вашых твораў ёсць шмат, якія заслугоўваюць на ўвагу і чытачоў, і кампазітараў".

Паэзія А. Нафрановіча пазбаўлена гучных эпітэтаў і параўнанняў, у ёй не знойдзеш арыгінальных метафар, якія адразу кідаюцца ў вочы. Але ў ёй ёсць не менш важнае, што ідзе ад класічнай паэтычнай традыцыі: узважанасць радка, напеўнасць яго, прысутнасць вобразаў зямных. І няхай радок А. Нафрановіча часам выглядае проста, але напісана гэта шчыра, ідзе з душы. Як і ў вершы "Нарач":

*Душу закалыхвае Нарач*
*Лагоднай азёрнаю мовай.*
*І лес, падступіўшы падковай,*
*Схіліўся над ёю і марыць*
*Аб радасці заўтрашняй, новай.*
*Або ў гэтым "безыменным" творы:*
*Зноў Месяц выплыў з-за аблок —*
*З Венерай стрэцца ён жадае.*
*Ды яму тая ні на крок*
*Наблізіцца не дазваляе.*
*Зіхціць-гарыць, як вугалёк,*
*Успыхвае, нібы ўздыхае.*
*Нябогу падміргне здалёк*
*І ўсё кагосьці выглядае.*

А там, дзе Нарач, там і Мядзел — невялікі гарадок, куды імкнецца паэтава сэрца: "Адбіў мне тэлеграму дзяцел, Што ў нарачанскай старане Чакаюць землякі мяне, І паспяшаўся я у Мядзел..." І прызнанне зразумелае кожнаму, хто не растраціў повязі з кутком маленства: "Жыве мой Мядзел, я жыву — І шчасця большага не трэба". А гэтыя радкі "падыходзяць" для любога кутка Бацькаўшчыны, але сумнення не застаецца — яны нарадзіліся таксама там, у нарачанскай старане. Нават калі і не напісаліся там, дык з'явіліся ў думках:

*Полымя рабін — агні на кожнай гронцы,*
*Белай аблачынкай бусел кружыць.*
*Між зубцамі бору ранішняе сонца,*
*Як бутон найчырванейшай ружы.*

І іншыя раздзелы кнігі — "Час роздуму", "Памяць сэрца", "Ідзе жанчына па зямлі" — тая ж заклапочаная і шчырая гаворка пра Беларусь і яе людзей, жаданне разабрацца ў пачуццях і ў самім сабе, імкненне прамовіць словы, якія б лішні раз пераканалі, наколькі любая сэрцу Радзіма.

Часам у вершах А. Нафрановіча адчуваецца фальклорная аснова, і гэта сведчыць аб тым, што паэт наследуе паэтычныя традыцыі, якім не адно стагоддзе. Праўда, пісаць "пад фальклор" — не значыць даваць сабе паслабленне. Падобная лёгкасць падманлівая, што і відаць пры ўважлівым чытанні верша "Каля студні, ля крыніцы". А каб упэўніцца, дастаткова прывесці дзве першыя страфы:

*У нядзельны дзень і ў будны*
*Ды вячэрняю парой*
*Сустракаюся ля студні*
*Я з жанчынай дарагой.*

*Зачарпну я ёй вадзіцы,*
*Набяру сабе вады,*
*І гамонім ля крыніцы*
*Мы, шчаслівыя тады.*

Можна нават не звярнуць увагі на такую "дробязь", як не да месца ўжытае слова "будны". Правільней, канечне, сказаць: "У нядзельны дзень і ў будзень..." Але ж яшчэ і студня нечакана ператварылася ў... крыніцу.

Але такія недагляды не могуць сапсаваць агульнага ўражання ад кнігі. Яна цікавая, вартая, каб знайсці свайго чытача. І добра, што з'явіліся людзі, якія аказалі фінансавую падтрымку выданню. А. Нафрановіч і выдавецтва "Мастацкая літаратура", як пазначана на другой старонцы зборніка "выказваюць шчырую падзяку генеральнаму дырэктару СП "Дзурупол-Суворaў" Валодзьку А. А. і старшыні калгаса "Дружба" Пастаўскага раёна Шылько Б. П."

**К. СВІДЗЕРСКІ**

ца як належнае. Такім чынам, рэвалюцыя прыдумала сваё, нейкае адмысловае каханне, новая жанчына падлягала ў новым жыцці своеасаблівай савецкай эмансіпацыі.

У рамане Кузьмы Чорнага "Трэцяе пакаленне" галавой сям'і становіцца Зося Тварыцкая, прыхільніца новага ладу. Муж, які клапоціцца ад дабрабыце сям'і, аб будучым дачкі, паказаны як адмоўны персанаж. Скарб, знойдзены ім, Зося прымушае здаць дзяржаве, не пакідаць яго на патрэбы сям'і. Адбываецца працэс пераацэнкі агульначалавечых каштоўнасцей і нацыянальных традыцый.

Вайна з гітлераўскай Германіяй 1941—1945 гг. дала глебу для стварэння новых жаночых вобразаў. Як потым сказала С. Алексіевіч: "У вайны не жаночае аблічча". І сапраўды, на кантрасце вайны і жанчыны адчуваецца ўся жахлівасць антычалавечай з'явы. На маці выпалі найбольшыя перажыванні за сына, за мужа, за бацьку. Таму гэтая тэма часта закраналася беларускімі літаратарамі. А паэма П. Броўкі "Голас сэрца", прысвечаная маці, якая загінула ў Асвенціме, стала хрэстаматыйнай. Гэта — рэквіем аўтара ўсім жанчынам, якія сталі ахвярамі вайны. Вялікая бяда народа вярнула ў літаратуру гуманістычныя прынцыпы і ідэалы.

Мірнае жыццё, далейшае будаўніцтва так званага сацыялізму азначала і вяртанне на рэйкі сацрэалізму ў літаратуры і мастацтве. Пасляваенным працягам развіцця вобразаў жанчыны-рэвалюцыянеркі стала "дзелавая жанчына", на прыкладзе якой выхоўвалася маладое пакаленне, першае месца ў яе жыцці належыць не дзецям, мужу, сямейнаму дабрабыту, а справе будаўніцтва сацыялізму і камунізму (аповесць "Антаніна" і іншыя творы Я. Радкевіча). Такі вобраз, на шчасце, не атрымаў шырокага распаўсюджвання ў беларускай літаратуры.

Элементы ідэалу новай, савецкай жанчыны прысутнічаюць у жаночых вобразах І. Мележа і І. Шамякіна, а іх творы застаюцца ў скарбонцы лепшай беларускай белетрыстыкі і сёння.

Зразумела, літаратура не магла рухацца ў заданым партыяй напрамку. Да таго ж ідэалагічны ціск пасля 1956 г. аслабеў. Літаратура пакрысе станавілася больш плюралістычнай, пачала выходзіць за рамкі сацрэалізму. Жанчыне вяртаюцца яе адвечныя функцыі: маці, жонкі, сястры.

***Наша доля — кудзеля, лён,***
***нітку віць з недапрадзенай шпулі,***
***вартаваць адвечны агонь —***
***казкі, песні забытай бабулі.***

***Дом — адвечная доля жанчын...***
***Нараджаць нам, не забіваць...***

Гэта радкі з верша Л. Геніюш, якая была ў апале пры савецкай уладзе. Як бачым, усё вяртаецца на кругі свае.

У той час з'яўляюцца такія пісьменнікі, як В. Быкаў, У. Караткевіч, А. Адамовіч, творы якіх вядомы ва ўсім свеце, і часта аб беларускай літаратуры ведаюць менавіта праз гэтыя імёны.

Сучасная літаратура пераасэнсоўвае падзеі 20—30-х гг., дае ім іншую ацэнку, часта палярную той, што існавала раней. Вобраз жанчыны, якая паставіла сваё жыццё на службу ідэалогіі (што ў той перыяд разглядалася як станоўчая з'ява), падаецца адмоўным у ракурсе агульначалавечых каштоўнасцей. Таму, зразумела, Паліна з аповесці В. Быкава "Сцюжа", якая была на паслугах у НКВД, па загадзе органаў спакушала патрэбных людзей, не можа выклікаць захапленне, а для выхавання служыць у якасці адмоўнага прыкладу.

Апошняе дзесяцігоддзе дало шмат цікавых твораў з вобразамі сапраўдных жанчын, такіх, як іх бачылі класікі беларускай літаратуры. Творы Я. Сіпакова (кніга "Жанчына сярод мужчын"), І. Шамякіна (аповесць "Палеская мадонна"), Г. Далідовіча (раман "Заходнікі") і іншыя прасякнуты любаваннем жанчынай, яе хараством. Гэта злучае разнастайнасць вобразаў пры ўсёй іх адметнасці. У кагосьці жанчына моцная, самастойная, у кагосьці — залішне даверлівая, але яны не здраджваюць свайму прызначэнню, застаюцца маці, каханымі, не імкнучыся стаць "дзелавой жанчынай" ці, што яшчэ горш, рэвалюцыянеркай або іншай праявай супярэчнасцяў жыцця. Менавіта такую жанчыну бачым мы ў творчасці сучасных паэтаў (Н. Гілевіча, Р. Барадуліна) і, што асабліва важна, паэтак (Н. Мацяш, Я. Янішчыц і іншыя). Асобна трэба адзначыць Л. Дранько-Майсюка, амаль уся творчасць якога прасякнута вялікай павагаю, каханнем да жанчыны.

Неабавязкова быць Фрэйдам, каб заўважыць, што паэзія зыходзіць менавіта ад жанчыны, як і само жыццё. Жанчына ў розных сваіх іпастасях, як і раней, застаецца адной з асноўных тэм літаратуры. Гэта — вечнае.

Развіццё вобраза жанчыны ў беларускай літаратуры сведчыць аб яго шматграннасці і супярэчлівасці ў разглядаемыя перыяды, што патрабуе ад настаўніка, выхавацеля глыбокага асэнсавання твораў, асабліва ўдумлівага выкарыстання вобразаў дзеля выхавання падрастаючага пакалення.

На дакастрычніцкім этапе роля жанчыны ў жыцці беларусаў адпавядала сталым традыцыям народа і агульначалавечым каштоўнасцям. Пасля 1917 года адбывалася ломка існаваўшага сямейнага ладу, дзяржава імкнулася кантраляваць людзей як мага больш і брала, зусім неапраўдана, на сябе функцыі, якія належалі жанчыне і, што асабліва важна, маці. Гэта вяло да дэградацыі сям'і і занядбання маральных каштоўнасцей. Роля жанчыны набывае іншую трактоўку. Яе праца на індывідуальным участку, клопат аб уласнай сям'і падаваліся адмоўна. Апошнія дзесяць гадоў паказалі, што літаратура вяртаецца да гуманістычных традыцый. Жанчына ў літаратуры зноў займае сваё належнае месца. На жаль, у жыцці грамадства значных пазітыўных зрухаў у гэтых адносінах не назіраецца. Тут патрэбен час, ды і не ад адной жа літаратуры залежыць распачынанне такога працэсу. Літаратура можа толькі акрэсліць пошукі.

**Міхась ДАБРЫНІН,**
**Анатоль ТРАФІМЧЫК**

# Смак "Чорнага хлеба"

Першая кніга вершаў Васіля Медунецкага "Посох Аввакума" выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў 1993 годзе. І вось — чарговы зборнік гэтага аўтара "Чорны хлеб", выпушчаны Літаратурна-мастацкім фондам "Нёман" дзякуючы фінансавай падтрымцы спонсара Вільгельма Пятрышчы. Як для паэзіі, зборнік даволі аб'ёмны — амаль чатыры ўлікова-выдавецкія аркушы. Ды, зразумела, не ў колькасці твораў справа. А што паэзія В. Медунецкага вартая ўвагі чытача, відаць ужо з прадмовы "За любоў на гэтым беразе...", напісанай лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Маякоўскага Віктарам Шніпом. На яго думку, "вельмі ёмка і дакладна перадаюць галоўны сэнс усёй паэзіі" В. Медунецкага наступныя радкі:

***Время! —***
***Мы летим с тобой,***
***в ответе***
***За любовь на этом берегу...***

Не будзе памылковым сказаць, што герой кнігі гэта ў нейкай ступені сам час. Час як катэгорыя гістарычная. Лірычны герой паэта, жывучы ў дні сённяшнім, задумваецца і над мінулым. Адсюль у вершах В. Медунецкага не толькі водгалас даўніх падзей, а і прысутнасць канкрэтных гістарычных асоб. У прыватнасці, славутай Еўфрасінні Полацкай. Але час у кнізе "Черный хлеб" — гэта і катэгорыя маральная. Менавіта ён, а не хто іншы, мае права на ацэнку таго, што было, што ёсць і што, як вынік, будзе заўтра:

***Летят года, —***
***Звенит златое стремя.***
***И дни —***
***Как угорелые бегут.***
***И мне порою кажется.***
***Что ВРЕМЯ***
***Давно вершит над нами***
***Страшный Суд...***

А там, дзе паўстае выява Страшнага Суда, не можа не прысутнічаць і матыў пакаяння. Але перш чым адбудзецца пакаянне, неабходна ачысціцца душой. Ад усведамлення гэтага лірычны герой В. Медунецкага робіць крок туды, куды рана ці позна, бадай, прыходзіць ці не кожны чалавек. Пачынаецца дарога да Храма — як духоўнага і маральнага чысцілішча.

Падобны матыў сёння сустрэнеш, бадай, у кожнага паэта. Не кажучы аб прысутнасці падобных твораў у паэтычных зборніках. Але адна справа, калі гэта пішацца як даніна літаратурнай модзе, і іншая, калі ўсё, перш чым выліцца ў радкі, узважана, выпакутавана і асэнсавана. У В. Медунецкага назіраецца апошняе. І найлепш у гэтым пераконвае верш "Заброшенный храм":

***Сердце вымершей боль-деревушки —***
***колокольня и маковка храма.***
***Между прошлым и будущим рана***
***у звенящей ключами речушки.***

***Заросла чернобылом дорожка.***
***В клюве ворона лопнувший хохот.***
***Сквозняков несмолкаемый шепот***
***над слезами застывшего воска.***

Дарога да храма — няпростая. І нялёгкая. Ды і сам храм людзьмі забыты. А за такое бяспамяцтва таксама трэба плаціць. І па самым высокім рахунку.

Як і кожны паэт, В. Медунецкі закранае розныя тэмы. Ёсць у яго і вершы пра каханне, знайшлося месца радкам, у якіх паўстае хараство прыроды. І, як кожнаму паэту, яму, безумоўна, не ўсё ўдаецца аднолькава. Што ж — звычайны творчы працэс. Ды кожнаму самому меркаваць, што яму ўдалося лепш, а што горш. У адным нельга сумнявацца: кніга "Черный хлеб" свайго чытача знойдзе.

**Васіль РУНЕВІЧ**

УРАЖАННЕ

# Голас уначы

Рэдка сустракаюцца пісьменнікі настолькі пазбаўленыя снабізму, як Леанід Галубовіч, рэдка хто так разняволена распавядае пра сябе: здольнасці, заганы, звычкі, заняткі, як ён. Хіба што на Захадзе ды за акіянам, дзе каштоўнасць чалавека, які здолеў падняцца ад цяжкай фізічнай працы да поспеху, толькі ўзрастае.

Але чытайма:

*"Блукаючы па ваколіцы, неўпрыкмет зайшоў на свінаферму, дзе калісьці доўгі час працаваў электрыкам. Многае адразу ж прыпомнілася — і добрае і не вельмі... І чаго тут толькі не здаралася?!*

*...свінча нагу ў механічны транспарцёр усуне — выкруціць, тут яму і шыла ў бок... Ураз асвяжуем — ды ў хвойнічак, што побач... Павяндлічка, пячоначка, трохлітровік...*

*Кампанія была ганаровая. Далёка вядомая. Квартэт — віртуозы Вароніна...*

*Цяпер тут ціха. Даўно ўжо... Адзін на вяроўчыне з-за жонкі ачапіўся (яна яго і мезенца не каштавала), другі пад хмелем на матацыкле разбіўся (прычым упершыню едучы не за рулём, а ззаду), трэці, халасцяк — аднагодак мой, адсвяткаваў жаночае свята 8 сакавіка і на раніцу ўжо не прачнуўся... Я вось у пісарчыкі (як яны шуткавалі) падаўся...*

*Няма тут цяпер каму жаль жыцця любіць, рэдкую радасць па чарках разліваць, песняй лёсу навакольны лес агалошваць...*

*Адтуль — непадалёку — на могілкі пацягнула: спярша — бацьку, а пасля ім тром — Антону, Івану ды Пецю пакланіўся...*

*Сеў на пагорку, запаліў... Ні слязы, ні жалю, ні камяка ў горле...*

*...адна светлая памяць..."*

Некалькі сотняў падобных на вышэйпрацытаваную і самых розных па змесце "думкаформаў", сабраных разам, міжволі прымушаюць у сваю чаргу задумацца. Увогуле што гэта? Дзённікавыя запісы, так званая "Раптоўная проза", філасофскія разважанні, мініяцюры лірычнага кшталту, вершаваная проза? Ці, як сказана недзе ў Рыльке, нешта "без сэнсу: мары, сны, трывогі"? Ва ўсякім разе, упэўніваешся, што гэта ўсё на ўзроўні не натоўпу, а істэблішмэнту.

Так, мусіць, па наіўнасці, я гады паўтары час ад часу напаўжартам спакушаў Леаніда напісаць зацемку пра маю котку Цын, дачку чэмпіёна свету, калісьці знакамітага ў Мінску ката Елісея Галсана (ужо нябожчыка), але — дарэмна, пакуль зразумеў, што ласкутовая мазаічнасць зацемак успрымаецца і выпісваецца аўтарам па адной аднаму яму вядомай сістэме і, як музычны твор, пэўна мае свой унутраны рытм і не церпіць уварвання іншародных фрагментаў.

На гэтай рознакаляровай коўдры самымі цікавымі, на мой погляд, пасля "вясковых", з'яўляюцца назіранні з жыцця мінскай літаратурнай багемы, дзе ўжо аўтар, па завядзёнцы, з максімальнай шчырасцю і трапнай назіральнасцю выпісвае сітуацыі, характары, звычкі, каштоўнасці. І што заўважаеш — смела выпісвае.

Танальнасць зацемак — пах тугі. Часта агіда да нашай рэчаіснасці: размова з цемры і ў цемру. "Ноччу мне жыць ясней", — прызнаецца аўтар гэтай дзіўнай і рознакаляровай спавядальні.

*"Ноч... Сяджу бяздумны і адзінокі, забыўшыся на свет, і светам забыты. Нічога і нікога няма вакол мяне, апроч цемры. Ды і мяне па сутнасці ўжо няма — адна душа толькі... Але і яна — ноч..."*

Падумалася неяк: ну а што, калі б у той час, як аўтар працаваў электрыкам, раптам прыйшлі б мы да камунізму, і пра што было б афіцыйна надрукавана (друкаваліся ж Праграмы і нават прыблізная дата была ўжо аб'яўлена на самым высокім узроўні)? Дык, пэўна, не існавала б цяпер ні культуры, ні пісьменніцтва, ні мастацтва, ані нічога. Было б царства пустаты і графаманіі, пра якую трапна разважаў той жа Леанід Галубовіч у нядаўнім сваім лімаўскім артыкуле. Ну, пісалі б нешта, кшталтам "Ивушек неплакучих", "Кавалеров золотых звезд", пра розных Епіфаніяў і Маняняў, пра што пра ўсё які-небудзь крытык А. Бельскі заліваўся б салаўём, друкуючы свае радасныя водзывы.

Была б агульная свінаферма. Магчыма, па Оруэлу, а хутчэй са сваімі, мясцовымі, адхіленнямі. І на ферме той наўрад ці знайшлося б месца паэту Галубовічу. Пенкі здымалі б апантаныя дзікай энергіяй і насякомай усюдыіснасцю ўсё тыя ж графаманы. Сапраўды хвароба. Дай некаторым з іх волю — закідалі б сваімі "творамі" крамы і кіёскі, падземныя і наземныя пераходы, краіну, потым замежка і Зямлю і ўсе планеты Сонечнай сістэмы.

Успамінаю з гэтай нагоды барысаўскага адстаўнога падпалкоўніка В. Белтава, які, святкуючы (як паэт!) сваё 70-годдзе чамусьці ў гарадскім Доме культуры (!), чытаў сваю паэму "Воробей". І сядзелі там з гаркама і пляскалі ў далоні. Паэму сваю той падпалкоўнік у адстаўцы і ў Маскву пасылаў. Прайшло з той пары больш дзесятка гадоў, а змянілася не шмат. Ну, хіба што няма камунізму. У мясцовай газеце чытаю: "..в 18.00 в ГДК Беллитсоюз "Полоцкая ветвь" и литературно-музыкальный клуб "Ковчег" проводит вечер "Прощание нежностью" (?!) В программе: презентация сборника стихотворений А. Левши "Струна в тумане"".

І сапраўды — усе кіёскі завалены тым зборнікам. І падумалася — зноў усё пра высокія матэрыі, ну, не свінаферму ж ім урэшце апісваць...

Ёсць такі выраз: ісці пад несапраўдным сцягам. У літаратуры некаторыя гэта практыкуюць — свядома ці несвядома. Таму адразу адчуваеш, як адрозніваюцца ад псеўдапісьменства Галубовічавы кавалкі літпраўды: як аўтар ставіць на вёсцы плот, пілуе і сячэ дровы, фарбуе акно. Мастацтва прыхавана тут на глыбіню. Шчырасць толькі часам бязмерная: нават псіхааналітык развёў бы рукамі: ну што тут скажаш? Як калісьці нябожчык Мікола Лупсякоў, Леанід Галубовіч занатоўвае свае "думкаформы" большасцю не за пісьмовым сталом, а ў вёсцы на пнях ды ў тралейбусе, у дарозе, вяртаючыся з работы ў свой мікрараён. Жыццё, што адразу адчуваецца, ведае не з стала, кніг ці тэлевізара, а з уласнага вопыту. Ну хто з нас, скажыце, можа казырнуць тым, што працаваў на той жа свінаферме — пэўна, нямнога знойдзецца. Ці пабываў, напрыклад, у вар'ятні?

*"Я ніколі не змагу напісаць аб'ёмную рэч — аповесць ці, крый Божа, раман.*

*Я — чалавек самотны і гультаяваты, а проза патрабуе здароўя і працаздольнасці...*

*Я люблю дэталь, метафару і — сябе..."*

"Бледным ценем Брыля" сціпла назваў сябе аўтар "Зацемак" у радыёінтэрв'ю з нагоды выхаду сваёй кнігі ў незалежным мінскім выдавецтве "Фрагменты".

Тым не менш, пра факт выхаду яе ў свет варта напомніць, бо калі ўрэшце кніга мае літаратурны сэнс, то павінна выдавацца. І не ў прыватных выдавецтвах. Бо сам аўтар, вядома, не збярэ народ не тое што ў "ДК", а і ў больш зацішным месцы, каб цвэнькаць вершы і слухаць у свой адрас хвалебную "хруканіну".

Не той чалавек.

На гэта таксама з "зацемак":

*"Не магу трываць пустой дзяжурнай кампліментаршчыны. Асабліва, калі нутром адчуваеш, што пахвальба ў твой адрас зроблена з "прыцэлам у адказ"...*

*...Таму не кажэце мне пустаслоўных кампліментаў. Усё адно будучыя кантралёры ў архіўнай бухгалтэрыі часу дакладна вылічаць, колькі я каштаваў і каштую насамрэч..."*

Дадам, што ў Кнігарні пісьменніка ў Мінску, куды завезлі частку невялікага тыражу кнігі, купіць яе пакуль што можна.

**Юры СТАНКЕВІЧ**

*Леанід Галубовіч, "Зацемкі з левай кішэні", "Эўрафорум", 1998 г.*

# "Беларускі гістарычны часопіс", N 4

У апошнім за сёлетні год нумары штоквартальнік "БГЧ" анансуе асноўныя матэрыялы, якія будуць апублікаваны ў годзе наступным. Пра гэта можна даведацца з слова галоўнага рэдактара В. Кушнера "З Новым Годам!". Змешчаны артыкулы П. Петракова "Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — 70 гадоў", В. Шалькевіча "Палітычныя погляды Міколы Гусоўскага", У. Ладысева "Выпрабаванні часам і жыццём. Да 75-годдзя ўтварэння і дзейнасці Кампартыі Заходняй Беларусі", А. Лукашэвіча "Ваенная школа Расійскай імперыі. XVIII— першая палова XIX ст.", В. Чаропкі "Усталяванне хрысціянства і падзенне крэваў", С. Жарко "Хроніка спіліцкага архідыякана Фамы пра Русь і манголаў XIII ст.", Л. Ціханава "Вышэйшая школа на мяжы XXI ст.: рэгіянальны аспект", а таксама іншых аўтараў.Зацікавіць чытача "Вечны каляндар", складзены В. Маладцовым. Ёсць "Каляндар юбілейных і памятных дат на 1999 год".

ЧАСАПІС

## За заслугі перад Латвіяй

Прэзідэнт Латвійскай Рэспублікі Гунтыс Ульманыс 29 кастрычніка 1998 г. падпісаў пастанову рады ордэна Трох Зорак аб узнагароджанні высокай дзяржаўнай адзнакай латвійскіх і замежных грамадзян. У спісе, надрукаваным у інфармацыйным выданні "Латвіяс Вэстнэсыс", паведамляецца, што вышэйшай дзяржаўнай адзнакі ўдастоены беларусы — Сяргей Панізнік і Васіль Сёмуха.

9 снежня ў Заталой зале Рыжскага Латышскага таварыства дзяржаўны сакратар Міністэрства культуры Латвійскай дзяржавы Айварс Гайлытыс дыплом і ордэн Трох Зорак уручыў літаратару Сяргею Панізніку. Ад імя Саюза пісьменнікаў Латвіі павіншавалі калегу старшыня творчага саюза Валдыс Румніекс і галоўны рэдактар часопіса "Карогс" Мара Залытэ. Урачыстая падзея супала з развітальнай вячэрай удзельнікаў 5-га Міжнароднага семінара перакладчыкаў і выдаўцоў, на які ад Беларусі былі запрошаны, акрамя згаданага С. Панізніка, перакладчыкі Андрэй Гуцаў і Валерый Буйвал.

## Паэтычныя агледзіны

здабыткаў сучаснай беларускай літаратуры адбыліся днямі ў "Беларускай хатцы". Імпрэза была задумана, як міні-прэзентацыя анталогіі аднаго верша "Агледзіны". Кніга гэтая з'явілася на свет дзякуючы намаганням маладога паэта з Баранавіч — Алеся Бакача. Які руплівай рукой у своеасаблівы паэтычны габелен уплёў вершы каля 180 аўтараў. І хай сабе нехта ўпікае А. Бакача за нібыта недастатковую паэтычную размаітасць зборніка. Некаму не падабаецца адабраная ўкладальнікам-ткачом вершаваная нітка... Нельга не канстатаваць, што кніга адбылася і стала

фактам нашага літаратурнага жыцця.

Удзел у вечарыне бралі аўтары згаданага выдання: Алесь Гібкоўскі, Людка Сільнова, Зміцер Цехановіч, Людміла Багданкевіч, Эдуард Акулін. Песеннае агучанне такіх аўтараў "Агледзінаў", як Уладзімір Караткевіч, Ларыса Геніюш, Рыгор Барадулін, ажыццявіў вядомы беларускі бард Алесь Камоцкі.

Госці вечарыны выказалі жаданне зрабіць падобныя паэтычныя агледзіны ў сценах "Беларускай хаткі" традыцыйнымі. І сапраўды, у нас ёсць цудоўная магчымасць агледзецца вакол сябе і заўважыць дзесяткі новых паэтычных імёнаў, якія заслугоўваюць самай пільнай чытацкай увагі.

Н. К.

*На здымку: удзельнікі вечарыны.*

*Фота С. ЛОЙКІ*

## На "Беларускім шляху"

Канцэрты барда Андрэя Мельнікава ў рамках праекта "Беларускі шлях" адбыліся ў Светлагорску. Першы прайшоў у вялікай зале гарадскога цэнтра культуры, другі — у індустрыяльным тэхнікуме.

Ф. КМІТА

ПАЭЗІЯ

Ігар ПРАКАПОВІЧ

## Формаю шчасця — падкова

●

*Жыхары цудоўнае планеты*
*П'юць гарэлку, лаюцца бязбожна,*
*Для каго тут можна быць паэтам?*
*Для сябе паэтам быць тут можна...*
*Для сябе і вунь для той ялінкі,*
*Што так шчыра цягнецца ў нябёсы,*
*І для той малюсенькай сняжынкі,*
*Што ялінцы падае на косы.*
*І для хмаркі, што сняжынкі сее,*
*Можна быць паэтам адмысловым,*
*Бо яна дакладна разумее*
*Ўсе мае пачуцці, гукі, словы.*
*Толькі жаль, што хмарка хутка знікне*
*І сінечай вальецца ў нябёсы,*
*Што сняжынка ціхая панікне*
*І на дол пальюцца яе слёзы.*
*А ялінка проста стане ёлкай*
*У чыёйсьці хаце навагодняй.*
*Там з яе абсыпяцца іголкі*
*І згарыць гірлянда як паходня.*
*...На абшарах файнае планеты*
*З жыхарамі, сумнымі ад прозы,*
*Я пабуду, можа быць, паэтам,*
*Пакуль ёсць ялінка, хмарка, слёзы...*

●

Памяці Міколы СЕЛЕШЧУКА

*Птушка з агністым*
*хвастом веснавым*
*Сонца шукала,*
*да неба ляцела,*
*Снег сакавіцкі*
*крылом разбівала,*
*Свет прыгажосці*
*ўбачыць хацела.*

*Але ж паўсюль —*
*паляўнічыя ловы,*
*Стрэлы ды слёзы,*
*што поўняць азёры.*
*Што з табой сталася,*
*шчырая птушка?*

*...Снег засыпае*
*агністыя пёры...*

●

*У космасе бяздонным*
*існавання*
*фізічнай абалонкі*
*ёсць імгненне,*
*якое пакідае*
*ці каханне,*
*ці радасць,*
*ці трывогу,*
*ці здзіўленне...*

*У шчыльнасці касмічнай*
*нашы думкі*
*жывуць, як пчолы*
*ў сотах на вашчыне,*
*і час, што мае*
*ўласцівасць гумкі,*
*іх вобраз лепіць*
*на планетнай гліне.*

*І кожнаму сваё*
*у гэтым свеце*
*пчаляр узважыць*
*цёплаю рукою.*
*І стане гліна —*
*толькі зорным смеццем.*
*І стане думка —*
*новаю зямлёю.*

●

*Жоўтая пасма на цёмным акне —*
*гэта месяца след.*

*Калі шыпшына стаіць у віне,*
*значыць, кахае паэт.*

*Значыць, нічога няма наўкол.*
*І раскрышыўся свет.*

*Толькі шыпшына, віно і стол,*
*і толькі месяца след...*

●

*Ноч.*
*Поўня, як жоўтая птушка.*
*Профіль анёла.*
*Трывожныя гукі трубы.*
*Ноч.*
*Космасу поўная кружка.*
*Неразгаданае слова.*
*Голай жанчыны клубы.*
*Ноч.*
*Бела-чырвоная стужка.*
*Формаю шчасця — падкова.*
*І маналітам — дубы.*
*Ноч.*

●

*Ноччу палюе сава.*
*Зручна ёй ноччу,*
*бо сведкі*
*спяць. І не чуе трава,*
*і не чуюць*
*ні дрэвы,*

*Дн[illegible]упле*
*трызн[illegible] ночныя балі:*
*хочацца ёй, [illegible]лб усе*
*ночы бясконцымі сталі.*

*Вось бы тады пажыла,*
*пабалявала раскошна,*
*ды каб яшчэ і зіма*
*вечнай была і парошнай.*

*Спіць сабе днямі сава.*
*Ноччу палюе,*
*бо сведкі*
*спяць. І не чуе трава.*
*І не чуюць*
*ні дрэвы,*
*ні кветкі.*

## Апошняя вея

*За вокнамі вея гуляе,*
*нібыта мясцовая шляхта,*
*што весела балі спраўляе,*
*ваярскую кінуўшы вахту.*

*Ліецца віно беласнежна,*
*з падвывамі чуюцца песні.*
*І горка як быццам і смешна*
*так дзіўна гуляць напрадвесні.*

*Ды, пэўна ж, усе разумеюць,*
*што скончацца зімнія балі,*
*завеі ўсе адшалеюць,*
*лядовыя знікнуць каралі.*

*Але, каб забыць непазбежнасць,*
*ліецца ў келіхі зелле.*
*І рвецца адчайна ў бязмежжа*
*мясцовае шляхты пахмелле.*

●

"Ноч выцякае з цябе..."
Міра ЛУКША

*Ноч выцякае з цябе*
*кропляй вячэрніх жаданняў*
*марай высокіх каханняў*
*ноч выцякае з цябе*

*днём напаўняешся ты*
*гукамі мовы трывожнай*
*крокам нагі асцярожнай*
*днём напаўняешся ты*

*вечнасць прыходзіць твая*
*з кожнай адкрытай планетай*
*са зразумелай прыкметай*
*вечнасць прыходзіць твая*

*але...*

*ноч выцякае з цябе*
*вечнасць і дзень... яшчэ рана*
*час называецца ранак*
*ноч выцякае з цябе*

Алена ЯСКЕВІЧ

## Кляновы крохкі ліст чакае Ражаства

*Пакаюся. Сплывае верасень,*
*Як вораг нечаканы...*
*Пакаюся.*
*Кляновы крохкі ліст*
*Чакае Ражаства...*
*Не адступаюць*
*Горкія сумненні,*
*І дасылае жарсцей дзіды*
*Час.*
*— Чаго сумненні мучаць*
*Нас?!.*
*Кляновы крохкі ліст*
*Зімовым днём прыкуты.*
*Пакаюся пакутна.*
*На сэрцах лёд...*
*Тужліваю зацятасцю*
*Укрыжаваны вуснаў лёт.*
*— За што караюць вочы*
*Усмешкай нас?!.*
*А Радасць просіцца*
*праз недавер Душы сцюдзёны*
*У светлы Рай!..*
*Кляновы крохкі ліст*
*чакае Ражаства...*

●

*Шчымлівым словам,*
*бы Пятра ключамі,*
*Ты адамкнуў мне Рай.*
*Лагодна*
*музыка гучала,*
*І душы*
*воедна злучала...*
*— Не дакарай.*
*Шчымлівым словам,*
*бы псальмы Давіда,*
*Гадоў хада.*
*І промень Сонца —*
*Вострай дзідай*
*(Нібы зацятасці карыда)*
*Праз стоўп ільда.*

●

*І слодыч ростані адчую.*
*І — горыч страт.*
*Адчую подых вандраванняў,*
*Хоць і вяртаюся назад.*
*Гляджу:*
*каштанамі,*
*што ўнізе,*
*Убраўся*
*Май.*
*Храм на Андрыеўскім узвізе[1] —*
*Як уваход у Рай.*
*Сафія — Горнім Віфлеемам.*
*Малітвы ўздых...*
*І шэпчуць вусны патаемна:*
*— Ляцім туды.*

●

*Пастукала сінічка мне ў акно.*
*Ты ля мяне — я гэта адчуваю.*
*І, зварухнуцца баючыся,*
*ўспамінаю —*
*Не спала ноч, бо снілася Табе.*
*Яднанне дум,*
*яднанне рук.*
*Маўчанне.*
*Атуліць Амафорам росным ноч.*
*І голкі ранак*
*горасна страчае*
*Пакору ціхую*
*Тваіх тужлівых воч.*
*З нябёсаў знічка,*
*як сляза сарвецца,*
*А мне ў спагадзе*
*Сонейка ўсміхнецца.*

[1]Узвіз (з укр.) — пад'ём.

ПРОЗА

# ВОСЕНЬ У ЦЭЛАФАНЕ

Анатоль КІРВЕЛЬ

АПАВЯДАННЕ

ВЫЖЫЦЬ у вялікім горадзе — умець бараніцца.

Выжыць сярод падобных на цябе — ненавідзець іх болей, чым ненавідзіш сябе.

Умець выжыць — схаваць нянавісць.

Схаваць нянавісць — зрабіць выгляд, што ты добранькі, даруеш усім тое, чаго не даруеш сабе — подласці, добра ведаючы, дзе і як яна нараджаецца.

Подласць — кветка агідная, вабная, непаўторная. Ад яе немагчыма адрачыся — сокі ейныя жывяць цябе, даючы моц і сілу — каб ненавідзець ды выжываць.

Найбольш адпаведнае месца для гэтых кветак — душа. Бо ніхто не ведае, што ў ёй схавана. А ў ёй — на самым дне — якраз тое, што мы не любім паказваць іншым. Якраз там, на дне душы, і месціцца наша прытворства, падман, подласць і ўсё астатняе, што мы хаваем як найглыбей. Вопратка, якую мы носім, павінна адпавядаць мэце, пра якую не сорамна сказаць усім. А тыя мэты, пра якія ніхто не ведае, — для іх вопраткі не трэба, дастаткова лахманоў. Або й зусім нічога. Бо там, дзе яны нараджаюцца і паміраюць, — цемень, а ў цемені — не да сораму.

Што ж у той цемені?

Ды ці мала што?!

Там, напрыклад, вядомая кожнаму дурню славутая агароджа Летняга саду і шырокія гранітныя пліты ўздоўж яе — даўней не ведалі асфальту і рабілі ўсё трывала на вякі! — ды дзябёлая кабеціна з дворніцкай мятлою. Кабеціна цяперашняя, сапраўдная. Скокні раніцай на Гарбаты масток праз Фантанку — не памылішся, пазнаеш яе па жаўтлява-аранжавым дворніцкім "віцмундзіры" і даўжэзнай мятле! Дурняў хапае ўсюды, нават у Піцеры, трэба ж камусь падмятаць за імі недакуркі ды скамечаныя паперкі ад марожанага. Альбо — мокры зляжалы снег ці жоўты восеньскі ліст.

Вечнасць — галоўнае, што трымае нас у жыцці. Вечны Летні сад, вечная ягоная агароджа. Ды й кабеціна амаль што вечная. Бо як толькі зоймецца ранак — яна ўжо там, на сваім рабочым месцы. Жывы помнік жывога вечнага часу.

Добра запомнілася, як сустрэў яе першы раз: высокая і дужая, яна адразу кінулася ў вочы — сваім ростам і паставаю, ды надта ж нязвыклым адчуваннем таго, што яна тут — якраз на месцы, на сваім месцы, іншага ёй і шукаць не трэба, бо яна ўмее гэта рабіць — наводзіць чысціню і парадак...

Кожны — хоць раз, хоць у нейкі момант, — ды саромеўся сваёй працы: калі адчуваў неадпаведнасць таго, чым ён займаецца, і таго, што ён пра сябе думае. А кабета? Пабойцеся Бога! Вы зірніце толькі: хіба яна паперкі падбірае?! Не-е! Гэта нехта каралі пагубляў — каралі самоты ці безнадзейнасці, каралі неахайнасці ці ляноты. Хіба пакінеш іх валяцца проста так, на снезе ці на тых плітах без нагляду? Стопчуць ды раструшчаць. Лепей сабраць ды ў мех! — празрысты цэлафанавы куфар Пандоры... Камусьці свярбіць найхутчэй адчыніць ды выпусціць з яго ўсё, што там ёсць, а камусьці наадварот — запхнуць назад — тое, што іншыя навыпускалі...

Ой, цётка, цётка, што ты сабе прыдумляеш? Мяркуеш, што ты адна гэткая разумная, гэткая чысцюля? І гэткая чысценькая?

Ды нешта не так у цябе з гэтай самай чысцінёю. Штось не ладзіцца трохі. Са смеццем, што на вуліцы, ты дока, майстар, адным словам...

Ды чалавек — істота няўдзячлівая, ажно хварэць пачынае, калі няма супадзення-адпаведнасці таго, што ён робіць, з тым, што ён хоча зрабіць. Ты ж не дурная, цётка: не будзеш упарціцца даводзіць мне, што нічога, апроч парадку, не жадаеш.

Чаму ж тады спыняешся раптам, забыўшыся на мятлу, ды пазіраеш на нас гэтак пільна і дапытліва, — нібы не разумееш чагосьці, ці ратунку ў нашых вачах шукаеш, памагчы просіш...

Чаму душа твая спакою не знаходзіць? Ты ж не з тых, хто няпэўнасцю ці вэрхалам несусветным задаволены. Я разумею: адзін у полі — сам сабе не дарадца, але ці ў кожнага тое поле ёсць, на якое выйсці можна і сам-насам з сабою параіцца?

У цябе быццам бы і ёсць — дзялка твая дворніцкая перад Летнім садам, ды карысці з яе, пэўна, малавата, бо як убачыш каго — як той раз мяне, дык табе й мятла да лямпачкі, усё кідаеш, і адзіны клопат у цябе — найхутчэй у душу нам зазірнуць. Пакуль мы не апамяталіся, ты — хуценька туды, дзе, як на далоні, адказ ляжыць. Мо ён і не табе, а не каму іншаму прызначаны, — ты гэта потым зразумееш... Галоўнае — не спазніцца, скарыстаць момант, калі мы безабаронныя — бо ў цябе такі чысты і прыветлівы твар, такія чыстыя блакітныя вочы, без кропелькі чагосьці благога, брыдкага ці небяспечнага для нас?..

Вось ты і мяне паймала на гэты самы кручок — на спагадлівасць ды штосьці іншае, што ўся істота твая выпраменьвала, і я, не адчуваючы непрыязнасці або пагрозы, у вочы твае зазірнуў... І ў той самы момант пашкадаваў, што дурнем гэткім аказаўся: дазволіў табе зазірнуць туды, куды пускаюць толькі вельмі блізкіх, або й зусім не пускаюць. Не ўсім трэба ведаць, чым ты жывеш. Праўда не заўсёды лечыць праўда, бывае, забівае — таго, хто слабей праўды...

Цётачка, мілая! Хто цябе туды клікаў? Што там табе трэба? Паглядзець на звярка — маленькага, пудлівага, што ў грудзях жыве? Хіба душа — не звярок? Гойсае ў цёмнай клетцы з жывога цёплага рэчыва і вольная там ёй воля, ніхто не палохае, ніхто не гразіцца ды не папікае — што вытвараеш, ніякіх там ёй абмежаванняў ці загародак з калючага дроту... Дык яна, свету людскога не бачачы, ганарыцца, дурненькая... А ты, гаспадар ейны, шчэ й падтакваеш: малайчына, гэтак і трэба! Што ж табе, разумніку, застаецца, калі ты сам яе ў тую клетку загнаў, каб ніхто не бачыў і не ведаў, якая яна... І раптам тую клетку — насцеж! А душа-прыгажуня — у лахманах ды рыззі! І яе, няўклюду, на свет Боскі? Божа, як Ты дазволіў? Мо не ўгледзеў праз Сваю велькую занятасць ды заўсёдны клопат пра нешта большае? А большае — дзе яно?

А ты, цётачака, што, учора нарадзілася? Не ведаеш, што ў кожнага дурня — свая дурніца, прыгажэй якой яму нідзе не знайсці? І лахманы ў кожнага свае, нікому іншаму не падыдуць.

Не пярэч! Ведаю — усе бабы цікаўныя! А душа хоць і не баба, ды жаночага роду-племені, не адвыкнуць ёй ад бабскай звычкі...

Памагай табе Бог, цётачка, але не чапай іншых: выжыць у вялікім горадзе — умець бараніцца!

І ты, цётачка, баронішся? Ад глупства, ад нячуласці? Дык што абавязкова вось гэтак — у чужую душу, іншага шляху не ведаеш? Я цябе разумею: хочацца табе да ўсяго сваім розумам дайсці, на твары напісана... А — нашто табе гэта? Праўд на свеце многа, а ісціна ўсяго адна і яе на ўсіх не хопіць. Аднаму — трохі болей, другому — трохі меней, няроўна Бог дзеліць... Ды мо так і трэба. Ты з дабратой сваёй ды спагадаю ў маю душу палезла, — а хто туды цябе клікаў? Як забаліць і не сцярпець — сам гукну, а датуль — прабач!

Канешне, сумна табе: кожны дзень адно і тое — смецце ды бруд! І дужаму не стрываць. Але ж ты ведаеш: умець выжыць — не даваць сабе волі, каб раззлавацца па-сапраўднаму, каб сказаць урэшце тое, што даўно трымаеш у галаве. Забудзься на гэта, цётачка, не да раскошы цяпер! Сціснi зубы і маўчы! Ці ўсміхайся — шчыра і спагадліва. Бо што іншае табе застаецца? Не дарасла ты яшчэ да злосці ды нянавісці. І не дарасцеш, пэўна: не даў табе Бог гэткага шчасця — ненавідзець сябе больш, чым каго іншага. І, ненавідзячы, любіць да смерці сябе, і таксама больш, чым каго...

І ты — таксама туды? У гэта балота? Адумайся! Хіба табе мала, што мы кожны дзень бачым, як ты ўвіхаешся, сіл не шкадуючы, сумленна, без падману, і што мы рады бачыць гэта, бо самі так ужо не ўмеем, адвыклі, і ты для нас — як збавенне... Нашто ж ты жадаеш для сябе горшай долі — моўчкі распытваеш нас, хто мы такія, куды ідзём, што робім?..

Ісціна адна: усе прагнуць узнагароды — за сваё цярпенне, за боль, за пакуты, за спагаду, нават за нянавісць ці за любоў... А ўзнагарода між тым адна: ці мала цярпеў, ці высільваўся — усё адно дулю з макам! Ці так, цётачка, ці гэтак, а не будзе табе радасці велькай ад твайго чакання: узнагарода прыходзіць толькі тады, калі яна ўжо нікому непатрэбная — бо толькі ў такім выпадку яна нікога не разбэшчвае...

Мяркую, не пра тое галава твая балела — не ўзнагароды ты чакала, а проста мне памагчы хацела, каб я хутчэй кветкі той агіднай пазбавіўся. Прачытала ты па маіх вачах, як мне пакутліва з ёю, нежаданай госцейкай, што зрабілася гаспадыняй душы. У адзін момант спасцігла ты гэта сваім чыстым праніклівым позіркам. Ды паварушы мазгамі, цётачка: ці пушчу я цябе яшчэ глыбей, дзе толькі я гаспадар?

Ведаю, што не наіўная ты. І ўзнагарода табе — што мыльны пухір. А вось у іншым ты пралічылася, цётачка: спадзявалася, што калі сама такая — без маны ды хітрунства, — дык і ўсе іншыя на цябе падобныя... Ды не пушчу я цябе нікуды! Здаволься тым, што ты ўжо ведаеш — пра тое, які я. А вось чаму гэткі — не твой гэта клопат, цётачка, а мой. І дзе я тое злое насенне прыдбаў, каб кветку гідкую ўзрасціць ды штодзень песціць, — таксама не табе, а мне адказваць. Сам узрасціў — сам і пільнуй, каб насенне дурное не разляцелася па свеце ды не нарабіла бяды. Пакуль той раслінай кіраваць навучышся — і жыць ужо няма калі! Хіба гэткай долі сабе жадаеш?

Ну, хацелася і табе паняю трохі пабыць, пагуляць у дабрыню ды спагадлівасць, чалавекам сябе адчуць. І праз тое рупіла табе ну хоць з кім-небудзь пагаварыць. А тут мы з дачушкай табе на вочы трапіліся — дзіцячы садок ішлі якраз паўз твой Летні сад.

Тупалі мы з дачушкай, а ты нас убачыла і нават мятлой шоркаць перастала. Цікаўна гэтак зірнула — спачатку на дачушку, а потым на мяне, і ўсміхнулася — як чалавек, які таямніцу нейкую ведае. Аднак і я яе ведаў, хаця табе і не казаў. Спадзявалася ты, што недарэмна той раз на мяне так праніклива зірнула. А цяпер вось падумала, што я твой нямы папрок не адпіхнуў і хуценька адрокся ад сваёй кветкі... ды як жа ад яе адрачыся, даражэнькая, калі яна карэннямі сваімі так у душу ўрасла, што пацягні за які атожылак — не'яе, а душу вырвеш разам з тымі каранямі. А як жа тады — без душы?

Так то яно так, цётачка, але добры садоўнік і з дзічкі салодкія яблыкі мае. Не час хваліцца, ды прызнаюся: прышчапіў і я да дзічкі тое, без чаго немагчыма чалавеку — без дзетак. Вырасла ў мяне дачушка, сонейка маё яснае.

Каб хто біцца лез, што бывае гэтак, і то не паверыў бы. Хіба нараджаюцца з нелюбові дзеці, у якіх усё тваё — не толькі твар, а й спадзяванні, мары, душа? Не-е, не гэткая, як у цябе самога — не цёмная ды змрочная, а светлая і чыстая, бо карэньчыкі тыя гідкія туды яшчэ не забраліся... Скажы: за што мне такое шчасце? Хіба я варты яго? Мо тое, лепшае, што не памерла ў душы, — мо яно й вартае, але ж... Што мне рабіць з тым, што на дне — у самых цёмных кутках? Яно таксама не памерла: я проста прымусіў яго схавацца, не вылазіць на белы свет, каб было чым свяціць дачушцы і каб было чым дыхаць самому. Спадзяваўся, дзівак, што ніхто таго брыдкага не заўважыць. А ты, цётачка, з аднаго разу ўгледзела. Мусіць, дрэнна хаваў. Ды, пэўна, і не схаваеш гэткае, калі яно ёсць.

Адно здзівіла мяне, што ты адразу паверыла, быццам адолеў я тую кветку. Адолеў, ды не зусім, і не гэтак... Не гэтак, як ты меркавала. А ў той момант — верыш? — і мне здалося, што адолеў. І не толькі таму, што ты гэтак падумала, а таму, што дачушка была побач — як з ёю не перамагчы!

І ты ўсміхнулася, цётачка, — вось зараз спраўдзіцца тваё жаданне: мы з дачушкай абавязкова спынімся і пагаворым з табою. Пра што? Ды ці не ўсё роўна, пра што. Але табе стане весялей на душы, бо пытанні, якія ты моўчкі ўсім задавала — хто ж мы такія? — адпадуць самі сабой, бо табе хопіць і аднаго нашага, адказу.

Ды не атрымалася так, як ты хацела. Не пажадала дачушка з табой размаўляць, адно павіталася моўчкі, а губкі не разняла, ды хуценька торг мяне за руку — маўляў, хадзем, татачка. Нават я не чакаў гэткага. І давялося мне пакрывіць душой, зрабіць выгляд, што нічога благога ці абразлівага для цябе ў гэткім адказе няма: дзіця ёсць дзіця, у яго свае клопаты і сімпатыі, і мы, дарослыя, не заўсёды ім указ...

І я зманіў табе ў другі раз: кіўнуў спагадліва — маўляў, не трэба мець крыўды на дзіця, наступным разам яна будзе не гэткай, аднак не верыў у тое: жыло ў яе маленькай, нявопытнай і недасведчанай душы дзіўнае веданне, хто ёсць хто. Татку для гэтага спатрэбілася мора пакут і бясконцых пошукаў, а ў яе душы яно жыло адразу, яна й нарадзілася з гэтым веданнем, хаця карыстацца ім патрэбы ў яе шчэ не было...

І надта ж захацелася татку дазнацца, чаму дачушка з табой размаўляць не хоча. Спытаў пра тое, пра што сам, сваім дарослым розумам, пра цябе даўно думаў: "Таму не хочаш, што яна ў душу лезе?!"

Каб жа ты бачыла, цётачка, з якой удзячнасцю бліснулі яе вочкі і як імгненна пасвятлеў яе тварык. Такі камень з душы дзіцячай зваліўся: не трэба ёй, малечы, ламаць галаву, як тыя словы гучаць, якімі яна шчэ не карысталася. Веданне — яно было, а словы... Словы татка падказаў!

Крыўдзіць цябе не хачу, цётачка, жыві, як жывеш, як Бог прызначыў, але ніколі не рабі так, як дачушка пра цябе сказала. Гэта не мае словы, а яе, дзіцячыя. А дзіця ніколі не маніць, ты, пэўна, і сама пра гэта ведаеш...

Ды тут не пра цябе — хутчэй пра мяне. Пра тое, што мяне самога ў знямённе ўвагнала. Ты, мабыць, і без маіх падказак ведаеш, што яблык ад яблыні не надта далёка... Але каб так блізенька — не-е, цётачка, гэта, мусіць, раз у сто гадоў бывае. Я нават спалохаўся тады: калі гэтак блізка, што не адрозніць, яна гэта думае ці я, то мо й беды яе чакаюць гэткія, што і татка зведаў. Веданне дарма не даецца, за яго мусіш плаціць... А чым жа яно плаціць будзе, малое? Мне лягчэй: жыць у свеце — умець бараніцца. А дзе ёй прыдбаць гэткае ўменне? Пакуль навучышся, дык можа стацца, што й вучоба тая непатрэбная ўжо: не будзе куды ісці і не будзе з чым...

Ты ідзеш, цётачка, да таго, што прызначана толькі табе. І ніхто, нават калі й захоча, не саб'е цябе з гэтага шляху — ні я, ні хтось іншы. То йдзі, я не пярэчу, я бараню сваё, ты — сваё. Але мы ніколі не будзем ісці адной дарогай, хаця і сутыкнёмся на скрыжаваннях не адзін раз. І кожны раз ты будзеш хацець свайго, а я — свайго.

Але гэта тое, што будзе потым. А тады, цётачка, прызнайся, табе ўсё-такі прыемна было бачыць нас: чымсьці мы ўлагоджвалі тваю душу. Мо тым, як суладна крочылі з дачушкай, як без слоў разумелі адно аднога, — і ты, мабыць, проста радавалася, што трапляюцца і такія бацькі, для якіх родныя дзеці — не чужыя. І ты даравала нам той драбок непрыхільнасці, які мы так старанна хавалі ад цябе, але ты ўсё адно адчувала яго, ды змяніць ужо нічога не магла: гэта залежала не ад твайго жадання, а ад змесціва тваёй душы — гэтаксама, як і ад нашай. І мы, ведаючы ўсё гэта, моўчкі дамовіліся з табой, што не будзем нічога змяняць — хай усё застаецца так, як яно ёсць.

Мы віталіся раніцай, а ты ўсміхалася нам яшчэ здалёк, аднак мы ні разу не спыняліся — каб пагаварыць з табой. А потым дачушка вырасла і пайшла ў школу. Наш ранішні маршрут — паўз Летні сад і паўз цябе, цётачка, ведама, змяніўся, і я вельмі доўга не бачыў цябе...

Сёлетняй восенню — а з той пары мінула, каб не зманіць, гадоў шэсць, ці сем, — мне зноў выпала сутыкнуцца з Вечнасцю — таптаць брукаванку і шырокія гранітныя пліты ўздоўж Летняга саду. І вось тады я зразумеў, што ты, цётачка, — таксама вечная, бо я зноўку стрэў цябе на знаёмым месцы і ў тым самым дворніцкім "віцмундзіры" апельсінавага колеру... Не, ужо не апельсінавы, а блякла-жоўтага, абмытага дажджамі і непагаддзю... І мятла была як тая самая, хоць ты за гэты час сашморгала аб камяні,

(Працяг на стар. 12)

## Фотападарунак з Швейцарыі

**У апошнія гады магілёўскія аматары прыгожага мелі магчымасць досыць часта знаёміцца з творчасцю замежных фотамастакоў. І ўсё гэта дзякуючы творчым кантактам фотамастакоў Беларускага клуба мастацкай фатаграфіі і народнага фотаклуба "Вясёлка" пры Магілёўскім гарадскім цэнтры культуры і адпачынку з зарубежнымі майстрамі святлапісу.**

**Вось і цяпер у выставачнай зале абласной арганізацыі Саюза мастакоў РБ працуе фотавыстава швейцарскага мастака Дэрэка Слэтэры, якая стала прыкметнай падзеяй у культурным жыцці горада.**

**Творчасць Д. Слэтэры, які нарадзіўся ў Оксфардзе (Вялікабрытанія), а зараз жыве ў Жэневе, вядомая ў многіх краінах свету. Ён з'яўляецца віцэ-прэзідэнтам Еўрапейскай фатаграфічнай асацыяцыі "Вобразы без межаў", членам Каралеўскага, Аўстралійскага, Амерыканскага фатаграфічных таварыстваў, Ірландскай і Пакістанскай фатаграфічных асацыяцый, ганаровым членам фатаграфічных таварыстваў Грузіі і Тайваня.**

**У прадстаўленай экспазіцыі Д. Слэтэры — лепшыя фотаздымкі, зробленыя ў час вандровак па розных кутках свету. Тут прырода і дзікі жывёльны свет. Сярод здымкаў найбольш цікавымі з'яўляюцца сюжэты з японскімі снежнымі макакамі, пінгвінамі з Антарктыды і птушкамі з Фалклендскіх астравоў. Акрамя гэтага, у калекцыі прадстаўлены як класічны партрэт, так і фатаграфічны эксперымент.**

**Творы з гэтай калекцыі неаднаразова з поспехам экспанаваліся ў шмат якіх салонах, бралі ўдзел у конкурсах фатаграфіі розных краін свету.**

**Валянціна БОНДАРАВА**

## Беларускі царкоўны хор на Беласточчыне

**21—22 лістапада па запрашэнні таварыства міласэрнасці "ELEOS" Беласточчыну наведаў хор Беларускага праваслаўнага Брацтва трох віленскіх мучанікаў. Хор даў два дабрачынныя канцэрты: у вёсцы Рыбалы і ў Беластоцкай філармоніі. У Рыбалах была таксама адслужана ўсяночная, а ў старажытным манастыры Супрасля — літургія.**

**Унікальнасць і непаўторнасць выканання царкоўных спеваў хору была адзначана многімі слухачамі, у тым ліку вядомым дзеячам Сусветнага Савета цэркваў у Польшчы, бізнесменам Міраславам Матрэнчыкам, каардынатарам Беларускага дэмакратычнага аб'яднання беларускіх арганізацый у Польшчы Пятром Юшчуком і іншымі.**

**Канцэрт у філармоніі складаўся з двух аддзяленняў: царкоўнай праваслаўнай песеннай творчасці і народных спеваў. І калі ў другой частцы не было нічога незвычайнага — Беласточчына ведае і шануе беларускія народныя спевы, то ў першай частцы наш хор быў непаўторным. Гучанне ў зале філармоніі Беластока фрагментаў з беларускамоўнай літургіі і беларускіх праваслаўных кантаў было сапраўдным адкрыццём амаль для ўсіх прысутных.**

**Ужо больш года мінула з таго часу, як брацкі хор разам з айцом Георгіем Латушкам распачаў у Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы служэнне акафіста Тром Віленскім Мучанікам і малебна за беларускі народ на беларускай мове. За гэты час хор значна павялічыў свой рэпертуар, заканчваецца падрыхтоўка беларускамоўнай літургіі, з якой мяркуецца распачаць служэнне ў нядаўна зарэгістраваным беларускім прыходзе "Усіх святых зямлі беларускай".**

**Дарэчы, хаця новы прыход яшчэ не мае свайго памяшкання, прыхільнікі богаслужэння на беларускай мове збіраюцца для абмеркавання царкоўных пытанняў у храме Пятра і Паўла (дакладней, у прыходскім доме). Праводзіць гэтыя сустрэчы настаяцель храма айцец Георгій Латушка. Час правядзення — кожны панядзелак, а 18-й гадзіне.**

**Анатоль АСТАПЕНКА**

# Праблемы засталіся

***25—26 лістапада праходзіў чарговы, XVI з'езд Беларускага саюза мастакоў. Днём раней дэлегаты сабраліся на ўрачысты сход, прысвечаны 60-годдзю творчага саюза. Як мае быць у такіх выпадках, мастакоў віталі іхнія калегі з іншых творчых "цэхаў" — архітэктары, акцёры, пісьменнікі, прадстаўнікі ўлады. Былі зачытаны віншавальныя тэлеграмы. Потым адбыўся канцэрт.***

Здавалася б, гэтая ўрачыстая прэамбула павінна была настроіць дэлегатаў на памяркоўны лад, паспрыяць усведамленню, што ўсе мы — пасажыры аднаго карабля, і карабель гэты не варта разгойдваць. Аднак — не! Спрэчкі па статуце і асабліва выбары старшыні саюза прадэманстравалі, што славутая беларуская талерантнасць на Беларускі саюз мастакоў не распаўсюджваецца, што ў БСМ ёсць групоўкі з рэзка супрацьлеглымі інтарэсамі; што саюз дагэтуль не распаўся толькі таму, што ёсць агульная маёмасць, якую мастакі не ведаюць, як падзяліць.

Нагадаю, што шэсцьдзесят гадоў назад Саюз мастакоў быў створаны не таму, што мастакі адчувалі патрэбу ў такім аб'яднанні, а па загадзе зверху. Фактычна мастакоў сабралі ў "калгас", а ролю "старшыні калгаса" выконваў куратар па ідэалогіі з ЦК КПБ.

З'яўленне элементаў рынкавых стасункаў у эканоміцы і элементаў дэмакратыі ў грамадстве рубам паставіла пытанне аб лёсе калгасаў, у тым ліку і "калгасаў" творчых.

Што такое сёння Беларускі саюз мастакоў: размеркавальнік майстэрань і заказаў альбо сумоўе творцаў, дыскусійны клуб, дзе вырашаюцца праблемы культуры, мастацтва? Сённяшні БСМ мае рысы і таго, і другога. На з'ездзе ішла гаворка і пра гаспадарчыя праблемы саюза, і пра рацыянальнае скарыстанне культурнай спадчыны, і пра прафесійную этыку, і пра стасункі з уладай, і яшчэ шмат пра што.

Саюз мастакоў, як вядома, падзяляецца на секцыі па відавой адзнацы (секцыя графікі, жывапісу, скульптуры...). Але адносна нядаўна мастакі пачалі аб'ядноўвацца ў суполкі па творчых інтарэсах. Скажам, фактычна ўсе віды выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва прадстаўлены ў суполцы "Пагоня". Жывапіс і графіка — у суполцы "Няміга", і гэтак далей. Статут гарантуе права мастака быць адначасова ў секцыі і ў суполцы. На з'ездзе было пацверджана гэтае права, але зроблена ўдакладненне: права рашаючага голасу мастак мае толькі ад адной структуры саюза: альбо як сябра суполкі, альбо як прадстаўнік секцыі.

Калісьці лепшыя сілы саюза канцэнтраваліся ў Мінску. Сёння абласныя і нават раённыя гарады маюць уласныя творчыя асяродкі, здольныя ладзіць культурніцкія акцыі не горш за мінчукоў. Гэтая "дэцэнтралізацыя" дакументальна занатавана ў новай рэдакцыі статута. Цяпер рэгіянальным структурам Саюза перададзены ў аператыўнае кіраванне вытворчыя аб'екты БСМ, што знаходзяцца на іхняй тэрыторыі. Напрыклад, Гродзенскі мастацкі камбінат будзе зараз кіравацца з Гародні, а не з Мінска. А са сталіцаю толькі дзяліцца даходамі.

Прынамсі, так я разумею новыя стасункі цэнтра і рэгіёнаў.

Папраўкі ў статут былі прыняты ў адносна спакойнай абстаноўцы. "Мячы скрыжаваліся" на наступны дзень, падчас выбараў старшыні. Секцыі прапанавалі свае кандыдатуры на гэтую пасаду, акрамя таго, былі кандыдаты ад рэгіёнаў і, так бы мовіць, "незалежныя" кандыдаты. Усяго — восем чалавек. Потым засталося трое, іхнія прозвішчы і былі ўнесены ў выбарчыя бюлетэні: Генадзь Буралкін, Георгій Лойка і Мікола Купава. Вось тут і пачалося...

Рэч у тым, што па статуце адзін і той чалавек можа займаць пасаду старшыні БСМ толькі два тэрміны запар. На трэці тэрмін ён не можа нават балатавацца, не тое што быць абраным. Генадзь жа Буралкін ужо адпрацаваў на гэтай пасадзе ці то два, ці тры, ці нават тры з паловаю тэрміны (гледзячы — як лічыць). Значыць, уносячы кандыдатуру сп.Буралкіна ў спіс для галасавання, мастакі парушалі статут свайго саюза. Але, згодна таму ж статуту, вышэйшы орган саюза — з'езд. Паколькі з'езд статут прымаў, з'езд мае права яго і "парушыць". Таму сп.Буралкін адмовіўся ўзяць самаадвод і ўступіў у барацьбу за крэсла. Усё нібыта па законе, хаця сітуацыя і нагадвае вядомае выслоўе пра закон і дышаль...

Генадзь Васільевіч моцна рызыкаваў, бо ягоныя апаненты далі яму зразумець, што калі ён будзе змагацца за пасаду старшыні, яны глыбока капнуць гаспадарча-камерцыйную дзейнасць саюза за адпаведны перыяд і азнаёмяць са сваім доследам шырокія колы мастакоўскай грамадскасці. Так яно і здарылася. У справаздачы рэвізійнай камісіі прагучала абвінавачванне сп. Буралкіну ў тым, што ён карыстаўся касай саюза для рэалізацыі ўласных праектаў, якія не маюць нічога агульнага з інтарэсамі шараговых сяброў БСМ і саюза ўвогуле. Аднак, абвяргаючы абвінавачванні ў свой адрас і выступаючы з контрабвінавачваннямі, Генадзь Васільевіч паказаў, што ён — вопытны турнірны баец і трымаць удар умее. За гэтую, мабыць, якасць дэлегаты з'езда і абралі яго зноў старшынёю БСМ, палічыўшы, што "коней на пераправе не мяняюць".

Мікола Купава "сышоў з дыстанцыі" ў першым крузе. Што так будзе, разумелі і тыя, хто яго вылучаў, — суполка "Пагоня". Удзел старшыні "Пагоні" ў выбарах (ён нядаўна змяніў у кіраўніцтве суполкі Алеся Марачкіна) павінен быў даць адказ на пытанне аб рэйтынгу суполкі сярод сяброў БСМ. Аказалася, што рэйтынг даволі высокі. Што ж датычыць Буралкіна і Лойкі, дык яны выйшлі ў другі тур з разрывам у нейкі дзесятак галасоў.

У другім туры "Пагоня" галасавала за Буралкіна. Я не памылюся, калі скажу, што менавіта яе галасы і зрабілі Генадзя Васільевіча старшынёю БСМ.

З'езд скончыўся. Праблемы Саюза мастакоў — засталіся. І галоўная з іх — незапатрабаванасць мастацкай творчасці ва ўмовах эканамічнага крызісу і неакрэсленай дзяржаўнай ідэалогіі.

Быў час, калі нямала нашых мастакоў дэманстратыўна падкрэслівалі свой касмапалітызм, супрацьпастаўляючы яго беларушчыне. Цяпер жа ў адрас творцаў нацыянальнай арыентацыі можна пачуць, што яны, маўляў, лічаць, што толькі яны — беларусы, а мы — не, а нам, значыць, за народ беларускі не баліць!

Нешта падобнае я чуў і на гэтым з'ездзе, калі са сваёй праграмай выступаў Мікола Купава.

Людзі хоць і павольна, але мяняюцца. Змены закранулі і Беларускі саюз мастакоў.

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ**

*Моманты з'езду занатаваў К. Дробаў.*

ВІНШУЕМ!

# Дзеі нашага адраджэнца

***Весела іграў гармонік, звінеў бубен, чароўныя гукі даносіла жалейка, гучалі беларускія народныя песні, частушкі, жарты, разыгрываліся тэатралізаваныя сцэны. Конь быў запрэжаны ў драбіны, на якіх хлопцы-музыкі і дзяўчаты-спявачкі славілі багацце роднай зямлі. Грымела "Свята ўраджаю" ў маляўнічых кутках Гомельскага парку культуры і адпачынку...***

Выступаў знакаміты ўжо для ўсіх гамяльчан фальклорны тэатр "Жалейка". Галоўным удзельнікам у ім быў яго стваральнік-рэжысёр Мікола Макарцоў, сялянскі сын з Быхаўшчыны, сын зямлі беларускай, які ўвабраў яе сокі, гукі, пахі і колеры яе палеткаў і лугоў, бароў і гаёў, матчынай песні і бацькоўскага дома.

Тая дзея ў Гомельскім парку адбывалася гадоў дваццаць назад. Тады я, як журналіст абласной газеты, і пазнаёміўся з Міколам Макарцовым. І вось ужо цягам доўгага часу сябрую з гэтым абаяльным, сціплым, аптымістычным чалавекам, які ўнёс значны ўклад у адраджэнне нацыянальнай культуры і мастацтва, нашай духоўнасці, што заўсёды давалі беларускаму народу сілу, зарад на вытрымку, выкоўвалі згоду сярод людзей.

М. Макарцоў скончыў тэатральнае аддзяленне Магілёўскага культурна-асветнага вучылішча імя Крупскай. Першым яго настаўнікам у тэатральным мастацтве быў Валянцін Іванавіч Ермаловіч — майстар народнай сцэны, адметны рэжысёр, добры знаўца беларускай мовы (цяпер — заслужаны дзеяч культуры рэспублікі). Пасля заканчэння вучылішча М. Макарцоў працуе на Аршаншчыне, потым служыць у арміі, пасля зноў вяртаецца сюды ж, стварае тэатральны калектыў, у якім ставіць п'есы-аднаактоўкі.

З самага пачатку сваёй творчасці М. Макарцоў вызначыў свой галоўны прынцып: у аснове ўсяго павінны быць здабыткі нашага народа, яго залаты запас, прапаганда беларускага слова, беларускай народнай песні, танца, народнай тэатральнай культуры. Рэалізоўваць у будучым гэтыя задачы дапамагла вучоба ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце, дзе яго настаўнікамі былі многія вядомыя рэжысёры Беларусі.

Гомель стаў для М. Макарцова тым горадам, які прынёс яму сапраўдныя творчыя набыткі. Ён працуе ў палацах культуры "Гомсельмаша" і "Гомельпрамбуда". Можна, бадай, сказаць, што жыхары горада над Сожам, дзякуючы акурат Міколу Макарцову ўпершыню праз тэатральнае мастацтва адчулі водар і смак роднага слова, шчырасць і дабрыню душы беларуса, неўтаймоўную сілу яго гумару і жартаў, а, галоўнае, глыбей, спазналі трагедыю Беларусі. М. Макарцоў тут ставіць спектаклі "Мікітаў лапаць" Міхася Чарота, "Паўлінка" Янкі Купалы, "Трыбунал" Андрэя Макаёнка, зрабіў і ўвасобіў інсцэніроўку па кнізе А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка "Я з вогненнай вёскі", спектаклі-відовішчы па п'есе Івана Козела "Над хвалямі Серабранкі", "Ліпавічок" Уладзіслава Галубка, а таксама "Сустрэча на кірмашы", "Палескае вяселле" і іншыя. Са сваім тэатрам "Жалейка", які напачатку быў народным, а затым і прафесійным (дзейнічаў пры Гомельскай абласной філармоніі), Мікола Макарцоў скалясіў усю Беларусь, гастраляваў на Украіне, у Расіі, Польшчы, прымаў удзел у прэстыжных сусветных фестывалях. "Жалейку" бачылі ажно ў далёкай Індыі, дзе гледачы горача апладзіравалі агністай музыцы, меладычным спевам, іскрыстым танцам і дасціпным жартам нашых землякоў. Тэатр і рэжысёр неаднаразова ўзнагароджваліся медалямі, ганаровымі граматамі, дыпломамі, падзякамі.

Тэатразнаўца Тамара Гаробчанка ў свой час пісала: "У рэпертуары Гомельскага фальклорнага тэатра "Жалейка" шырока прадстаўлена беларуская драматургія, узбагачаная народнымі сцэнамі, вершамі, песнямі, танцамі. Асобныя спектаклі ідуць у суправаджэнні старадаўніх народных інструментаў. Значнае месца адведзена творчасці Купалы, пастаноўкі на купалаўскую тэму вылліваліся ў яркія масавыя відовішчы. Спектаклі, пастаўленыя М. Макарцовым, вылучаюцца дасціпным гумарам, дакладным спасціжэннем камедыйнай стыхіі твораў".

Сапраўды, 100-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы "Жалейка" адзначыла шэрагам твораў, чаго не скажаш пра іншыя самадзейныя і прафесійныя тэатры Беларусі. Спектакль "У купальскую ноч" быў паказаны ў Вязынцы на радзіме песняра на свяце паэзіі. Тэатразнаўца Анатоль Сабалеўскі пра гэты спектакль пісаў: "Людзі імкліва рушылі да рачулкі, шчыльна абступілі выгараджаную для паказу пляцоўку, зноў жа паўзбіраліся на розныя ўзвышэнні. Гледачоў сабралася каля трох тысяч, уласна столькі, колькі магло бачыць спектакль. Ён ішоў на працягу амаль дзвюх гадзін, і ніхто з прысутных не кранўўся з месца, усе сачылі за падзеямі. Выканаўцы чаравалі непасрэднасцю, шчырасцю пачуццяў, чыстай, каб не сказаць наіўнай верай у той дзівосны незвычайны свет, у якім жылі, дзейнічалі, самі ж яго тварылі. Відовішча разгортвалася ў прыродных умовах, удала абыгрывалася і сама рэчка, і прыбярэжныя кусты, дрэвы і кваціты поплаў".

А яшчэ да юбілею Янкі Купалы М. Макарцоў паставіў прадстаўленне "Па волю, па песню, па шчасце...", у якое ўвайшлі ўрыўкі з паэм "Бандароўна", "Курган", вершы аб мужыцкай долі.

Каб паглыбіць свае веды ў тэатральным мастацтве, М. Макарцоў паступае ў аспірантуру БАМа, дзе настаўнікам і дарадцам яго становіцца былы рэктар БДТМІ, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Анатоль Сабалеўскі.

Другі перыяд плённай творчасці М. Макарцова звязаны з Мінскам і іншымі гарадамі і мястэчкамі Беларусі. Ад Міністэрства культуры, Беларускага фонду культуры, рэспубліканскай дырэкцыі нацыянальных мастацкіх праграм, творчай майстэрні "Эстрада" М. Макарцоў у якасці галоўнага рэжысёра і рэжысёра-пастаноўшчыка ўвасабляў шэраг рэспубліканскіх свят і фестываляў. Гэта — усебеларускае Купалле ў Тураве, "Гуканне вясны" ў Жыткавічах, "На крылах Палескага фальклору" ў Лельчыцах, а таксама свята, прысвечанае Паўлюку Багрыму ў Крашыне, святы ў старажытных Друцку і Копысі, прысвечаныя 500-годдзю Мірскага замка ў Міры, 200-годдзю Яна Чачота ў Малюшчыцах, фестывалі "Гасціны ў Галубка" ў Баранавічах і іншыя. Як адзін з рэжысёраў-пастаноўшчыкаў, ён прымаў удзел у фестывалі "Беларусь — мая песня", у святах горада Мінска, Беларускага пісьменства і друку, 200-годдзя Адама Міцкевіча ў Навагрудку.

Не забываў М. Макарцоў і сваю родную Быхаўшчыну, неаднойчы прыязджаў туды з тэатрам, правёў рэспубліканскае Купалле на старажытным Баркалабаўскім замчышчы, на якім былі і беларусы з замежжа. З Быхаўскімі аматарамі тэатральнага мастацтва ён паставіў спектакль па аповесці Б. Васільева "А досвіткі тут ціхія".

Свае артыстычныя здольнасці М. Макарцоў праяўляў не толькі ў фальклорным тэатры, пастаноўках-відовішчах, але і на тэлеэкране. Ён быў вядучым вячорак на Гомельскай студыі тэлебачання, здымаўся ў тэлевізійных фільмах "Атланты і карыятыды" па рамане І. Шамякіна, у "Новай зямлі" па паэме Я. Коласа, у фільме "Чырвоны вострaў" па М. Булгакаву і інш.

Урэшце, М. Макарцоў валодае і яшчэ адным неацэнным дарам. Ён заўзяты, апантаны збіральнік тэатральнага фальклору, даследчык народнай тэатральнай культуры. З'яўляецца аўтарам кніг "Каб не перасыхала крыніца", "Слова пра творцаў", п'есы "Тураўская легенда".

Ён выступае як публіцыст, аўтар шматлікіх артыкулаў па праблемах народнай культуры. На працягу некалькіх гадоў быў членам рэдакцыйнай калегіі часопіса "Тэатральная Беларусь".

У гэтыя дні мой сябра адзначае 50 гадоў з дня нараджэння і 25-годдзе творчай дзейнасці. Думаецца, што і надалей ён будзе множыць свае творчыя здабыткі.

**Аляксей ШНЫПАРКОЎ,**
**астацтвазнаўца**

ВЫСТАВЫ

# "Прыватная калекцыя"

25 лістапада Музей сучаснага выяўленчага мастацтва запрасіў гледача ў свае залы на прэм'еру новай выставачнай рубрыкі — "Прыватная калекцыя". Экспазіцыя выставы — з прыватнага збору Андрэя Плясанава і з'явілася першай спробай музея наладзіць кантакты з уладальнікамі прыватных калекцый.

Серыя жывапісных твораў пад агульнай назвай "Майстэрня мастака" — гэта невялікая частка даволі вялікага і разнастайнага збору, у якім налічваецца больш за 1000 жывапісных і графічных твораў знакамітых і пакуль яшчэ вядомых толькі ў вузкіх колах спецыялістаў беларускіх мастакоў. Дарэчы, імя А. Плясанава вядома сёння сярод грамадскасці рэспублікі як уладальніка, бадай, адной з самых буйных калекцый беларускага андэграўнда канца 70—80-х гадоў.

Калекцыя пачала складвацца прыкладна з 1975 года з сяброўскіх падарункаў. Серыя твораў пад назваю "Майстэрня мастака" займае ў зборы Плясанава асобнае месца і мае сваю гісторыю. Гэта творы, выкананыя мастакамі рознага ўзросту, розных стылявых арыентацый і накірункаў, напісаныя спецыяльна для калекцыі Плясанава. Загадзя заказаўшы палотны на падрамніках адзінага памеру (45х60 см), ён развозіў іх мастакам, у творах якіх быў зацікаўлены. І ў выніку ў серыі на сённяшні дзень — каля 100 палотнаў 70 аўтараў і яна працягвае папаўняцца. У выставачнай зале музея гледачы маюць магчымасць пазнаёміцца з 66 творамі названага цыкла, сярод якіх — палотны народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва, заслужаных дзеячаў мастацтваў Вячаслава Кубарава, Яўгена Ганкіна, Юрыя Альбіцкага, творы Мікалая Селешчука, Уладзіміра Цэслера, Сяргея Малішэўскага, Вольгі Сазыкінай, Сяргея Войчанкі, Зоі Луцэвіч, Аляксея Жданава, Уладзіміра Акулава, Наталлі Рачкоўскай, Генадзя Хацкевіча, Артура Клінава, Андрэя Бялова і г.д.

Безумоўна, у інфармацыі нельга пералічыць імёны ўсіх мастакоў, але нават гэты невялікі спіс павінен падказаць знаўцам беларускага мастацтва тую адметнасць, своеасаблівасць задумы калекцыянера — у межах адзіных зададзеных умоў паказаць побач розныя творы — ад узораў высокай рэалістычнай школы да варыяцый нефігуратыўнага жывапісу.

Серыя "Майстэрня мастака", як і ўся калекцыя, — гэта не закрыты збор аматара. Яе ўладальнік — паслядоўны прапагандыст творчасці мастакоў. Ён вядомы як актыўны арганізатар народжаных у той час нефармальных выстаў (дастаткова нагадаць першую ў гісторыі Беларусі афіцыйную выстаўку авангарда ў Мінску, выстаўкі "На Калектарнай", "Перспектыва" (усе ў 1987 годзе), "Новае мастацтва ў Беларусі" — у г. Дармштаце (Германія, 1990 г.) і г.д.

Паказальна, што выставу ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва А. Плясанаў распачаў творам С. Малішэўскага "Ню". Гэта своеасаблівы анонс новай серыі жывапісу, якую задумаў збіраць калекцыянер. У яе аснове — тыя ж прынцыпы, якія былі апрабаваны ў серыі "Майстэрня мастака": зноў адзіная тэма ("Ню"), адзіны памер (на гэты раз 60х70), зноў мастакі Беларусі ўсіх мастацкіх накірункаў.

Але, гаворачы пра калекцыянера А. Плясанава, нельга абмінуць і яшчэ адну важную рысу яго асобы. Выпускнік аддзялення рэжысуры БДТМІ, даўні аматар жывапісу, ён і сам не мінуў спакусы "творчасці". Заняткі жывапісам, спачатку "для сябе", з цягам часу перараслі ў сапраўдную справу. Персанальныя выставы Плясанава-мастака, яго творы ў розных групавых выставах за апошнія дзесяцігоддзі бачылі, відаць, многія.

Сёння, напярэдадні свайго 50-годдзя, А. Плясанаў прадстаўлены на выставе ў Музеі сучаснага мастацтва не толькі як калекцыянер, але і як мастак. З яго творчасцю гледачы маюць магчымасць пазнаёміцца на невялікай, але змястоўнай персанальнай выставе "На галерэі".

*На здымку: А. Плясанаў з сям'ёй.*

КАНТАКТЫ

# Форум — і пагадненне

На пачатку снежня Беларуская акадэмія музыкі запрасіла да сябе мастацкіх дзеячаў, педагогаў і выкладчыкаў з розных навучальных устаноў краіны і бліжэйшага замежжа на Міжнародную навуковую канферэнцыю "Мастацкая адукацыя XXI стагоддзя. Пераемнасць. Метадалогія. Дыдактыка".

Навуковы форум, наладжаны па ініцыятыве Міністэрства культуры, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў ды інстытута праблем культуры, завяршыў сабой шэраг канферэнцый у галіне мастацтва, якія адбыліся на працягу адыходзячага года.

Сярод удзельнікаў — прадстаўнікі Нацыянальнага інстытута адукацыі РБ, вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, Расіі і Літвы, выкладчыкі Мінскага, Гродзенскага, Лідскага музычных вучылішчаў, Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі.

На пасяджэннях абмяркоўваліся праблемы, вырашэнне якіх пераходзіць у XXI стагоддзе. Асаблівая ўвага надавалася пытанням духоўнага выхавання, распрацоўкі метадалагічнай базы, захоўвання сістэмы арганізацыі і гуманістычнай накіраванасці мастацкай адукацыі.

Да ўвагі ўдзельнікаў і слухачоў канферэнцыі былі прапанаваны разнастайныя культурныя мерапрыемствы: канцэрт "Музычныя прэм'еры", у якім прагучалі творы студэнтаў кампазітарскага аддзялення БАМ, персанальная выстава прафесара П. Сёмчанкі і яго вучняў "Лінія доўжыцца", дыпломны спектакль студэнтаў тэатральнага факультэта Беларускай акадэміі мастацтваў "Туцці-Фруцці".

Вялікую цікавасць выклікала прэзентацыя "Тэматычнага слоўніка музычных рэмарак" — навуковай распрацоўкі загадчыцы кафедры замежных моў БАМа С. Шчукінай.

У межах канферэнцыі адбылося ўрачыстае падпісанне пагаднення аб творчым супрацоўніцтве паміж Беларускай і Літоўскай акадэміямі музыкі. Пагадненне падпісалі рэктар нашай акадэміі, народны артыст, прафесар М. Казінец і рэктар Літоўскай акадэміі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Ю. Антанавічус.

**Валянціна АЛЯФІРЭНКА,**
**студэнтка БАМ**

## Пачынаецца з памяці...

**Маладзёжны цэнтр "Гарт" і Гомельская філія арганізацыі "Грамадзянскі форум" правялі 13 снежня ў Лоеве (пры падтрымцы мясцовага клуба выбаршчыкаў) семінар па пытаннях маладзёжнай палітыкі рэгіёна. Маладыя лідэры Лоева выказалі падтрымку старшыні клуба выбаршчыкаў і настаўніку мясцовай школы Мікалаю Аніскаўцу, які прапанаваў шырока адзначыць у будучым годзе 350-ыя ўгодкі Лоеўскай бітвы (31 ліпеня). Бітва, у якой сышліся войскі Януша Радзівіла і Багдана Хмяльніцкага, была адной з буйнейшых і драматычных падзей вайны 1648—67 гадоў. Яе ўдзельнікі былі пахаваныя ў агульных магілах.**

**На семінары выступіў бард Андрэй Мельнікаў.**

**Ф.КМІТА**

## Паэтам быў і рэвалюцыянерам

**Мікола Засім у 1924 годзе, маючы за плячыма шаснаццаць гадоў, уступіў у падпольную камсамольскую арганізацыю, потым — у Камуністычную партыю Заходняй Беларусі. За ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху неаднаразова арыштоўваўся, давялося некаторы час правесці ў пружанскай турме. Пасля ўз'яднання заходнебеларускіх зямель землякі М. Засіма з вёскі Шані цяперашняга Пружанскага раёна выбралі яго старшынёй сельсавета. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам, інструктарам Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта, а пасля вызвалення Брэстчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў загадваў адным з аддзелаў Пружанскага райвыканкама. Скончыўшы Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ, працаваў у брэсцкай абласной газеце "Заря", у раённай газеце "Заря над Бугом". Заўчасна памёр 19 ліпеня 1957 года. А друкавацца пачаў яшчэ ў 1928 годзе на старонках заходнебеларускіх часопісаў, у гады вайны — у падпольных газетах "Заря" і "За Родину". Першая кніга паэзіі "Ад шчырага сэрца" выйшла ў 1947 годзе, наступная — "Вершы" — у 1954-ым. Найбольш поўна творчая спадчына М. Засіма прадстаўлена ў томіку "А за намі Белавежа", які пабачыў свет у 1984 годзе. У гэтыя дні, калі з дня нараджэння паэта споўнілася 90 гадоў, у вас, магчыма, з'явіцца жаданне далучыцца да яго творчасці. Перагарніце старонкі гэтай кніжкі і адразу адчуеце водар паэзіі зямной, пасапраўднаму шчырай.**

## Нарэшце злітаваўся лёс

**Пражыла Тамара Цулукідзе нямала: нарадзілася 19 снежня 1903 года ў горадзе Тбілісі (Грузія) — памерла ў Мінску 9 лютага 1991-га. А пражыла і пабачыла яшчэ болей. У 1924 годзе скончыла Тбіліскі дзяржаўны тэатральны інстытут, была прынята ў трупу Акадэмічнага тэатра імя А.Ахметэлі. Але муж яе, вядомы рэжысёр А.Ахметэлі быў расстраляны як "вораг народа". Пасля і пачаліся выпрабаванні для Тамары Георгіеўны. З 1937-га па 1946 год знаходзілася ў турмах, лагерах, на лесапавале, працавала санітаркай, медыцынскай сястрой. У Сыктыўкары (Комі АССР) стварыла тэатр лялек. У 1946 годзе была вызвалена, праз два гады перабралася ў Курск, дзе працавала рэжысёрам абласнога тэатра лялек. Але зноў арыштавалі, выслалі ў Краснаярскі край. Там Т.Цулукідзе пазнаёмілася з Алесем Пальчэўскім, які таксама быў рэпрэсаваны, стала яго жонкай. У 1958 годзе пераехала ў Мінск да А.Пальчэўскага, які вярнуўся з выгнання раней. Літаратурную працу пачала з артыкулаў і рэцэнзій пра тэатр яшчэ ў 1933 годзе. З 1959 года пачала выступаць у беларускай перыёдыцы. Для дзяцей выйшлі кнігі "Театр кукол в школе", "Когда поднимается занавес", "К детям пришел вожатый", "Голубой факел"... У 1983 годзе ў Тбілісі пабачыла свет кніга мемуараў Т.Цулукідзе "Всегда одна жизнь". Пераклала на беларускую мову раман Ц.Данжашвілі "На Алазані" (з А.Пальчэўскім), асобныя творы іншых пісьменнікаў.**

# Лёс каменнай балады

*(Працяг. Пачатак на стар. 5)*

Меркавалася зрабіць і многае іншае. У прыватнасці, была задумка пазначыць месцы сталіцы і абласных гарадоў на "карце", у дадатак да елачак, яшчэ і камянямі з металічнымі шыльдамі з надпісамі гарадоў. "Алею валуноў" меркавалася з цягам часу ажывіць скульптурнымі кампазіцыямі на розныя тэмы: "Валуны — сімвалы галоўнейшых вех гісторыі развіцця геалагічнай навукі Беларусі", "Алея былін аб валунах", "Каменны заапарк" і інш. Скульптар В. Янушкевіч выканаў для музея цудоўныя бронзавыя барэльефы па матывах легенд пра валуны. Нарэшце, меркавалася абсталяваць усю пляцоўку музея па-мастацку выкананымі паказальнікамі, каб наведвальнікі не былі тут, на ягоных сцяжынах, "глухімі і сляпымі".

Карацей кажучы, пасля завяршэння ўсіх гэтых работ музей валуноў стаў бы выдатнай мясцінай сталіцы, адмысловым мастацкім творам, сапраўднай каменнай песняй-баладай у гонар роднага краю, яго багацця і прыгажосці. Ды, на жаль, спадзяванням гэтым не суджана было спраўдзіцца.

Як ні горка пра гэта гаварыць, але мы, напэўна, яшчэ не дараслі, не саспелі для таго, каб звацца цывілізаванымі людзьмі. Мы дзікуны каменнага веку, няйначай. Бальшавічкі-архараўцы паказалі, пачынаючы з 1917-га, як трэба рабаваць і плюндрыць панскія маёнткі разам з іхнімі бібліятэкамі, карціннымі галерэямі і архівамі, як на руінах старога "будаваць" новы свет, дзе ўсё будзе не маё ці тваё, а — "нічыё". Навуку гэтую людзі нашы засвоілі надзвычай добра. Вось дасюль і руйнуем.

Зруйнавалі і музей камянёў. Неўзабаве былі пагнуты, скручаны, паламаны свяцільнікі. Давялося дэмантаваць пітныя фантанчыкі, бо сучасныя манкурты крышаць і ламаюць усё запар. Нават выдзіраюць і крадуць плітку з пешаходных сцежак і дарожак! Што ўжо казаць пра засмечванне тэрыторыі музея, пра шкло, пластыкавыя бутэлькі і іншае смецце, якім запоўнены чашы "Мінскага мора" і "Нарачы"! Нават камяні сям-таму не даюць спакою — іх пераварочваюць, скочваюць з месца, паскудзяць.

А эканамічная сітуацыя ў краіне рэзка змянілася ў горшы бок. Грошай няма нават на тое, каб хоць збольшага сачыць за санітарным парадкам на тэрыторыі музея, каб своечасова скошваць траву, бо без гэтага ўсё імкліва зарастае бур'яном-бадыллем. На жаль, апошнім часам музею амаль нічым не дапамагае ні НАН, ні гарвыканкам. Апошні, праўда, выдаткаваў быў 100 мільёнаў рублёў, на якія "Гарсвятло" паставіла вакол музея 14 ліхтарных слупоў — трэці раз пасля адкрыцця музея! За трэцім разам паставілі ўжо не паркавыя свяцільнікі, а звычайныя вулічныя ліхтары — можа, яны, дасць Бог, паслужаць даўжэй.

У пошуках сродкаў супрацоўнікі Інстытута геалагічных навук звярталіся ў гарвыканкам, у Першамайскі райвыканкам г. Мінска, у Савет Міністраў, у сталічны экалагічны камітэт, у Міністэрства прыродных рэсурсаў, у камерцыйныя банкі і іншыя прадпрымальніцкія структуры — паўсюль натыкаюцца на глухую сцяну маўчання. А як жа можа загучаць каменная балада, калі ў музеі няма нават звычайных лавак для адпачынку наведвальнікаў, няма сметніц і многага іншага элементарнага абсталявання...

Валуны, валуны... маўклівыя сведкі гісторыі, адвечныя спадарожнікі жыцця нашых людзей. З валуноў узводзіліся замкі і палацы магнатаў, царкоўныя храмы, валуны кралі́ся ў падмуркі сялянскіх хат. Каменнем, сабраным у крушні з палёў, брукаваліся гасцінцы. Спецыяльныя арцелі каменячосаў высякалі з валуноў млынавыя жорны, якія круціла сіла ветру і падаючай вады. Валуны выкарыстоўвалі і ў ваеннай справе — у якасці снарадаў-ядраў. І, вядома ж, валуны — частка нашай прыроды, неад'емная рыса беларускага ландшафту, без іх ён страціць сваю непаўторнасць і своеасаблівасць. Дык чаму ж мы такія чэрствыя і абыякавыя да іх?

...Амаль усё, занатаванае тут, распавёў мне "гаспадар" каменнага музея Валерый Вінакураў. Гаварыў пра ўсё — пра гісторыю стварэння экспазіцыі, пра яе найбольш цікавыя экспанаты, пра набегі сучасных варвараў, пра адсутнасць сродкаў і чыноўніцкую душэўную і духоўную глухату — Валерый Фёдаравіч з вялікай зацікаўленасцю, шчырасцю, захопленасцю, а таксама з болем і засмучэннем. Чым я магла дапамагчы? Хіба вось толькі тым, што паспрабавала распавесці іншым пра гэты незвычайны музей і ягоныя праблемы. Са спадзяваннем на тое, што, можа, хоць хто-небудзь, прачытаўшы мой расповед, зірне на прыдарожны валун іншым вокам і аб чымсьці задумаецца...

**Марыя МІХАЙЛАВА**

# ВОСЕНЬ У ЦЭЛАФАНЕ

*(Працяг. Пачатак на стар. 9)*

пэўна, не адзін іх дзесятак... Але рухі твае засталіся гэткімі, як і былі: няспешнымі і акуратнымі, мо толькі не гэткімі бадзёрымі, ды позірк трохі паспакайнеў. Пэўна, і без мяне зразумела, што не варта так настойліва, да настырнасці, лезці ў чужую душу, калі цябе туды не запрашаюць...

Убачыўшы мяне аднаго, ты не спалохалася, ты проста не паверыла сваім вачам: я — і раптам без дачушкі? І, пэўна, падумала, што я здрадзіў ёй — такое расчараванне было на тваім твары. Не, я стрымаў слова, якое даў тады, калі ўпершыню ўбачыў яе. Як забіраў з раддома. Што б ні здарылася, сказаў я тады самому сабе, што б на мяне ні навалілася, а я заўсёды буду разам з дачушкай. Так яно і па сённяшні дзень: мы заўсёды разам, хаця жыве яна цяпер не са мною, а з мамай. — Так парупіла мамулі... Але скажы шчыра, цётка, ці стала б ты мне пра гэткае расказваць, калі б гэта здарылася з табою, а не са мной? Ты нечакана ўбілася ў маё жыццё, але ўсё адно засталася стороннім чалавекам, які хаця і не жадаў мне чагось благога, ды ўсё ж моўчкі выказаў нясцерпнае жаданне перайначыць маё жыццё, хоць што-небудзь змяніць у ім. Гэта, ведаеш, як хвароба. Хто доўга робіць адну і тую работу, нават не заўважае, як паступова набывае прафесійнае захворванне, адпаведнае сваёй працы. Ты ўвесь час наводзіла чысціню і парадак, і табе, разумею, вельмі хацелася, каб мы выглядалі больш прыстойнымі, вартымі павагі, а то й захаплення. Ты хацела верыць у тое, што гэта не мы кідаем паперкі ды недасмаленыя цыгарэты дзе ўздумаецца. І гэта тваё жаданне ператварылася з цягам часу ў хваробу: ты ўжо не магла бачыць, якія мы недасканалыя, якія манюкі, якія прытворшчыкі. І табе захацелася хоць нечым нам памагчы, падказаць, дзе мы памыляемся, дзе трохі схібілі, а дзе і зусім ідзём не ў той бок. Ты пазірала на нас не сваімі вачыма, а вачыма сваёй хваробы, і таму бачыла не толькі тое, што мы ўжо зрабілі, а і тое, што мы толькі збіраліся зрабіць — плюнуць, кінуць бляшанку ад піва... Вось гэта і ёсць хвароба: бачыць тое, чаго яшчэ няма. А ўсё астатняе — і твае дапытлівыя позіркі, і жаданне ўзлёту ў душу — гэта ўжо вынік той хваробы.

Мілая цётачка, што ты можаш змяніць у тым, што мяняецца так марудна, або й зусім не мяняецца? Марны занятак? Думаеш, я не хацеў нешта змяніць — у сабе? Думаеш, гэта так лёгка? І думаеш, што дастаткова аднаго твайго шчырага ды праніклівага позірку, каб мы раптам засаромеліся саміх сябе і стрымгалоў кінуліся перарабляць тое, што зроблена не намі, што мы атрымалі ў спадчыну, а потым адно ўдасканальвалі свае недахопы?

Але адзін знаходзіць у сабе сілы наступіць на самую дарагую для яго кветку — кветку любові да сябе, а другі так і застаецца ягонай служкай, служкай кветкі, якая пазбаўляе цябе волі, непадуладнай агіднай кветкі, якая знішчае чалавека, бо любоў мае здольнасць у адзін момант ператварацца ў сваю процілегласць — у нянавісць, а нянавісць нараджае подласць, падман, прытворства — усё тое, чым мы не надта ганарымся.

Жадаючы, каб у нашых душах не раслі кветкі, якія мала радуюць вока, ты не заўважыла, як у тваёй душы вырасла кветка непрыхільнасці да чужых нялюбых кветак. А ад непрыхільнасці ды нязгоды, пагадзіся, адзін крок да таго самага, супраць чаго ты сама і высільвалася...

Хто папікне цябе за гэта? Ды ніхто! Мо толькі ты сама. І толькі тады, калі зразумееш, з чаго вырастае любоў. Любоў вырастае з нянавісці і наадварот. Душа — цёмнае змесціва, і ніхто не ведае, што ў ёй. А ў ёй — самыя дзівосныя кветкі, якія вырасталі калі-небудзь на нашай зямлі — кветкі пяшчоты і ласкі, кветкі дабраты і надзеі, кветкі спагады і чалавечнасці. Але, пагадзіся, што ўсе яны — пакаёвыя кветкі, якім цяжка выжыць, калі побач — больш моцныя, больш дужыя, больш прыстасаваныя да нягод, якім не страшныя ні маразы, ні сухмень, ні наша з табой дабрыня.

Ты не памылілася, цётачка, распазнаўшы, якая кветка гаспадарыць у маёй недасканалай душы. Ты памылілася ў іншым: зброя, якая вынішчае гэткія кветкі, павінна быць зброяй, прымальнай для ўсіх, зброяй, якая не забівае, а толькі ратуе.

Выжыць у вялікім горадзе — умець бараніцца. Але я не карыстаюся зброяй, якая забівае — інакш я даўно быў бы мёртвы. Я карыстаюся зброяй, якую людзі самі аддаюць мне — і якраз таму да іх не прыходзіць бяда або смерць.

А ўчора раніцай ты зрабіла тое самае, што робяць усе: ты аддала мне свой шчыт — сваю зброю, нават не здагадваючыся пра гэта. Калі я ўзбег на Гарбаты масток праз Фантанку, каб праз момант апынуцца на гранітных плітах, што цягнуцца ўздоўж агароджы Летняга саду ад Фантанкі да Лебядзінай канаўкі, я аслупянеў: ты рабіла тое, што я спачатку не мог зразумець. Брукаванка падсохла за ноч пасля ўчарашняга дажджу, а на тратуарчыку з пліт дзе-нідзе засталіся неглыбокія — пальцы ў тры — лужынкі, і ты, адставіўшы ўбок мятлу, голымі рукамі выграбала з іх жоўтае апалае лісце, а затым пакавала яго ў празрысты цэлафанавы мех. Ты ніколі гэтага не рабіла — ты заўсёды карысталася мятлой, зграбаючы лісце ў кучкі, а потым яго забірала машына ці маленькі трактар з прычэпам...

Я не мог спыніцца — не мог чакаць, пакуль ты растлумачыш мне, нашто табе гэта мокрае жоўтае лісце — паўнюткі мех восені.

Я знарок зрабіў так, каб ты не заўважыла мяне — хуценька прабег міма, хутчэй нават, чым заўсёды, не хацеў палохаць цябе, не хацеў перапыняць твайго занятку, не хацеў, каб ты бачыла, што я зазірнуў туды, куды ты мяне не запрашала.

Але за гэты момант, цётачка, пакуль я хаваўся ад цябе, ты і паспела аддаць мне сваю зброю: ужо ў наступнае імгненне я ведаў, чым ты займаешся: цёмныя карэньчыкі маёй так і не знішчанай агіднай кветкі ўмомант падказалі мне, чаму і нашто ты гэта робіш, і я, нібыта наяве, нібыта так яно і было, яскрава ўбачыў, як ты, набраўшы поўны мех лісця, разгінаеш спіну, аддыхваешся, потым нетаропка абводзіш вачыма сваю "дзялку" — ці ўсё прыбрала? — і, уздыхнуўшы, ускідваеш мех на спіну і ідзеш дахаты. Крыху адпачыўшы, высыпаеш мокрае лісце на падлогу, і, калі яно падсыхае, ты разуваешся і басанож ходзіш па ім. Лісце шапаціць пад нагамі, як у лесе, і тады для цябе настае восень, якая ўжо нікому і ніколі не здрадзіць. І ты ўсміхаешся, цётачка. Амаль так, як усміхаецца пераможца: лёгка, радасна і адкрыта. І я згодзен з табой: выжыць у вялікім горадзе — умець бараніцца. А выжыць сярод падобных да цябе — вырваць з коранем агідную кветку нянавісці, што атручвае не толькі душу — атручвае тых, хто побач...

Не спяшайся, цётачка. Хіба гэта перамога? Табе шчэ не раз будзе балюча. Праз тое, што пайшла самым простым, але, даруй, не самым надзейным шляхам: стварыла для сябе восень. Восень не здраджвае — здраджвае тое, што робіць гэту непаўторную пару восенню: лістота жаўцее, а праз нейкі час робіцца падобнай на рудое, струхлелае ад іржы жалезце: на нашых вачах прыгажосць ператвараецца ў тлен.

Не шукай лёгкіх шляхоў: скажы мне лепей, дзе твая дачушка, цётачка? Дзе ты згубіла яе? Ці — не мела ніколі? І праз тое... Але не трэба аб гэтым.

Заўтра — якраз нядзеля. І заўтра, як заўсёды, мы пойдзем з дачушкай на шпацыр — паўз наш Летні сад, бо якраз там яна й вырасла — як была маленькая, мы кожны дзень ездзілі туды і яна спала ў калясцы пад шатамі ліп ды клёнаў. А потым сарвала тут па вясне сваю першую ў жыцці кветачку і — ніхто яе гэтаму не вучыў — пачала абрываць пялёсткі: "любіць — не-любіць", і апошні пялёстак быў "любіць!" Як яна ўзрадавалася тады, хаця і не ведала, чаму ёй так радасна...

Але я ніколі табе пра гэта не расказваў — ты ўладкавалася на гэта месца значна пазней — калі дачушка падрасла...

У суботу і нядзелю ты не ходзіш на працу, адпачываеш, хаця я не веру, што ты сядзіш, склаўшы рукі. Кінь свае хатнія клопаты і прыходзь дзесь у абед на тое месца, дзе мы раней заўсёды бачылі цябе з мятлой. Але прыходзь без яе. Дачушка сказала, што хоча пабачыць цябе...

# Баранавічы

**Баранавічы для мяне — свойскі горад. Там жыве мноства блізкіх і знаёмых мне людзей. Паэты сярод іх — не выключэнне.**

**Даўно знаёмы я, да прыкладу, з Анатолем Станкевічам. І дужа рады, што за той час, як мы з ім не бачыліся, у яго выйшла цікавая таленавітая кніжка вершаў "На крыльях страдающей совести", а сам Анатоль Іванавіч — у наш-то бязмоўны час! — стаў пісаць на сваёй роднай мове. Гэта ж трэба было чалавеку дачакацца першага інтэрнацыянальнага прэзідэнта, рэферэндуму па мове і сімволіцы, каб нарэшце, наперакор прычаканаму, выказаць сваё чалавечае і нацыянальнае Я...**

**Знаёмы я і з самабытным неардынарным паэтам Аляксеем Белым, і з нястомным літаратурным "імпрэсарыо" Алесем Бакачом...**

**Увогуле — у баранавіцкіх адметныя галасы. І не дзіва, што сярод іх вызначаецца патрыятычным напалам голас блізкай сваячкі нашага класіка Алеся Гаруна (Прушынскага) — Браніславы Лапкоўскай (Прушынскай):**

*Свой ведаць род —*
*І гонар родавы...*
*І ручнікі захоўваць*
*І палотны.*
*Знайсці свой герб*
*І прадзеда імя...*

**І вось яшчэ што — у адрозненне ад іншых — у баранавіцкіх і на сённяшні час стае моцы на ўсмешку, сарказм, іронію...**

**Звярніце ўвагу на час нараджэння некаторых аўтараў. Адзін — з 1935, а трое — з 1937...**

**Выжывалі тады, то, з боскай дапамогай, выжывем і цяпер.**

**З удзячнасцю чакаем вершаў з усіх астатніх краёў беларускіх.**

**Л. ГАЛУБОВІЧ**

## Браніслава ЛАПКОЎСКАЯ (ПРУШЫНСКАЯ)

Браніслава ЛАПКОЎСКАЯ (Прушынская) нарадзілася ў 1937 годзе ў Баранавіцкім раёне. Скончыла няпоўную сярэднюю школу і сельскагаспадарчую школу пчаляроў. Працавала ў аўтапарку N 2 г. Баранавічы. Цяпер — на пенсіі. Мае пяцёра дзяцей і многа ўнукаў. Час ад часу друкавалася ў раённых і рэспубліканскіх газетах. Сябра творчага згуртавання "Святліца".

### *Мова*

*Мова наша не згіне,*
*карані — у зямлі.*
*Мову мы не пакінем,*
*яе продкі далі.*

*З мовай нас нарадзілі,*
*з ёю мы падраслі...*
*Людзі!*
*Што ж нарабілі*
*мы на роднай зямлі?!*

*Мова наша, як колас.*
*Мова будзе гучаць.*
*Мова — гэта наш голас,*
*дык не будзем маўчаць!*

## Алесь КОРНЕЎ

Аляксандр КОРНЕЎ нарадзіўся ў 1935 годзе ў Магілёве. Канчаў школу ў Баранавіцкім раёне. Скончыў Мінскі дзяржаўны мед-інстытут. Працаваў доктарам у Мазыры і ў Баранавічах. Друкаваўся ў мясцовым і рэспубліканскім друку. Сябра творчага згуртавання "Святліца".

●

*Мы здаўна жывём на скрыжаванні*
*гістарычных з'езджаных дарог.*
*Мы здаўна — трывалыя славяне,*
*з намі ўпэўненасць і з намі Бог.*

*Хай на нас накатваліся хвалі*
*разнамоўныя з усіх бакоў —*
*гонар мы і годнасць захавалі*
*цягам многіх здрадніцкіх вякоў.*

*Я і зараз мову, як святыню,*
*дзе б і з кім не жыў бы, берагу.*
*Хіба лёс яе, як лёс латыні?*
*Пагадзіцца з гэтым не магу.*

*Мы пакуль яшчэ не магікане —*
*наматайце, спадары, на вус!*
*Не чакайце вы, што ў Лету кане*
*велічны апошні беларус.*

## Анатоль СТАНКЕВІЧ

Анатоль СТАНКЕВІЧ нарадзіўся ў 1937 годзе ў Ляхавіцкім раёне. Рана застаўся без бацькоў. Скончыў Слонімскае рамеснае вучылішча чырванадрэўшчыкаў. Друкаваўся ў рэспубліканскім друку. У 1996 годзе выдаў зборнік вершаў на рускай мове "На крыльях страдающей совести". Працуе на Баранавіцкім станкабудаўнічым заводзе "Атлант" сталяром. Народны ўмелец. Сябра творчага згуртавання "Святліца".

●

*Прачытаўшы аб'яву —*
*"Прадаецца сабака..."*
*Я здзівіўся:*
*які прыгожы почырк*
*у гэтага чалавека.*
*як ён старанна*
*выводзіў*
*кожную літару*
*здрады...*

## Якаў ШУТОВІЧ

Якаў ШУТОВІЧ нарадзіўся ў 1963 годзе ў Баранавіцкім раёне. Скончыў Ваўкавыскае педагагічнае вучылішча. Працуе настаўнікам Застарынскай базавай школы. Піша пераважна гумарыстычныя творы. Друкаваўся ў раённых і абласных газетах.

### *Пра жонку, мужыка і першага красавіка*

*Веснавое сонца свеціць.*
*Раніца. Птушыны крык.*
*Каб ніхто не запрыкмеціў, —*
*Сунецца дамоў мужык.*

*— Дзе ты быў? — пытае жонка.*
*— Я?.. — Ну што тут адказаць?*
*І падумаў, як спрасонку, —*
*Можа жонцы змахляваць?..*

*Але ж тая — што пачвара —*
*Ўсё сумее распазнаць.*
*Здагадаецца па твары,*
*Лепей праўду ёй сказаць.*

*— У суседкі быў я, Ганна,*
*Правялі цудоўна ноч.*
*Хвалявалася ты марна. —*
*Лепш сыдзі з маіх ты воч.*

*І падумала Гануля,*
*Зіркнуўшы на мужыка:*
*Хай сабе ён пажартуе*
*Ў першы дзень красавіка.*

## Аляксей БЕЛЫ

Аляксей БЕЛЫ нарадзіўся ў Івацэвіцкім раёне. З шаснаццаці гадоў працаваў на Поўначы. Быў карэспандэнтам і рэдактарам мясцовых баранавіцкіх газет. Выдаў дзве кніжкі вершаў. Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу аднаго верша, прысвечанага Паўлюку Багрыму. Сябар творчага згуртавання "Святліца".

●

*Зноў салодкай стала цыгарэта.*
*Прасціна — скамечанай паперай.*
*Надышла пара вяртацца з лета.*
*Шчыльна ў лета зачыняю дзверы.*

*Звяруць і рамонкі і валошкі,*
*Не ўратуе болей іх адліга.*
*І замест жанчыны ў маім ложку*
*Зноў ляжыць разгорнутая кніга.*

## Марк ЛАНЦМАН

Марк ЛАНЦМАН нарадзіўся ў Гомелі ў 1937 годзе. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў агранамам у калгасах Баранавіцкага раёна. Цяпер — на пенсіі. Друкаваўся ў раённых газетах.

### *"Немцы" ў хаце*

Жарт

*Гэта — не нацыя такая,*
*мы гэтак жонак называем,*
*як тыя ў злосці сціснуць зубы,*
*ды так, што мову нават згубіш.*
*Ці ж многа трэба той прычыны,*
*каб разлавалася жанчына?*
*Не тое скажаш, не так ступіш —*
*надзьмецца, быццам мыш на крупы.*
*А ўжо як чарку напаткаеш —*
*на тыдзень мову адымае...*

*А чуюць як, о Божа мілы!*
*Яшчэ на ганку боты мыеш —*
*у хату ўвойдзеш ціха, бокам —*
*а ўжо глядзяць шалёным вокам,*
*ды апускаюць нізка бровы,*
*здаецца, што парваць гатовы...*

*Прыйшоў цвярозы ты дахаты,*
*адразу — дровы, парасяты,*
*карова, сечка, агарод*
*ды іншых тысяча работ...*
*А як нап'ешся, бы свіння, —*
*святая ў хаце цішыня...*

*Адно аднога разумеем.*
*Без слоў распазнаваць умеем:*
*як сумны ды маўклівы, браце,*
*відно адразу — "немцы" ў хаце.*

## Алесь БАКАЧ

Алесь БАКАЧ нарадзіўся ў 1962 годзе ў Баранавічах. Скончыў Маладзечанскі палітэхнікум і Беларускі дзяржаўны інстытут фізкультуры. Працуе інструктарам фізкультуры ў экалагічнай гімназіі N 3 г. Баранавічы. Друкаваўся ў шматлікіх рэспубліканскіх выданнях. Ініцыятар стварэння творчага згуртавання "Святліца".

### *Анёл Пагоня*

*Крыжы і чаркі зблытаў мой народ.*
*Ці не таму наўкол нялад і скруха,*
*Што крывадушнасць нас вядзе на звод?*
*Зацменне духа...*

*Анёл Пагоня мечам паказаў*
*Дарогу, непадзельную надвое.*
*Адзіны шлях збавення й волі даў —*
*Святога воя!*

*Не жах раба прад караю нябёс,*
*Не ўзнагароды найміцкай дамова -*
*Нанова, зоркай асвяці нам лёс,*
*Любоў Хрыстова!*

## Дзмітрый ТУКАЙ

Дзмітрый ТУКАЙ нарадзіўся ў 1955 годзе ў г. Баранавічы. Інжынер-будаўнік. Першы верш надрукаваў толькі ў 1995 годзе. Сябра творчага згуртавання "Святліца".

### *Спазненне*

*Скуголіць ключ у чэраве замка,.*
*Пяюць завесы, быццам пеўні ўранку...*
*О, як даўно не песціла рука*
*Рудую ад іржы дзвярную клямку...*

*Бадылле ад нячэпанай травы*
*Збуяла ўсцяж —*
*ад веснічак да ганку —*
*І шэпт касы бадзёра-дзелавы*
*Даўно не чуўся летняму світанку.*

*У тлуме дзён усё няма калі*
*Згадаць пра сэнс жыцця ці прыпыніцца,*
*Прыйсці туды, дзе цягнуцца з зямлі*
*Ад продкаў карані. І не спазніцца.*

*А я спазніўся, даючы нырца*
*У дзён сваіх вірлівую трасянку...*
*Скуголіць ключ у чэраве замка,*
*Пяюць завесы, нібы пеўні ўранку.*

## Памяці пачынальніка

100-годдзю з дня нараджэння Рыгора Кобеца, вядомага нашага драматурга і сцэнарыста, заснавальніка нацыянальнага кіно, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі з 1935 года, быў прысвечаны вечар у Саюзе пісьменнікаў. Уступным словам свята адкрыла Вольга Іпатава. А вяла вечар дачка юбіляра, пісьменніца А. Кобец-Філімонава.

Пра кінематаграфічную дзейнасць Р. Кобеца цікава апавядаў доктар мастацтвазнаўства А. Красінскі, прыгадаўшы яго лепшыя кінатворы ("Шукальнікі шчасця", "Двойчы народжаны", "Дняпро ў агні"). Дарэчы, фільм "Двойчы народжаны" таксама аказаўся юбілярам: сёлета споўнілася 65 гадоў першай гукавой і першай на беларускай мове кінастужцы, якая стала этапнай у гісторыі беларускага кіно.

Пра жыццёвы шлях і тэатральную драматургію Р. Кобеца распавяла мастацтвазнаўца Л. Лявонава, прыгадала вялікі поспех п'есы Р. Кобеца "Гута" ў пастаноўцы БДТ-І (тэатр імя Я. Купалы) на першай усесаюзнай алімпіядзе мастацтваў у Маскве ў 1930 годзе, гаварыла аб праследаванні Р. Кобеца ў гады сталінска-берыеўскага таталітарнага рэжыму.

Супрацоўніца музея Я. Купалы Н. Каралюк у сваім слове адзначыла, з якой вялікай цеплынёй і любоўю да народнага паэта Я. Купалы напісаны Р. Кобецам успаміны "Купалава ноч", якія экспанаваліся на выстаўцы, калі музей Я. Купалы таксама святкаваў 100-годдзе з дня нараджэння Р. Кобеца.

Ад А. Кобец-Філімонавай прысутныя даведаліся аб тым, што Р. Кобец, нягледзячы на імперыялістычную і грамадзянскую войны, у якіх прымаў удзел з чатырнаццаці гадоў, усё ж паспеў атрымаць веды ў земскім рэальным вучылішчы г. Елісаветграда, у якім вучыліся і такія сусветнавядомыя творцы, як А. Таркоўскі, Г. Нейгаўз, а таксама паэт Д. Бедны, драматург Ю. Яноўскі і іншыя.

Запрошаныя на вечар мелі магчымасць паглядзець сцэну з камедыі Р. Кобеца "На заставе", якую з бліскучым гумарам выканалі артысты тэатра імя Я. Купалы — народная артыстка Беларусі Л. Давідовіч, артысты С. Краўчанка і У. Любецкі (на здымку).

Вельмі пранікнёна прагучалі вершы (пісьмы дзецям) Р. Кобеца, напісаныя ў лагеры і ссылцы, а таксама ўрывак з аповесці "Ноеў каўчэг" (аб лагеры, у якім адбываў дзесяцігадовы тэрмін палітэк Р. Кобец) у выкананні народнага артыста Беларусі П. Дубашынскага.

Вясёлае ажыўленне выклікала выступленне кампазітара В. Сярых, якая пад акампанемент раяля праспявала знакамітую песню з к/ф "Шукальнікі шчасця", ёй падпявала ўся зала.

Напрыканцы вечара гледачы паглядзелі фільм "Шукальнікі шчасця" (фрагменты), які віталі (у каторы раз!) апладысментамі.

У бібліятэцы Дома літаратара была адкрыта цікавая выстаўка (арганізатар-загадчыца бібліятэкі Г. Ульянская), прысвечаная жыццёваму і творчаму шляху юбіляра.

**А. МАКСІМАВА**

## Прысвечаны БНР

Конкурс рэфератаў пра Беларускую Народную Рэспубліку, зладжаны па ініцыятыве мясцовай філіі маладзёжнай арганізацыі "Грамадзянскі форум", быў праведзены ў школах Гомеля і Светлагорска.

Імпрэза па выніках конкурсу прайшла ў 56-ай гомельскай школе-ліцэі, дзе беларускую мову і літаратуру выкладае былы воін-інтэрнацыяналіст Сяргей Несцяровіч. Навучэнцы менавіта гэтай школы паказалі найлепшыя веды па азначанай тэме. Вылучыліся і некалькі вучняў 10-ай гомельскай сярэдняй школы з англійскай мовай навучання.

У якасці прызоў пераможцы конкурсу і аўтары найбольш цікавых рэфератаў атрымалі бібліятэчкі беларускай кнігі, якія ўручыў віцэ-прэзідэнт "Грамадзянскага форуму" Алесь Карніенка...

**А.МЕЛЬНІКАЎ**

ЧЫТАННІ

# Пятыя, Свята-Еўфрасіннеўскія...

У Мінску адбыліся педагагічныя чытанні, арганізаваныя Беларускай праваслаўнай царквой, Міністэрствам адукацыі, Цэнтрам праваслаўнай асветы святой Еўфрасінні Полацкай. У чытаннях прынялі ўдзел больш як 350 педагогаў сістэмы дашкольнай і школьнай адукацыі, прафесійнай і вышэйшай школы. На пленарных паседжаннях заслухана 14 дакладаў, на секцыйных — 55.

У прывітальным слове Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта гаварылася: "Вельмі важна, што на чытаннях сумесна працуюць і знаёмяцца прадстаўнікі як свецкай, так і царкоўнай адукацыі. Гэта дазваляе ім узбагаціцца вопытам, пераняць лепшае, знайсці агульную мову".

Што прыярытэт у школе павінен аддавацца традыцыйным хрысціянскім каштоўнасцям, адзначалася ў выступленнях намесніка міністра адукацыі Г.Дыляна, намесніка міністра культуры У.Рылаткі, пісьменніцы Марыі Філіповіч і многіх іншых.

Падпалкоўнік Галоўнага ўпраўлення ўнутраных войск А.Каспярук назваў праваслаўе апорай, здольнай стрымліваць імкненне да нажывы, чалавечы эгаізм і ўседазволенасць. "Мы шукаем адказу на нашы пытанні ў вечных ісцінах рэлігіі. Бо "ідэя нацыі ёсць не тое, што яна сама думае пра сябе ў часе, але тое, што Бог думае пра яе ў вечнасці" (Ул.Салаўёў)".

Святар з Лунінца Васіль Туміловіч пазнаёміў прысутных з вынікам шматгадовых даследаванняў — адкрыццём забытай праваслаўнай пісьменніцы Соф'і Прорвіч. Нарадзілася яна на Палессі, адукацыю атрымала ў С.-Пецярбурзе, памерла на Украіне ў Пачаеўскім манастыры. Цікава, што з лістапада 1911-га па сакавік 1912-га ў Лунінцы на кватэры ў дачкі пісьменніцы жыў Якуб Колас. Несумненна, яны былі знаёмыя. Сям'ю Прорвічаў лёгка пазнаць на старонках трылогіі "На ростанях", дзе апісаны і айцец Мікалай са слядамі мазалёў на руках ад цяжкай працы, і "трохі чопарная маленькая матушка".

У выступленнях адзначалася, што супрацоўніцтва дзяржавы і царквы сталі пазітыўнай тэндэнцыяй, якую варта замацоўваць. Прагучалі прапановы наконт неабходнасці распрацоўкі канцэпцыі царкоўнапрыходскіх школ. Меў рэзананс "круглы стол", прысвечаны праблемам духоўнага і цялеснага здароўя чалавека.

На жаль, у многіх дакладах і выступленнях на пятых свята-Еўфрасіннеўскіх чытаннях такія паняцці, як "патрыятызм", "культурна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці", не былі напоўнены канкрэтным зместам. Пераважалі агульныя фармулёўкі, глеба, на якой існуе ў нас праваслаўе, абазначана не была. Слова "беларускі" ўвогуле стараліся не вымаўляць. Усё гэта сведчыць пра размытасць, няпэўнасць светапоглядных асноў як арганізатараў, так і ўдзельнікаў чытанняў. Гэта тым больш дзіўна, бо яны — пятыя...

*Адно з выступленняў — настаўніцы Навасельскай СШ Барысаўскага раёна — нам падалося вартым увагі нашых чытачоў.*

# Якімі яны стануць?

Наша грамадства хварэе. З гэтым згодны амаль усе. А прычыну хваробы кожны называе па-рознаму.

Адны бачаць яе ў эканоміцы, другія — у справах непрадбачлівых палітыкаў і кіраўнікоў, трэція — у знешніх прычынах.

Але ці кожны зазірае ў сваю душу, аналізуе тыя каштоўнасці, па якіх жыве? Аказваецца, патрэбны лекі і нашаму сумленню, нашай душы.

У сферы маралі ўтварыўся вакуум. Неабходна ідэя, якая б згуртавала народ, садзейнічала б яго духоўнаму ўзбагачэнню. Выканаць гэта можа ідэя нацыянальнага адраджэння. Разуменне сутнасці нацыянальнай ідэі — самае важнае ў духоўным выхаванні чалавека.

Сёння існуе некалькі канцэпцый і рэспубліканскіх праграм выхавання, вядзецца распрацоўка праекта дзяржаўнай праграмы "Выхаванне".

Апошнія гады назіраецца ўсплеск цікавасці да рэлігіі і яе свяшчэнных кніг. Многія сем'і маюць Біблію, адкрываюцца нядзельныя школкі, у якія з задавальненнем ходзяць дзеці.

Здаўна жыццё беларуса праходзіла ў цесным адзінстве з праваслаўнай царквой, якая выхоўвала і выхоўвае зараз у людзей такія якасці, як любоў да бліжняга, пачуццё міласэрнасці, здольнасць пераносіць асабістыя невыгоды дзеля другіх людзей, любоў да Радзімы.

Прайшоў час руйнавання храмаў, праследавання людзей за веру ў Бога. Настаўнікі помняць той час, калі яны баяліся наведаць могілкі на Радаўніцу, пахрысціць немаўлятка. Прайшоў час, калі ад нас, настаўнікаў, патрабавалі ўключаць у план выхаваўчай работы раздзел пад назвай "Атэістычнае выхаванне".

У падручнікі беларускай літаратуры ўвайшлі біблейскія казанні, летапісы, "Жыціі", "Словы", "Прытчы", "Павучанні" пра Рагвалода і Рагнеду, Усяслава і святую Еўфрасінню, творы Кірылы Тураўскага, Францішка Скарыны, Міколы Гусоўскага. Як адзначана ў падручніку для 10 класа пад рэдакцыяй В.Ляшук, на нас глядзяць іх вочы, "глядзяць уважліва і дапытліва: каб не забыліся, не выракліся таго спрадвечнага, што ёсць для кожнага Бог, Праўда, Радзіма".

Школа і праваслаўная царква аднолькава зацікаўлены сёння ў выхаванні чалавека духоўна багатага, чалавека-патрыёта. А пытанне "Традыцыі хрысціянскай духоўнасці і маралі ў беларускай літаратуры" зусім не даследавана. Бываюць, праўда, калі-нікалі ў часопісе "Роднае слова" распрацоўкі асобных урокаў. Настаўнікі ўдзячны за метадычныя парады па вывучэнні біблейскіх легенд у 5-м класе, якія змешчаны ў верасні 1996г. на старонках "Настаўніцкай газеты". Таму і даводзіцца настаўніку вывучаць гэту праблему самому. Асабіста я на ўроках, прысвечаных Бібліі, выкарыстоўваю і іншыя матэрыялы. Рэкамендую вучням чытаць апавяданні з "Дзіцячай Бібліі". Завітала на ўрок і кніга Уладзіміра Ліпскага "Як Бог стварыў свет". Яна ўяўляе сабой пераказ некаторых біблейскіх гісторый. Божыя запаведзі пададзены пісьменнікам даступна, з улікам сённяшніх праблем жыцця.

Вельмі важнай у выхаванні патрыятычнага пачуцця з'яўляецца "Песня пра зубра" Гусоўскага. Гэта роздум сапраўднага грамадзяніна аб гістарычным лёсе Беларусі:

*Вораг страшэнны адольвае нас*
*і зламысна*
*Рэжа пад корань наш род*
*і вучэнне Хрыстова*
*Ў душах народаў*
*на ўсіх заняволеных землях...*

Істотнай адзнакай твора з'яўляецца яго антываенны характар. У войнах аўтар-гуманіст бачыў адну з важнейшых прычын няшчасцяў і пакут радзімы, народа:

*Войны! Злачынная справа —*
*вайна выклікае*
*Гнеў мой, і слёзы, і боль...*

Перад класам стаўлю пытанні, даю заданні:

— Чаму гінуць тысячы нявінных душ?

— Дакажыце, што паэма "Песня пра зубра" — твор высокапатрыятычны.

— Зачытайце малітву да Маці Божай.

— Як характарызуе паэт Дзеву Марыю?

— Чаму паэт вырашыў звярнуцца менавіта да яе?

Вучні гавораць, што Гусоўскі называе Дзеву Марыю "міласэрнай, добрай маці, першай заступніцай люду" і звяртаецца да яе таму, што ўжо ні на кога не спадзяецца. Толькі маці-заступніца, маці Божая зможа стаць "загародай на бітых шляхах і гасцінцах" дзеля сваіх дзяцей. Паэт-патрыёт просіць Дзеву Марыю:

*...вярні раўнавагу*
*Мудрых дзяржаўцаў,*
*напомні пра іх абавязкі,*
*Гэтак злачынна забытыя,*
*— карай напомні!*
*...Ім без твайго настаўлення,*
*прамудрая дзева,*
*Думка не прыйдзе,*
*што трэба за розум узяцца,*
*Дзе ім убачыць з харомаў,*
*як з хатак вясковых*
*Гоняць бічамі галоту*
*ў палон на пакуты!*

Звяртаецца ўвага і на тое, што "Песня пра зубра" — гэта твор, які не страціў сваёй актуальнасці і сёння.

Так, літаратура эпохі Сярэднявечча багатая на духоўныя і патрыятычныя творы. Нездарма рускі гісторык і раманіст Валянцін Пікуль сказаў пра сярэднявечную Беларусь: "Калі б беларусы змаглі прыўзняць гістарычную заслону мінулага, то іх захапленне сваёй Радзімай было б настолькі вялікае, што свае гістарычныя цэнтры-гарады Полацк і Наваградак яны паставілі б паводле гістарычнага рэйтынгу і ўплыву ў Еўропе на першае месца ў XI—XV стагодзях".

Выдатнае веданне Бібліі, старабеларускіх летапісаў, жыціяў, хаджэнняў засведчыў Уладзімір Караткевіч у шматлікіх сваіх творах: "Каласы пад сярпом тваім", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Цыганскі кароль", "Ладдзя Роспачы", у многіх вершах.

У "рамане Каласы пад сярпом тваім" ставяцца такія жыццёвыя пытанні, якія спрадвеку хвалююць людзей: гэта месца чалавека ў гістарычным працэсе, цесная сувязь часу і гістарычных пераемнасцей, гэта пошукі чалавекам свайго месца на зямлі.

Адкрываем першую кнігу рамана — "Выйсце крыніц", чытаем эпіграф, узяты з кнігі Свяшчэннага пісання:

*Увечары вы кажаце: будзе пагода,*
*бо неба чырвона;*
*А ўранні: сёння непагадзь,*
*бо неба пахмурнае.*
*Крывадушнікі!*
*Аблічча неба распазнаць умееце,*
*А знаменій часу не можаце?*

Аналізуем філасофскі сэнс гэтага эпіграфа.

Чытаем раман. А на заключным уроку прыходзім да высновы, што галоўны герой Алесь Загорскі жыве па такіх маральных прынцыпах, якія напамінаюць запаведзі з Бібліі. Чуйны Алесь Загорскі адкрывае сваю радзіму, сваю Беларусь.

Прадаўжальнікамі справы У.Караткевіча ў нашай літаратуры з'яўляюцца пісьменнікі Уладзімір Арлоў, Леанід Дайнека, Вольга Іпатава, Вітаўт Чаропка, іншыя творцы.

Ідэі хрысціянства, яго сімвалы, пошукі героямі сэнсу жыцця — вечныя тэмы лепшых беларускіх пісьменнікаў. Галоўным роздумам аб жыцці напоўнены творы сучаснай паэзіі. Вучні любяць чытаць вершы Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Сяргея Законнікава. Хрэстаматыйнымі сталі вершы Р. Барадуліна "Трэба дома бываць часцей" і Генадзя Бураўкіна "Прыязджайце дадому!"

Паэтаў хвалююць родны дом, карані. У вершы Г.Бураўкіна "Малітва" гучаць тыя ж матывы, што і ў малітве да Дзевы Марыі Гусоўскага:

*Божа,*
*Адвядзі ад Беларусі*
*Здраду,*
*Вераломства і вайну.*
*Смутнаю парою нелюдзімай,*
*Калі ўсё вакол ідзе на злом,*
*Божа,*
*Захіні маю Радзіму*
*Мудрасцю,*
*Спакоем і цяплом.*

У цяжкі для Радзімы час паэт звяртаецца да Бога. Такія словы мог напісаць толькі чалавек, улюбёны ў родную зямлю, у яе людзей.

Многа набалелых праблем жыцця паставіў

Ніл Гілевіч у рамане "Родныя дзеці". У раздзеле "Бацькоўскі кут" галоўны герой твора Сцяпан ідзе на могілкі, дзе ставіць пытанні-разважанні сабе і чытачу:

***Чаго мы ходзім на магілы?***
***Чаго ідзём?***

І адказы дае зноў жа пытаннямі:

***Паплакаць горка?***
***Паспавядацца? Клятву даць?***
***Ці, можа, з гэтакіх пагоркаў***
***Сваё жыццё нам лепш відаць?***

***Свой шлях — у пошуках і ўдачах,***
***У заблуджэннях і грахах?***
***Ці ў гэткі час ясней мы бачым***
***Радзімы-Бацькаўшчыны шлях?***

Ці будзе памятаць маладое пакаленне сваіх бацькоў, ці будзе наведваць могілкі, бо сёння нярэдка ўжо не помняць дзеці і жывых бацькоў...

Хачу сказаць і аб творчасці тых, каго мы вучым, аб творчасці вучняў. Я маю на ўвазе кнігу "След чорнага ветру". Рэдактар-складальнік гэтай кнігі — пісьменнік Васіль Якавенка. У кнізе змешчаны лепшыя сачыненні школьнікаў Беларусі, дасланыя на конкурс "Чарнобыль у маім лёсе". У школьнай праграме гэта кніга не значыцца, але ж настаўнік можа выкарыстаць яе на ўроку пазакласнага чытання напярэдадні 26 красавіка. Гэты дзень стаў Днём Памяці пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы. В. Якавенка піша, што дзеці — сведкі чарнобыльскай аварыі загаварылі збалелым і мудрым голасам.

Калі чалавеку цяжка, ён заўсёды ўспамінае Бога і маці. Як часта мы чуем ад людзей: "О Божа!", "Божа ты мой!", "Дай жа, Божа" або "Не дай ты, Божа!". Так і ў кнізе "След чорнага ветру" ўспамінаюць Бога, аналізуюць прычыны бяды, складаюць Богу малітву-просьбу.

Вось малітва, складзеная Таццянай Акулевіч, вучаніцай 10-га класа Калінкавіцкай СШ N 6. "Хачу пачуць, Усявышні, за што пакараў ты маю шматпакутную зямлю-матухну. Чым яна правінілася перад табой?.. Я абяцаю табе, Божа, маліцца кожны дзень за ўсіх, каго люблю, паважаю, толькі пачуй мой плач, выратуй маю зямлю, маю Бацькаўшчыну. Няхай свеціцца імя тваё, Усявышні, дзень і ноч, ахоўваючы нас, тваіх дзяцей, накіроўваючы на правільны шлях, аберагаючы ад спакусы, даючы жыццёвыя сілы і мудрасці. Ратуй нас, Божа!" Жудасна гучаць словы-зварот да Бога Ніны Лагоды, вучаніцы 11-га класа Стара-Высоцкай СШ Ельскага раёна: "Божа, літасцівы Божа, а я ж хачу жыць, кахаць і быць каханай! Я не хачу горкіх слёз, невычэрпнага гора. Я не хачу бачыць цёмныя вокны. Я ненавіджу словы: "чорны", "чарната", "Чарнобыль"!"

Страшным, але справядлівым адказам на пытанне, за што пакараў Бог зямлю нашу, з'яўляецца сачыненне "Знак бяды". Яно напісана Вікторыяй Гацуковай, вучаніцай 11-га класа ліцэя N 56 г.Гомеля: "Наша вёска старажытная, бо, як казаў мне мой дзед, а яму — яго дзед, прыкладна ў 1590 годзе на тым месцы, дзе потым з'явілася яна, пасяліўся ксёндз, які ўцякаў ад інквізіцыі. Прыкладна ў 1612 годзе ён пабудаваў касцёл. Пасля яго смерці касцёл перабудавалі ў праваслаўную царкву. Яе наведвалі людзі з трыццаці вёсак, бо паблізу ніякай іншай не было. Ішоў час, мянялася жыццё, і ў 1937 г. царква была зруйнавана, А ці не гэта вытокі нашай агульнай бяды?

Не ведаю, якім цудам, але ў нас захавалася ікона з гэтай царквы, старая, з невялічкімі расколінкамі, з адбіткам няўмольных гадоў, учарнелая, але з пранікліваым абліччам і з нязгасным святлом мудрых вачэй Міколы Цудатворца".

Потым дзяўчына расказвае, як меліяратары знішчылі рэчачку, а потым прыгожы маёнтак пана ператварылі ў вінакурню. Неаднойчы чыніўся здзек над гэтай зямлёй. "Мабыць, і сапраўды Бог пакараў людзей за тое, што яны не берагуць свае карані, сваю Бацькаўшчыну, а, наадварот, здзекуюцца з усяго гэтага".

Вось так аўтары сачыненняў усведамляюць сябе грамадзянамі, даюць адказы на злабадзённыя пытанні жыцця.

Беларуская літаратура мае багатыя магчымасці па выхаванні дзяцей на традыцыях хрысціянскай маралі. Сённяшнія вучні будуць жыць у 21-м стагоддзі. Якімі яны стануць? Добрымі, спагадлівымі ці людзьмі-робатамі? Многае тут залежыць ад намаганняў школы і царквы.

**Ала КАМОСКА**

# Леанід ПРАКОПЧЫК

7 снежня 1998 года памёр член Саюза беларускіх пісьменнікаў Леанід Пракопчык.

Леанід Цімафеевіч Пракопчык нарадзіўся 14 лістапада 1933 года ў Мінску ў сям'і служачага. У 1958 годзе скончыў Ціміразеўскую сельскагаспадарчую акадэмію і атрымаў спецыяльнасць агранома. Працаваў матросам на рыбалоўным флоце, брыгадзірам паляводчай брыгады, аграномам на Міншчыне, выкладаў нямецкую мову ў Красненскай сярэдняй школе ў Маладзечанскім раёне. Пэўны час быў літсупрацоўнікам газет "Калгасная праўда" і "Знамя юности", рэдактарам на Беларускім тэлебачанні.

Друкавацца Л. Пракопчык пачаў з 1952 года. Першыя нарысы і апавяданні з'явіліся ў выданнях "Московский комсомолец", "Юный натуралист", "Вокруг света". Л. Пракопчык — аўтар кніг нарысаў "Даўгінаўскія вёрсты", "Ёсць у сэрцы запаветны куток", "Адкуль у вёскі імя", "В краю Налибокской пущи", "Дрэмле памятка дзён", а таксама некалькі п'ес. Быў вядомы і як аўтар шэрагу кінасцэнарыяў, па якіх створаны кінафільмы.

Л. Пракопчык любіў родную зямлю і таленавіта, займальна пісаў пра яе гісторыю і сённяшні дзень. Яго кнігі, адрасаваныя юным чытачам, значна папоўнілі бібліятэку краязнаўча-пазнавальнай літаратуры.

Светлы вобраз Леаніда Пракопчыка назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто яго ведаў, працаваў з ім.

**Саюз беларускіх пісьменнікаў**

УГОДКІ

# У сваім часе

## ДА 100-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Мікалая АЛЯКСЕЕВА

Да падзей рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, як і да тых, што ішлі ўслед за імі, нам яшчэ звяртацца неаднойчы. Асэнсоўваючы і пераасэнсоўваючы іх, заглыбляючыся ў сутнасць таго, што некалі замоўчвалася,і адмаўляючы многае, што раней ухвалялася. Кажучы "нам", я маю на ўвазе не толькі тых, хто жыве сёння, а і наступнікаў, бо тое, што адбывалася на пачатку стагоддзя, ніколі не кане ў Лету, як бы таго каму-небудзь ні хацелася. Іншая справа, наколькі быць прытым аб'ектыўным, а аб'ектыўнасць немагчыма і без прыцягнення ўспамінаў тых, хто ў гэты складаны, грозны і ў многім непрадказальны час мужаў, гартаваўся, выбіраў сваё месца ў жыцці. Канечне, іхнія згадкі ў чымсьці носяць суб'ектыўны характар, ды ў рэшце рэшт гэта тычыцца ўсіх мемуараў. Тым не менш асноўнае ў іх вартае ўвагі, асэнсавання, неаднаразовага прачытання.

Гэта тычыцца і напісанага рускім празаікам, які звязаў лёс з Беларуссю, Мікалаем Аляксеевым. У аднолькавай ступені і яго ўспамінаў, і празаічных твораў — найперш раманаў, а таксама аповесцяў, бо ўсе гэтыя творы не толькі народжаны фантазіяй аўтара. У іх адчувальная дакументальная аснова, прысутнасць якой часам, магчыма, і залішняя, што не можа не прыводзіць да пэўных мастакоўскіх выдаткаў. І ва ўсіх творах М. Аляксеева, незалежна ад іх жанру, моцна дае знаць аб сабе дыханне часу, у якім пісьменнік працаваў.

"Я рос разам з рэвалюцыяй", "Салдат рэвалюцыі" — так гаварыў ён пра сябе неаднойчы, калі даводзілася выступаць перад чытачамі, а рабіць гэта Мікалай Іванавіч любіў, асабліва ў вайсковых часцях, бо М. Аляксееў быў не толькі пісьменнікам, а і генерал-маёрам інжынерных войск у запасе.

Згаданыя вышэй прызнанні прагучалі і ў друку: першае — 6 мая 1977 года на старонках "ЛіМа", другое - у другім нумары часопіса "Полымя" за 1978 год, калі пад такой назвай былі змешчаны ўспаміны М. Аляксеева. І ён не крывіў душой, не ставіў перад сабой, так сказаць, палітычнай мэты, чым, будзем справядлівымі, грашылі многія літаратары, калі пісалі штосьці публіцыстычнае. Асабліва да розных юбілейных дат. А гэтыя дзве публікацыі, як няцяжка здагадацца, рыхтаваліся ў сувязі з 70-годдзем кастрычніцкай рэвалюцыі.

Мікалай Аляксееў сапраўды — "родам" з рэвалюцыі. Нарадзіўся 17 снежня 1898 года ў Пецярбурзе, дзе яго бацька, выхадзец з Ноўгарадскай губерні, працаваў дворнікам. Але бацька рана памёр, маці была кухаркай. У пяцігадовым узросце яна аддала сына сваякам мужа, а тыя, каб дарма не еў хлеб, прымусілі працаваць па гаспадарцы. Праўда, не забыліся і аб вучобе. Зімой хлопчык наведваў вясковую школу — жылі сваякі М. Аляксеева ў сяле Рудна тагачаснага Гдоўскага павета.

Зведаў М. Аляксееў, што такое праца пастухом ды і іншыя вясковыя справы не абыходзіліся без яго. Магчыма б, і застаўся на вёсцы, калі б не дзядзька, які жыў у сталіцы. Той вырашыў, што будзе лепш, калі пляменнік авалодае якой-небудзь рабочай спецыяльнасцю. Так М. Аляксееў у дзесяць гадоў стаў вучнем, пазней падручным электраманцёра. Пасля і сам працаваў электраманцёрам у розных электратэхнічных канторах Пецярбурга, на трыкатажнай фабрыцы "Керстэн". А неўзабаве яго як ваеннаабавязанага ўзялі на вядомы Абухаўскі сталеліцейны завод.

Салдацкі шынель апрануў у жніўні 1915 года. На фронце быў цяжка паранены. Там жа зблізіўся з рэвалюцыйна настроенымі салдатамі і афіцэрамі, пазнаёміўся з нелегальнай літаратурай. У час лютаўскай рэвалюцыі, прымкнуў да бальшавікоў. Прымаў удзел у дэманстрацыях 1917 года, не застаўся ўбаку і ад падзей кастрычніцкай рэвалюцыі. Але ў адрозненне ад многіх таварышаў, хто пасля яе адразу вызначыў свой далейшы шлях, дэмабілізаваўся, зноў пачаў працаваць па спецыяльнасці, гэтым разам на тармазным заводзе "Вестынгауз" у Пецярбурзе.

Канчаткова жыццё Мікалая Іванавіча перайначылася ў кастрычніку 1918 года, калі яго прызвалі ў Чырвоную Армію. Тады і здагадацца не мог, што з невялікімі перапынкамі аддасць ваеннай службе сорак гадоў, прайшоўшы шлях ад радавога байца да генерал-маёра. Ваяваў на франтах грамадзянскай — на Карэльскім, на Пскоўскім супраць войск Юдзеніча, з войскамі Пілсудскага. Скончыў Акадэмічныя курсы вышэйшага каманднага саставу пры Ваенна-інжынернай акадэміі. Давялося ўдзельнічаць у баях на возеры Хасан. А пасля — Вялікая Айчынная вайна, у час якой быў начальнікам аддзела кадраў Заходняга і 3-га Беларускага франтоў. У запас звольніўся ў 1958 годзе з пасады начальніка Далёкаўсходняга суворaўскага вучылішча.

Такая багатая біяграфія сама па сабе падказвала тэмы будучых твораў. І Мікалай Іванавіч у 1939 годзе ўзяўся за пяро. Але сталым пачаткам літаратурнай дзейнасці М. Аляксеева ўсё ж трэба лічыць 1946 год, калі ў Маскве выйшаў асобнай кнігай раман "Яков Железнов". У галоўным героі твора ў многім угадваецца сам аўтар. Лёс Жалязнова паўстае ў перыпетыі самых складаных сітуацый, што мелі месца ў сапраўднасці. У найбольшай ступені гэта тычыцца рэвалюцыйных падзей, адлюстроўваючы якія М. Аляксееў дасягнуў асаблівай пераканаўчасці, паказаўшы, як салдаты штурмавалі Зімні палац, упэўненыя, што толькі са звяржэннем царызму і ўлады тых, хто прадаўжаў яго палітыку, наступіць жаданае шчаслівае жыццё. Дарэчы, урывак з гэтага рамана пад назвай "Штурм Зімняга", быў апублікаваны 1 сакавіка 1946 года ў газеце "Сталинская молодежь" (сённяшняя "Знамя юности").

З вышыні сённяшняга стаўлення да тых даўніх і, безумоўна, усё ж гістарычных падзей, у рамане можна знайсці і пэўную палітычную зададзенасць. Ды кожны твор трэба ўспрымаць такім, які ён ёсць. Гаворка не аб тым, што мог напісаць М. Аляксееў і чаго не напісаў. Важна, што ў рамане ёсць. А ёсць у ім адчуванне часу. Часу, у якім жыў пісьменнік, і часу, у якім жылі яго героі.

Наступныя раманы М. Аляксеева "Испытание" і "По зову сердца" (яны неаднаразова перавыдаваліся) сюжэтна звязаны з першым. Ёсць падставы гаварыць аб трылогіі, назва для якой просіцца "По зову сердца". Якаў Жалязноў у рамане "Испытание" як камандзір дывізіі ваюе з фашызмам у першыя дні вайны, трэці раман — іншыя старонкі

ўсеагульнага змагання з фашызмам, як на фронце, так і ў тыле. М. Аляксееву ўдалося спасцігнуць сам дух народны, раскрыць лепшыя якасці савецкіх людзей, якія дзеля разгрому гітлераўцаў, у імя перамогі не шкадавалі сваіх жыццяў. Так, гэта была самаахвярнасць. Але гэта і вынік выхавання — таго выхавання, якому спрыялі і раманы М. Аляксеева.

Ды і іншыя творы пісьменніка — "аповесці "Вот так-то, Николай!", "Сухарь", "Осколком оборванная жизнь", дакументальная кніга "Навстречу Победе" (разам з Н. Крыловым і І. Драганам) — нясуць у сабе важкі выхаваўчы патэнцыял. М. Аляксееў пісаў аб тым, што зведаў сам, і аб тым, што перажыло яго пакаленне. Ён жыў і тварыў у сваім часе. Правільна сказаць, што, як пісьменнік, і застаўся ў гэтым часе. А наколькі гэта добра ці кепска, думаецца, адназначнага адказу быць не можа. Гледзячы — як да ўсяго ставіцца. Калі адмаўляць усё, што было раней, станавіцца ў позу суддзі, які мяркуе, што толькі адзін ён разважае правільна, ацэнка напісанага М. Аляксеевым будзе адпаведная. Аўтар жа гэтых радкоў прытрымліваецца іншай думкі. Любы твор трэба разглядаць у кантэксце таго часу, калі ён пісаўся. І тут трэба сказаць адназначна: напісанае М. Аляксеевым варта ўдзячнай чытацкай памяці.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**
*Фота Ул. КРУКА*

**Калектыў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа выказвае глыбокае спачуванне старшаму навуковаму супрацоўніку музея Івану Сцяпанавічу КУРБЕКУ з прычыны яго вялікага гора — смерці сястры Вольгі.**

# След тваіх родных

## СТАРОНКІ З БЛАКНОТА

***Калі сняжок накрыў галаву, міжволі азіраешся назад, на пройдзеную жыццёвую дарогу, прыгадваюцца значныя і малазначныя выпадкі жыцця, якія мелі нейкае дачыненне да твайго лёсу.***

***Некаторымі назіраннямі, відаць, другараднымі, якія захавала запісная кніжка, хочацца падзяліцца з чытачамі.***

**АЎТАР**

Прачытаў шмат класікаў, замежных і нашых. Цікаўлюся і сучаснымі аўтарамі. Не прэтэндую на аб'ектыўнасць, але думка не адстае: склаліся толькі тры ацэнкі літаратуры:

а) літаратура высокай чалавечай годнасці, якая будзе вечна служыць людзям;

б) літаратура, якая апявае, умацоўвае кіруючыя колы, іх лад, іх дзейнасць; яна тымчасовая;

в) літаратура забаўляльная, дэтэктывы, фантастыка; яна пустацвет, нічога не дае чалавецтву.

Я не называю аўтараў. Гэта справа чытача.

Па справе зайшоў у рэдакцыю адной газеты. Мне параілі, у які пакой зайсці. Мілавідная супрацоўніца неяк незвычайна гутарыла. Узяла мае запісы, і я пайшоў.

Ужо дома вобраз той дзяўчыны не адставаў: сярэдняга росту, стройная, прыгожая, ласкавая, ветлівая, нібы майскі ранак пасля дажджу.

Тут жа ўзнікла і іншая думка: "Як жа ёй жыць у наш вірлівы час? Як пераадолець вецер і навальніцы нашых дзён? Яна прыйшла ў жыццё да часу. А магчыма, з яе і пачынаецца новая эпоха чалавецтва. Так хочацца верыць".

Даводзілася падоўгу жыць удалечыні ад Беларусі. І як бы там ні было матэрыяльна добра, мяне адольваў сум па Радзіме.

Як тады, так і цяпер узнікае пытанне: чаму? Што нараджае сум? Дакладна адказаць не здолею. Узнікаюць наступныя адказы:

— Магчыма, сум па маладосці, хаця і цяжкай матэрыяльна?

— Магчыма, цудоўныя ранкі над Нёманам, яго імклівая срабрыстая плынь і сумныя вербы на беразе, што кідаюць цень на ваду;

— Магчыма, песні шпакоў на яблыні ля шпакоўні, ці салаўя на могілках, жаўрука над полем;

— Магчыма, клапатлівыя крокі бацькі і маці ў хаце і ў двары, іх галасы на мілагучнай роднай мове;

— Магчыма, шмат кветак у гародчыку ля хаты, што любіла гадаваць маці;

— Магчыма, зімовыя нядзелькі, калі бацька пасля снедання браў з куфра кніжку і гадзіну-дзве чытаў нам апавяданні, калі па-руску, а часцей на роднай мове...

Не ведаю, як каму, а мне цяжка было жыць удалечыні ад роднай зямлі, свайго сонца і ветру, подыху полёў і ўсмешкі кветак, не чуць роднай мовы, не бачыць магіл тых, хто даў мне жыццё.

Надзвычай люблю народную музыку і песні. На жаль, часам у эфір прабіраюцца "дыверсанты" каб знішчыць нашае багацце. Адны з іх — група "Гай". У гэтым пераканаўся, калі паслухаў у іх выкананні песню на словы Янкі Купалы "А зязюля кукавала". Гэта штосьці надзвычай непрыемнае. Ёсць ужо цудоўная мелодыя на гэтыя словы, якая стала народнаю.

Варожы крок зроблены і іншымі "дыверсантамі" па знішчэнню "Рэчанькі", "Касіў Ясь канюшыну" і шмат шэдэўраў народнай песні.

Не разумею, што думаюць у Міністэрстве культуры, калі даюць магчымасць такім гастралёрам знішчаць нашае багацце, спасылаючыся на т. зв. новую інтэрпрэтацыю.

З болем перажываю тактычныя няўдачы нашага БНФ. З пачаткам сваёй дзейнасці, паставіўшы вялікую чалавечую мэту — "Адраджэнне", ён меў сапраўдны поспех. Аб ім гаварылі, яго падтрымлівалі. Чаму потым гэты поспех пайшоў на спад? Спасылаюцца на дзейнасць афіцыйных органаў. Ёсць іх шкода. Але не гэта галоўнае.

Мае погляды (упэўнены, не толькі мае) на яго дзейнасць змяніліся, як паслухаў выступленне ў антракце з'езда БНФ барда Андрэя Мельнікава. У яго песні ёсць словы: "Мы адрадзім маёнткі і фальваркі..."

У гэты гістарычны час у тактыцы БНФ гэта будзе злачынствам — ставіць пытанне адраджаць панаванне памешчыкаў. Прызнаючы станоўчую ролю некаторых з іх у развіцці навукі і культуры, у цэлым гэта эксплуатацыйны клас, які шмат бедаў, поту і крыві рабіў вякамі працоўнаму сялянству. Аб гэтым сведчаць не толькі ўспаміны дзядуль, а і шматлікая літаратура, як наша, так і замежная.

Дарэчы, гэта не адзіная тактычная памылка кіраўніцтва БНФ.

У маёй свядомасці, як удзельніка мінулай вайны, моцна трымаецца назіранне, што на акупаванай Беларусі, змагаючыся з ворагам, асабліва ў партызанскіх зонах, людзі былі аб'яднаны, імкнуліся дапамагаць адзін аднаму ў ліхую гадзіну. Такая ж салідарнасць была і пасля вайны: дапамагалі ўдовам і сіротам, панавала спагадлівасць, разуменне іншых. У модзе была "Талака".

Потым, дзесьці з сямідзесятых, калі жыццё меншбольш наладзілася, гэтае ўзаемаразуменне было разбурана. Раз'яднанасць умацоўваецца і сёння. Усе жывуць па лозунгу: "Кожны сам сабе пан", або "Калі хочаш жыць, умей круціцца".

"Ці надоўга гэта?" — думаю. "Усё адмоўнае не вечнае", — перакананы.

Некалькі дзён па справах быў у горадзе, у палоне яго гарачыні, дыму, натоўпу і бегатні людзей.

Вярнуўся ў вёску і, відаць, выпадкова тут панаваў рай, зямны рай.

Яго я адчуў, як выйшаў з аўтобуса: з-за лесу мяне вітала бліскавіца і папераджальны голас спрадвечнага грому. Час ад часу страляў пярун. Ад яго рухалася страшыдла: цёмна-цямнюсенькая хмара. Яна накрыла палі, вёску, агароды і раптам сыпануў асвяжальны лівень. Ад яго пабеглі па дарозе ручаіны. Праз некалькі хвілін выглянула сонца і на адыходзячай хмары дугою ахапіла неба шматколерная вясёлка. З-за Нёмана наплываў подых гаючага паветра. Дрэвы выглядалі па-святочнаму.

"Усім бы гараджанам хоць гадзіну пабыць у гэтым раі", — падумаў.

З навагоднім прывітаннем прыехала дачка з усімі сваімі: сынам і маленькаю дачушкаю, якой толькі дзесяць месяцаў.

На маю просьбу: "Ручкі-ручкі" адразу пайшла да мяне і, наблізіўшы тварык, пачала настойліва штосьці гаварыць. Слоў не вымаўляла, і даведацца, што яна казала, я не здолеў.

Вось і прыемная, хаця і незразумелая загадка, што яна казала, бо дагэтуль нікому нічога не гаварыла.

Старанна ўскапаў і падрыхтаваў градку пад кветкі. "Заўтра пасею", — вырашыў.

Надвячоркам адведаць мяне прыехала дачка з мужам і дзецьмі.

Ранічкаю выйшаў на гарод і бачу: на маёй градцы маленькія слядочкі ўнучкі. Нібы электрычны ток прабег па целе і прыемная радасць авалодала мною. "Няма нічога прыемней, чым у тваім двары след тваіх родных. Гэта нават больш, чым кветкі на гэтай градцы". Упэўнены.

Не адзін год назіраю за з'яваю на сваім кветніку: адны кветкі буяюць, красуюць, іншыя марнеюць і гінуць. Чаму? — задаю сабе пытанне. І прыйшоў да высновы: "Кветкі не любяць тых суседзяў, якія імкнуцца вызначыцца, паказацца лепшымі. Відаць, патрэбна гармонія, узаемаразуменне".

Да гэтай думкі я прыйшоў, калі некалькі год па суседстве садзіў белыя і чырвоныя гладыёлусы. Адны з іх марнелі, а потым цалкам гінулі. "Незразумелая загадка прыроды", — думаў.

**Яўген КРАМКО**

ПОШТА

# Покліч айчынных святынь?

У нядзелю, 22 лістапада 1998 года Праваслаўная царква ўшаноўвала ікону Божае маці "Скорапаслушніца". Адна прыхаджанка, па ладу жыцця свайго манахіня ў міру, хоць і без манастырскага пострыгу, правяла гэты нядзельны дзень у трох розных храмах Мінска, прысутнічаючы вечарам на акафісце Божай Маці ў Свята-Духавым саборы.

Акафіст служылі побач з мошчамі Сафіі Слуцкай. Уладкаваўшыся непадалёку, насупраць іконы Божае Маці "Аршанская", раба Божая для большай засяроджанасці ў малітве, нейкі час стаяла з заплюшчанымі вачамі размяшчаючы слыхам у сэрцы сваім словы да Маці Нябеснай, якімі звонка, залівіста запаўнялі прастору храма харысты. Было шумна, душа прасіла прыглушаных гукаў. Падумала: "Начальника тишины родшая" вымаўляем у малітве, а самі ўсе шумім, спустошваемся, не дапусці, Госпадзі, ператварыць храмы ў балаганы... Шкада, што галоўнай храмавай іконе "Мінскай" да гэтага часу не склалі акафіста... Дзякуй Богу, Святой Праведнай Сафіі Слуцкай ужо ёсць, і ў славу Божую на беларускай мове, толькі ці будуць карыстацца? Уціск усяго беларускага ў Праваслаўнай царкве працягваецца... Госпадзі, абарані нас, гаротных беларусаў, памяняй сітуацыю... надзялі памяццю светлай, годнай, без фальсіфікацыі гісторыі, без духоўнага і патрыятычнага ўрону..."

Схамянулася, гонячы прэч непатрэбныя ў час малітвы думкі: "Што ж гэта я, грахаводніца, парушаю цэласнасць малітвы, судзіць спрабую, акаянная... Даруй, Госпадзі, дапамажы, Маці Божая, нам не выцурвацца ўсяго айчыннага, пачынаючы з гэтага галоўнага храма рэспублікі..."

Узняла вочы, паглядзела на Аршанскую ікону Божае Маці і застыла ад нечаканасці: замест яснага вытанчанага твару Божае Маці паўставаў амаль на ўсю раму журботны, цёмнай танальнасці твар, скрываючы аблічча Чароўнага Боскага сына.

Кінулася на коленцы — знізу ікона была, як заўсёды. Паднялася — відовішча зноў паўтарылася. Што ж гэта ўсё значыць? Так паўтаралася некалькі разоў.

"Гора, гора мне, грэшнай. Маці Святая, ці не заклікаеш ты мяне, нявартую, да пакаяння, дапамагаеш паўней усвядоміць маю хрысціянскую недасканаласць? Даруй, я нават не ведаю, калі дзень ушанавання гэтай іконы і акафіст ёй складзены і прачытаны, стоячы на коленцах усім без выключэння, але да гэтага трэба многа папрацаваць у архівах, звярнуцца да падзей Аршанскай бітвы, не грэбаваць звесткамі пры апытанні старажылаў, прасіць аб дапамозе зарубежную дыяспару...

Госпадзі, няхай будзе воля Твая.

**Ларыса РАБЦЭВІЧ-БРАНАВІЦКАЯ**

*г. Мінск*

Марцін КОЎЗКІ

# Доля праўды

Расказваў сусед, што на поўдні Францыі пазнаў земляка па роднай трасянцы. Трасянку — як аснову асноў — віталі лідэры бальшавізму; беларусы, лічыў Хрушчоў, бліжэй за іншых да "камунізму". Мільгануў камунізм, што тая маланка, а нам засталася трасянка.

●

З насцярогаю ставіўся да ўсяго, што на "анты", ды на бульбяных гонях пабываў з тыдзень, добра дожджык нас намачыў, злыдзень, і зразумеў я, што не праклён, а збавенне гэта грознае паведамленне: "на краіну насоўваецца антыцыклон".

●

Інтэрв'ю з намеснікам старшыні секцыі. — Працягваць яшчэ псаваць паперу, калі я і так зрабіў кар'еру? А чаму б не разгледзець другую праекцыю: я — старшыня секцыі? Калі вакол свае прысады, іншыя мрояцца далягляды: год — паўтара, і я — намеснік сакратара. А далей? Нідзе не бачыў такой бездапаможнасці, як у творчых людзей!

●

Пад акном суседзі б'юць у даміно. Кажуць, гэта лепш, чым піць віно. Дык жа той, хто прайграе, бяжыць за "мацаваным", а тады кідаюць "неліквіды" пад акно. Прайграюць, відаць, ужо даўно.


ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЛіМ ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

**Саюз беларускіх пісьменнікаў; рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва"**

**ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА**

**Галоўны рэдактар Уладзімір НЯКЛЯЕЎ**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:**

**Святлана БЕРАСЦЕНЬ,**

**Мікола ГІЛЬ** — *намеснік галоўнага рэдактара*

**Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ,**

**Жана ЛАШКЕВІЧ,**

**Алесь МАРЦІНОВІЧ,**

**Барыс ПЯТРОВІЧ** — *першы намеснік галоўнага рэдактара,*

**Віктар ШНІП** — *адказны сакратар*

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**

**220005, Мінск, вул. Захарава, 19**

**ТЭЛЕФОНЫ:**

прыёмная рэдакцыі — 2848-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 2848-525, 2847-985

**АДДЗЕЛЫ:**

публіцыстыкі — 2848-204
пісьмаў і грамадскай думкі — 2847-985
літаратурнага жыцця — 2848-462
крытыкі і бібліяграфіі — 2847-985
паэзіі і прозы — 2848-204
музыкі — 2848-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 2848-153
выяўленчага мастацтва, аховы помнікаў — 2848-462
навін — 2848-462
мастацкага афармлення — 2848-204
фота-карэспандэнт — 2848-462
бухгалтэрыя — 2366-071

*Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".*

*Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.*

*Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.*

**Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"**

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856.
Наклад 4009
Нумар падпісаны ў друк 17.12.1998 г. у 17.30.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 999

Заказ 7277/Г

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12